Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 САКАВІКА 2019 г. СЕРАДА

№ 57 (28924)

СЕМ ДЗЁН М.@RT.КАНТАКТУ-2019 5

ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЕ МУЗЕЙ ХЛЕБА НА ЧАЧЭРШЧЫНЕ 12

ЗМЯНЯЦЬ СІТУАЦЫЮ НЕАБХОДНА

У другі дзень камандзіроўкі на Магілёўшчыну Прэзідэнт наведаў малочнатаварны комплекс «Сліжы» ААТ «Амкадор-Шклоў».

Забягаючы наперад, адзначым, што ў выніку кіраўнік дзяржавы даручыў правесці поўную праверку прадпрыемства. За тым, што прыляло да такога рашэння, прасачыў наш карэспандэнт.

З думкай пра чалавека

...Падчас сваёй рабочай паездкі Прэзідэнт адправіўся ў аграхолдынг «Купалаўскае». Нагадаем, даручэнне аб яго стварэнні было дадзена яшчэ ў 2016 годзе падчас камандзіроўкі беларускага лідара ў рэгіён, а ў лістападзе 2017-га холдынг быў афіцыйна зарэгістраваны. У яго склад увахо дзяць ТАА «Купалаўскае» — кіруючая кампанія холдынга», ЗАТ «Вялікія Славені», ААТ «Амкадор-Шклоў» і ААТ «Новагарадзішчанскае».

Папярэдні візіт Аляксандра Лукашэнкі ў холдынг прыйшоўся на чэрвень мінулага года. Тады ён адзначыў, што гэта сур'ёзны праект дзяржаўнага маштабу, аднак работы ідуць бессістэмна і павольна.

Наведваючы малочнатаварны комплекс «Сліжы» ААТ «Амкадор-Шклоў», які ўваходзіць у склад холдынга, кіраўнік дзяржавы заявіў, што стратныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы трэба вывесці на рэнтабельнасць. Паводле слоў Прэзідэнта, у сродках масавай інфармацыі, асабліва ў расійскіх, паездкі беларускага лідара па сельгасарганізацыях тлумачаць адсутнасцю вынікаў і неабходнасцю новых рашэнняў.

Беларускі лідар заўважыў, што без стратных гаспадарак Беларусь можа жыць і працаваць, таму што частка мадэрнізаванай сельскай гаспадаркі цалкам забяспечвае спажыванне малака ўнутры краіны і экспарт. «Але там жа жывуць нашы людзі, там жа ёсць зямля, якую трэба апрацоўваць. Таму мы не кідаем гэтыя гаспадаркі, вёскі і людзей, а падымаем іх», — адзначыў ён.

Чарговы раз Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: галоўнае — гэта людзі, іх нельга пакінуць па-за ўвагай. Трэба на ўсіх землях, якія знаходзяцца ў севазвароце, стварыць нармальную вытворчасць, а таксама не забываць аб рэалізацыі новых кірункаў, займацца імпартазамяшчэннем.

Гаварылі пра малочную галіну, а таксама будаўніцтва малочнатаварных комплексаў. Асобна абмеркавалі і жывёлагадоўлю, у прыватнасці, рэканструкцыю жывёлагадоўчых аб'ектаў і свінагадоўчую галіну. Прэзідэнт падкрэсліў: праз два месяцы павінна быць поўная яснасць са свінагадоўляй. У «Купалаўскім» трэба выйсці на канчатковую прадукцыю і гандаль гэтай прадукцыяй — такая была задума, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама беларускі лідар растлумачыў, чаму Шклоўскім раёнам займаюцца асабліва старанна. «Таму што я ведаю тут кожную гаспадарку. Таму мы спакойна на працягу, напэўна, 10—12 гадоў прыводзім у парадак Шклоўскі раён, але не толькі яго», — сказаў Прэзідэнт.

Што да самога холдынга, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў яго склад просяцца і іншыя арганізацыі, аднак спяшацца не варта, трэба выбудаваць тое, што ёсць, і паглядзець, што з гэтага атрымаецца.

Дарэчы

Па тэмпах развіцця эканомікі за 2018 год Магілёўская вобласць заняла апошняе месца, па выніках першых двух месяцаў 2019 — перадапошняе. Апошняе месца вобласць у 2018-м заняла і па прамысловай вытворчасці, сельскай гаспадарцы, перадапошняе — па экспарце. У 2019-м па асобных паказчыках сітуацыя стала трохі паляпшацца, аднак па той жа сельскай гаспадарцы па выніках студзеня і лютага 2019 года вобласць усё яшчэ на апошнім месцы.

Парадкам і не пахне

Пасля даклада аб выніках работы холдынга і яго перспектывах кіраўніку дзяржавы паказалі тэрыторыю комплексу. Сітуацыя неприемна здзівіла Прэзідэнта — убачыўшы каровінкі, ён абурыўся ўмовамі ўтрымання жывёлы, а таксама поўнай бязладзіцай у вытворчых памяшканнях. СТАР. 2

УЗОРЫ ВЯСНОВАГА ПОЛЯ

Фота Belta.

Сяўба ў Ваўкавыскім раёне.

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван ВЕЖНАВЕЦ, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Калі гаварыць пра тое, якія карэкціроўкі магчымыя ў дзеючым антыманапольным заканадаўстве, то ў першую чаргу трэба сказаць пра папярэджанне. Мы ўбачылі, што гэтыя механізмы сапраўды працуюць, яны дазваляюць дабіцца таго выніку, на які націлены. Сёння папярэджанні ахопліваюць вузкае кола складаў — гэта антыканкурэнтныя дзеянні дзяржаўных органаў і шэраг артыкулаў па злоўжыванні дамінуючым становішчам. Мы ж мяркуем, што такія механізмы папярэджання можна распаўсюджваць, у прыватнасці, і на нядобрасумленную канкурэнцыю. Яшчэ адзін момант — гэта вызваленне ад адказнасці суб'ектаў, якія добраахвотна паведамілі аб парушэнні і ўхілілі яго, тым самым аднавіўшы канкурэнцыю».

Спецыяльны рэпартаж

«У ВЯСНУШКАХ ВЯСНА СОК БЯРОЗАВЫ П'Е»

Лясгасы Брэстчыны працягваюць нарыхтоўку гаючага напою

Бярозавы капеж становіцца першым сапраўдным званочкам прыроды аб тым, што наступіла вясна. Яшчэ ні травінкі, ні першай кветачкі на лясной глебе, а дрэвы ўжо прачнуліся ад зімовага сну, сок спяшаецца напаіць галіны і будучыя лісточкі, якія вельмі хутка распусцяцца. Сёлета зіма на Брэстчыне не вызначылася ні снегам, ні марозам, не напаіла як след зямлю вільгаццю, адзначаюць спецыялісты. Таму бярозы не надта многа соку змогуць аддаць.

На лясной дзялянцы Вулькаўскага лясніцтва Лунінецкага раёна шчыруе брыгада нарыхтоўшчыкаў. Мужчыны хутка зліваюць сок, які накапаў у мяхі за ноч. Анатоль Богдан тут за брыгадзіра. Анатоль Міхайлавіч і яго таварышы прыходзяць вясной у лясніцтва ў якасці сезонных работнікаў. Так і цяпер, наняліся на працу тыдзень таму, за дзень звычайна збіраюць да шасці тон бярозавіку.

Валерый ГРУШЭЎСКІ, ляснічы Вулькаўскага лясніцтва, гаворыць, што нарыхтоўваць сок выгадна. Гэта добры даход у бюджэт арганізацыі. А для насельніцтва ёсць магчымасць купіць карысны напой. Для гэтага можна выпісаць і аплаціць патрэбную колькасць літраў у лясніцтве, затым прыехаць на дзялянку, і спажыўцу сок нальюць проста з-пад бярозы. СТАР. 3

Нерухомасць

ЧАС ПАКУПНІКА

Кошт загараднага доміка шмат у чым залежыць ад таго, колькі канкрэтны кліент гатовы заплаціць за яго

На працягу апошніх дзесяці гадоў колькасць прапанаваных на продаж загарадных аб'ектаў у мінскім рэгіёне (да 40 кіламетраў ад МКАД) штогод павялічваецца ў сярэднім на 18 %. Не стаў выключэннем і мінулы год, на працягу якога пікавае значэнне выстаўленых на продаж загарадных дач, дамоў і ўчасткаў павялічылася на 15 %. Летась было зафіксавана на рэкордным узроўні прапанаванне — практычна сем тысяч асобных будынкаў. Як у дадзеных умовах будуць змяняцца цэны, а таксама якіх чакаць тэндэнцый і перспектыў на рынку загараднай нерухомасці?

Многае залежыць ад курса валюты

Найбольшы прырост выстаўленых на продаж загарадных аб'ектаў быў адзначаны ў 2015 годзе — плюс 30 %. Шмат у чым гэта было абумоўлена рэзкім скачком абменнага курса долара ў пачатку года і працяглым яго ростам у наступныя месяцы. Згодна з існуючай практыкай, кошт нерухомасці ўсталёўваецца прадаўцамі ў цвёрдай валюце. А ў сітуацыі росту абменнага курса долара ўсе аб'екты нерухомасці аўтаматычна растуць у цане — пакупкі пакупнікі атрымліваюць даходы ў беларускіх рублях. І таму рынак у гэты перыяд завісае, бо прадаўцы не хочуць знімаць цану, а пакупнікі не жадаюць (ці нават ужо не могуць) набываць нерухомасць па новых цэнах.

Як паказвае практыка, падобны стан застою рынку, напрыклад на другасным рынку жылля, захоўваецца яшчэ на працягу чатырох-шасці месяцаў пасля курсавых скачкоў. А потым паступова пачынаецца, з аднаго боку, працэс зніжэння коштаў прадаўцамі, а з другога боку, пакупнікі вымушаныя вырашаць свае жыллёвае пытанне ў фармаце «тут і цяпер» і таму адшукваюць сродкі на куплю на новых цэнах у нацыянальнай валюце.

Час мінімальных бюджэтаў

Але гэта тое, што датычыцца кватэр. Такога тавару, які мае першараднае значэнне ў жыцці кожнага чалавека. А загараднае нерухомасць — у большасці выпадкаў выступае факультатыўным прадуктам — свайго роду раскошай для многіх. СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пентагон выдзеліў Трампу сродкі на будаўніцтва сцяны

Выконваючы абавязкі кіраўніка Пентагона Патрык Шанахан адобрыў выкарыстанне мільярда долараў для будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным сайце ведамства. Як адзначаюць СМІ, гэта першы мільярд долараў, выдзелены Дональду Трампу на ўзвядзенне сцяны. У адміністрацыі прэзідэнта мяркуюць, што сцяна дапаможа спыніць нелегальную імігрэцыю і кантрабанду наркотыкаў. Яе пачалі будаваць яшчэ пры Біле Клінтане, а працягнулі пасля 2006 года. На сённяшні дзень узведзена ўжо 1078 кіламетраў збудаванняў. Трамп хоча пабудаваць яшчэ 1600 кіламетраў. У сярэдзіне лютага прэзідэнт ЗША абвясціў рэжым надзвычайнага становішча на мяжы. Такім чынам ён можа атрымаць больш за шэсць мільярдаў долараў і абысціся без адабрэння Кангрэса, неабходнага па Канстытуцыі. Гэты крок ужо аспрэчылі ў судах.

У Еўропе імкнуцца стварыць легальную наркаэканоміку, заявілі ў МУС Расіі

Краіны Еўропы прапрацоўваюць пытанні для фарміравання легальнай наркаэканомікі, заявіў статс-сакратар — намеснік міністра ўнутраных спраў РФ Ігар Зубаў. «Адзначаецца ўзмацненне пазіцый наркалібералаў і міжнародных арганізацый. Па сутнасці, мы можам казаць пра спробы шэрагу заходніх краін, перш за ўсё еўрапейскіх, часткова іх падтрымліваюць ЗША, стварыць прававыя перадумовы або прадэманстраваць пытанне стварэння прававых перадумоў і міжнародных прынцыпаў для фарміравання легальнай наркаэканомікі», — заявіў Ігар Зубаў на нарадзе ў Савеце Федэрацыі. Таксама ён паведаміў, што аб'ём легальнай вытворчасці канабісу ў свеце дасягнуў 40 мільярдаў долараў. «Гэта высокадаходная галіна эканомікі. Нашы заходнія партнёры глядзяць, як больш яе легалізаваць», — заўважыў Ігар Зубаў. Ён лічыць, што на гэтым фоне маштабнасць і небяспека нарказлачыннасці значна ўзраслі.

«Найлепшы настаўнік у свеце» расказаў, як патрапіць прэмію ў мільён долараў

Манах-францысканец з Кеніі Пітэр Табічы, які атрымаў прэмію ў мільён долараў за выдатны ўклад у прафесію настаўніка, збіраецца выдаткаваць гэтыя грошы на абсталяванне для школы і дапамогу мясцовым жыхарам. «Я б хацеў мець сучасную школьную лабараторыю і ажыццяўляць праекты, якія дапамагалі б мясцовым жыхарам. Такія рэчы, як вырошчванне ежы побач з домам і засухаўстойлівыя расліны, каб справіцца з праблемай харчовай бяспекі. Там, адкуль я родам, шмат беднасці і мала ежы», — расказаў кенійскі настаўнік у інтэрв'ю выданню The National. Табічы выкладае прыродазнаўчыя навукі ў вясковай школе ў Кеніі. Як паведамілі ў аргкамітэце прэміі, у навучальнай установе толькі адзін камп'ютар, а на аднаго педагога прыходзіцца 58 вучняў. На словах самога настаўніка, раней ён працаваў у прэстыжнай прыватнай школе, але затым вырашыў навучаць дзяцей з бедных сем'яў. Сем гадоў таму Табічы стаў манахам францысканскага ордэна і пачаў аддаваць 80 працэнтаў свайго заробку на дапамогу сем'ям, якія жывуць у нястачы.

КАРОТКА

- «Белкамунмаш» да канца мая паставіць Мінску больш за 30 электробусаў новага пакалення.
- **Юрысты ФПБ 28 сакавіка акажуць бясплатную юрыдычную дапамогу.**
- Еўрапарламент ухваліў адмову ад пераходу на летні час з 2021 года. Кожнай з 28 еўрапейскіх дзяржаў даецца магчымасць самастойна вырашыць, будзе яна пастаянна прытрымлівацца летняга або зімовага часу.
- **Будынак тэатра імя М. Горкага ў Мінску закрыюць на капітальны рамонт.**

- Беларуска-польскі эканамічны форум «Добрасуседства» пройдзе ў Мінску 5 чэрвеня.

Культура і людзі

Пакінуць нельга ратаваць

Якая будучыня ў архітэктурнай спадчыны Мсціслава?

Па задумцы малады Пётр Мсціславец паказвае на Маскву, у рэальнасці ж быццам заклікае: «Паглядзіце, што нарабілася. Не праходзьце міма!»

«Няма грошай» — самая частая фраза, якую давялося чуць пры падрыхтоўцы гэтага матэрыялу. Аднак ці толькі ў сродках справа, калі гаворка ідзе пра гісторыка-культурныя помнікі, якіх засталіся адзінкі не толькі ў нашай краіне, але і па ўсёй Еўропе?

Дыямент і перліны

Уладзімір Караткевіч назваў Мсціслаў «дыяментавым горадам» толькі таму, што трапіў сюды сонечным ранкам пасля неверагоднай студзеньскай завірухі. «І ўсе будынкі, увесь горад гараў, іскрыўся, пераліваўся дзівосным колерам, нібы чысцейшай вады дыямент», — пісаў ён у 1982 годзе. Мне пашчасціла не менш, чым пісьменніку, хоць і паехала я ў старажытнае мястэчка вясной. У гэты час у Мінску зняла сонейка і высыхалі апошнія лужыны. Шэсць гадзін у цягніку на ўсход краіны, і — мястыка! — снег у вочы, снег пад нагамі, снег паўсюль. Вось табе і «дыямент зямлі беларускай». Прайду, бляск яго за апошні час крыху пацямнеў у святле навін пра разбурэнне касцёла Святога Архангела Міхаіла з 270-гадовай гісторыяй (вядомага як езуіцкі), што знаходзіцца ў цэнтры горада.

Цікава, што і Караткевіч у сваім эсэ пра Мсціслаў быў занепакоены станам «архітэктурнай перліны» Магілёўшчыны. Ён здзіўляўся, чаму касцёл не пастаўлены пад ахову дзяржавы, «хаця будынак здаровы і ў ім яшчэ зусім нядаўна быў Дом культуры. Прыкласці б крыху сродкаў і рук і аднавіць яго, не пакідаць сярод горада здаровых муроў, асуджаных на руйнаванне (колькі ж гэта іх па Беларусі!)». Не згадзішся з пісьменнікам нельга, асабліва ў наш час, калі нават ахова дзяржавы не зберагла ўнікальны ўзор віленскага барока. СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 19057

ЗМЯНЯЦЬ СІТУАЦЫЮ НЕАБХОДНА ЦЯПЕР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Калі чалавек не разумее, што гэта Асвенцім, а вы яго ставіце кіраўніком холдынга («Купалаўскае». — ***«Зв.»***), я вас наогул не разумею», — сказаў ён.

Склалася ўражанне, што комплекс існуе ледзь не дзесяць гадоў, хоць яму літаральна два гады. «Тут ніколі ніхто не прыбірае па-чалавечы», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ на вочы беларускаму лідару трапіўся зламаны дзвярны вушак, у адным з памяшканняў не працавалі вентылятар... А гэта — элементарны парадак.

Змена маршруту — гэта ўжо традыцыйная асаблівасць рабочых паездак кіраўніка дзяржавы. Далей Прэзідэнт запатрабаваў паглядзець іншыя базы гаспадаркі, таму было прынята рашэнне адправіцца ў мясцовы мехдвор.

Уражанні ад гэтага месца ў кіраўніка дзяржавы таксама нярадасныя. Напрыклад, там стаялі непрацуючыя пагрузчыкі — адзін з іх прастойваў без рамонту чатыры месяцы. Чаму? Адказу не было.

Пасля перад вачыма паўсталі спісаныя ва ўтыль камбайны, іржавыя непрацуючыя машыны, іншыя прыстасаванні... Відавочна, да тэхнікі на прадпрыемстве ставяцца неахайна. Высветлілася, што тэрыторыя захламленая металаломам і старымі запчасткамі, хапае гэтага і ў ангарах. Цікава, што некаторая тэхніка была набыта ня так даўно — проста яе не выкарыстоўвалі, таму яна зараз і не функцыянуе. Хоць здавалася б: да прыезду рыхтаваліся, усе тэрыторыі правяралі загадзя.

«Вакол могілкі, што на вуліцы, што пад дахам», — так ахарактарызаваў мехдвор Аляксандр Лукашэнка.

У выніку кіраўнік дзяржавы зрабіў істотныя кадравыя змены. Ён даў рэзкае даручэнне: зняць з пасад усіх, хто вінаваты ў такіх умовах гаспадарання і стане выторчай дысцыпліны ў агрохолдынгу «Купалаўскае». Акрамя таго, ён запатрабаваў распачаць крымінальныя справы пры наяўнасці складу злачынства. Беларускі лідар таксама запатрабаваў, каб яму на стол паклалі спіс з імёнамі ўсіх, хто супраўджаў яго падчас гэтага візіту, бо «акрамя губернатара і іншых тут яшчэ былі канкрэтныя людзі, якія павінны былі за гэта адказваць».

Такім чынам, канкрэтныя кадравыя змены наступныя: памочнік Прэзідэнта па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў стаў выконваючым абавязкі старшыні Шклоўскага райвыканкама, тады як старшыня райвыканкама Васіль Віцюноў прызначаны кіраўніком агрохолдынга «Купалаўскае». Першы намеснік губернатара Магілёўскай вобласці Мікалай Кароцін будзе выконваць абавязкі губернатара, бо старшыня аблвыканкама Уладзімір Данаеўскі пасады пазбавіўся.

Што датычыцца астатніх службовых асоб, у найбліжэйшы час Адміністрацыя Прэзідэнта ўнясе па іх прапановы.

Новаму кіраўніку холдынга Прэзідэнт назваў тэрмін для навядзення парадку. «Праз два месяцы я прайду ўсе гэтыя гаспадаркі», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
Магілёўская вобласць, Шклоўскі раён.

Блізкая ўлада

АКЦЭНТ НА ЯКАСЦЬ

На месцах неабходна больш увагі надаваць утрыманню і эксплуатацыі вуліц і дарог

Такі акцэнт зрабіў старшыня Брасцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС падчас прамой тэлефоннай лініі, якая прайшла ў фармаце відэаканферэнцыі з гар-, райвыканкамамі.

«Утрыманню і эксплуатацыі вуліц і дарог — асаблівая ўвага. Гэтай тэмы датычыцца значная колькасць звароташ. Перш за ўсё, як і патрабуе Прэзідэнт, неабходна рабіць акцэнт не на колькасць выкананых работ, а на якасць рамонту, каб захоўваліся тэхналогіі. Пытанне сур'ёзнае, трэба ім займацца», — падкрэсліў Анатоль Ліс.

Сваю заклапочанасць станам дарог выказалі жыхары Брэста, Пружанскага, Баразоўскага, Брэсцкага раёнаў, паведамляе БелТА. У прыватнасці, жыхары абласнога цэнтра ідэкліся, які аб'ём рамонтных работ запланаваны на гэты год.

«Кобрынскі пуцеправод рэканструюецца з інфраструктурай вакол яго, будуецца Заходні абход з развязкамі. Вялікія аб'ёмы робяцца да тысячагоддзя, але гэтым мы не абмяжоўваемся. Работа будзе працягвацца. Па меры магчымасцяў будзем вуліцы рамантаваць, асфальтаваць», — адзначыў губернатар. Старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук дадаў, што сёлета заасфальтуюць 12 асноўных вуліц працягласцю каля 15 кіламетраў.

«Што датычыцца грунтавых дарог, летась перавялі сем вуліц у разрад асфальтабетоннага пакрыцця. Будзем работу працягваць, у тым ліку з удзелам грамадзян. Мы гатовы зрабіць так: бяром на сябе ўсе выдаткі, тэхналогіі, выкананне работ, а жыхары ўдзельнічаюць у нейкай долі пры набыцці асфальтабетону», — сказаў мэр.

Падчас прамой лініі берасцейцы праявілі асаблівую актыўнасць: з 29 званкоў палова паступіла ад жыхароў абласнога цэнтра. Прычым большасць грамадзян агучвалі пытанні не асабістага характару, а значныя для ўсяго горада. Адна з тых, хто патэлефанаваў, агучыла наступную праблему: у дварах яе дома ёсць абсталяваная пляцоўка з кантэйнерамі для раздзельнага збору цвёрдых камунальных адходаў, аднак жыхарам супраць заварвання смеццеправодаў.

«Прынята рашэнне аддзяліць ад убудаваных смеццеправодаў. Пяціху і ў Брэсце ідзём такім шляхам. На жаль, часам грамадзяне не разумеюць, дзеля чаго гэта робіцца. Жыхары верхніх паверхаў не адчуваюць нязручнасцяў, аднак іх суседзі з ніжніх паверхаў сутыкаюцца з праблемамі антысанітарыі. Падкрэслю, у выніку мы адыдзем ад смеццеправодаў», — адказаў Анатоль Ліс.

Таксама на прамую лінію звярнуліся жыхары Пінска, Кобрынскага, Жабінкаўскага, Івацэвіцкага, Камянецкага раёнаў, былі званкі з Магілёўскай і Гродзенскай абласцей. Людзей цікавілі тэмы, якія датычацца жылля, ЖКГ, транспарту, землеўпарадкавання, добраўпарадкавання пахаванняў і помнікаў, развіцця прадпрымальніцтва. Асобныя пытанні старшыня аблвыканкама ўзяў на кантроль.

Парламенцкі дзённік

Кіроўцаў і дачнікаў чакаюць перамены

Дэпутаты рыхтуюць змяненні ў законы «Аб дарожным руху» і «Аб паштовай сувязі»

Хутка транспартны збор адвяжуць ад тэхагляду, а ў дачных кааператывах з'явіцца магчымасць устанаўліваць паштовыя скрыні ў сваіх пасёлках. Пра гэта паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй РЫБАК падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БелТА.

На разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта ўжо ўнесены праект указа аб плацяжах за ўдзел у дарожным руху. Дакумент дазволіць адвязаць транспартны збор ад тэхагляду і прадугледзіць магчымасць яго выплаты па месяцах, гэта значыць непасрэдна ў тоі перыяд, калі ўласнік карыстаецца транспартным сродкам. Стаўкі платы ўстановяць у базавых велічынях, якія будуць залежаць ад віду транспарту.

Пры гэтым старшыня парламенцкай камісіі адзначыў, што перад членамі рабочай групы стаяла досыць няпростая задача: «Трэба было ўзгадніць не толькі падыходы, але і ўсе тэхнічныя моманты: гэта і работа сродкаў кантролю, і АРІП па зборы плацяжоў за карыстанне дарогамі, і пытанні сінхранізацыі ўсіх баз, якія існуюць у МУС, «Белтэхагляда», Міністэрства аховы здароўя і Мінпрацы ў частцы людзей, якія маюць льготы».

Таксама парламентарый расказаў аб навацыях у праекце закона «Аб дарожным руху». Так, напрыклад, плануецца пашырыць спіс парушэнняў, якія фіксуюць фотакамеры. Плануецца адсочваць праезд на чырвоне святло, перасячэнне двайной суцэльнай, чыгуначнага пераезда ды іншае. Зараз камеры фіксуюць толькі парушэнні хуткаснага рэжыму і правілаў спынення і стаянкі. Разглядаецца і сістэма налічэння балаў за парушэнні ПДР, якая шырока абмяркоўвалася ў грамадстве.

Акрама таго, прапануецца даць кандыдатам у кіроўцы права здаваць экзамен у ДАІ на машыне з аўтаматычнай каробкай перадач пасля прахо-джання адпаведнай падрыхтоўкі. Пасведчанне ў гэтым выпадку будзе выдавацца з адзнакай аб дазволе кіравання транспартным сродкам адпаведнай катэгорыі толькі з аўтаматычнай трансмісіяй. Калі ж іспыт здадзены на аўтамабілі з механічнай трансмісіяй, то кіроўца зможа кіраваць і «механікай», і «аўтаматам».

Цэлая глава законапраекта прысвечана пытанням арганізацыі дарожнага руху. Па словах Андрэя Рыбака, законапраект, які прадугледжвае змяненні ў закон «Аб дарожным руху», плануецца разгледзець на вясновай сесіі ў першым чытанні.

На брыфінгу парламентарый расказаваў і аб праекце закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб паштовай сувязі».

Большасць змяненняў, асабліва юрыдычныя, не закрануць звычайных грамадзян. Асноўнае новаўвядзенне — магчымасць устанаўліваць паштовыя скрыні на тэрыторыі садовых таварыстваў.

«Да нас звяртаюцца грамадзяне, якія на паўгода жывуць на леціішчы, а любімую газету выпісаць не могуць і ад унукаў паштоўку атрымаць не могуць, — расказаў Андрэй Рыбак. — У абноўленым законе «Аб паштовай сувязі» такая норма з'явіцца. За кошт садовых таварыстваў будзе магчымасць устанаўліваць у дачных кааператывах паштовыя скрыні і атрымліваць простыя паштовыя адпраўленні, паведамленні аб атрыманні пасылкі, а таксама выпісаныя газеты і часопісы».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Пасля «Вялікай размовы»

ЧАМУ ЗАКРЫВАЮЦЬ ЗАВОД?

Сярод звароташ, якія былі накіраваны на адрас кіраўніка дзяржавы напярэдадні «Вялікай размовы» падчас акцыі «Ваша пытанне Прэзідэнту», быў і ад калектыву Полацкага вінаробнага завода. Людзі прасілі захаваць прадпрыемства і рабочыя месцы.

«Працуе з прыбыткам»

Коратка пра змест. У лісце сказана, што прадпрыемства працуе бясстратна, нават з прыбыткам, своечасова аплачвае падаткі, выдаткі на энерганосьбіты і набывае ўсе неабходныя дапаможныя і расходныя матэрыялы.

«Заработная плата выплачваецца своечасова, без затрымак. На заводзе асвоены выпуск фруктова-ягадных натуральных вінаў метадам гарачага разліву, ажыццяўляецца разліў вінаў на чатырох дзеючых лініях (разліў у шкляную бутэльку 0,7—0,5 літра, у пакеты пюр-пак аб'ёмам 1,0 і 0,5 літра, разліў у шклянкі 0,25 літра). Для выторчасці вінаматэрыялаў выкарыстоўваюцца толькі натуральныя сокі і настоі ўласнай выторчасці, сыравіна (яблыкі, травы) растуць у нашай краіне. На прадпрыемстве працуе свой прыёмны пункт шклобутэлькі, асвоены выраб упаковачнай тары. Абсталяванне прадпрыемства, у тым ліку і цэх перапрацоўкі яблыкаў, знаходзяцца цалкам у тэхнічна працоўным стане...»

У звароце таксама адзначаецца, што на прадпрыемстве працуе больш за 70 чалавек, многія з іх больш за 30 гадоў. Канстатуецца, што каля 80 % — ва ўзросце ад 45 гадоў і вышэй, якім будзе праблематычна знайсці работу з такой спецыялізацыяй, а ва ўсіх сем'і і дзеці. «У сітуацыі, якая склалася на прадпрыемстве, нашай вины няма, мы годна і добрасумленна выконваем свае абавязкі і зацікаўлены ў далейшай рабоце прадпрыемства. Для гэтага ёсць усё: выторчыя магутнасці, абсталяванне, спецыялісты і вялізарнае жаданне працаваць. Мы вельмі спадзяёмся на дапамогу нашаму заводу ў працяг працоўнай дзейнасці, а мы ў сваю чаргу будзем выконваць добрасумленна працоўныя абавязкі», — так завяршаецца зварот.

Але ж насамрэч — банкрут!

Вядома, калі не быць у тэме, міжволі ўзнікае пытанне: навошта тады закрываць прадпрыемства, якое працуе з 1929 года? Сёлета — юбілей, але, зразумела, у калектыве, мякка кажучы, зусім не святочны настрой.

Няўжо нехта спецыяльна захацеў, каб у бюджэт не плаціві падаткі, каб работнікаў звольніці?

У Полацкім райвыканкаме неаднойчы падкрэслівалі, што мясцовая ўлада не была зацікаўлена, каб КУВП «Полацкі вінаробны завод» закрылі. Рашэнням эканамічнага суда Віцебскай вобласці яго прызналі банкрутам яшчэ ў чэрвені 2017 года.

У выніку пасяджэння камісіі па прадухіленні эканамічнай неэфектыўнасці (банкруцтва) пры аблвыканкаме ў верасні мінулага года кіраўніку па банкруцтве было даручана працягнуць рэалізацыю плана ліквідацыі прадпрыемства. Апошні быў зацверджаны ў чэрвені 2018-га. Было даручана актывізаваць работу па продажы маёмасці прадпрыемства. Пастановай суда (ад 27.12.2018) працягнуты тэрмін ліквідацыі да 28-га чэрвеня бягучага года, пра гэта паведамілі **намеснік старшыні па эканоміцы Полацкага райвыканкама Аляксандр КАЛАДЫНСКІ.**

Як расказала **намеснік старшыні эканамічнага суда Віцебскай вобласці Вольга ТУР,** у завода былі вялікія даўгі, таму эканамічная дзейнасць прыняла на неплацежаздольнасці. І адпаведны зварот аб неабходнасці банкруцтва быў з боку кіраўніцтва прадпрыемства. Пасля вывучэння дакументацыі суд вынес рашэнне аб ліквідацыі. Трэці год яго дзейнасць рэгулюецца і ажыццяўляецца, згодна з адпаведным заканадаўствам аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве.

Спрабавалі прадаць...

Першы антыкрызісны кіраўнік распрацаваў план санацыі, але ён не прайшоў экспертызу ў РУП «Белсудэкспертзабеспячэнне».

Між іншым, суддзя некалькі разоў выносіла пастанову аб адхіленні судовага разбіральніцтва. Рабіла гэта, каб на прадпрыемстве дапрацавалі план санацыі. Але не атрымалася — з-за вялікай сумы запазычанасці...

Другі па ліку **антыкрызісны кіраўнік КУВП «Полацкі вінаробны завод» Вячаслаў ЮШЧАНКА** расказаў, што яго папярэднік рабіў яшчэ пазалетась спробы прадаць завод як комплекс маёмасці. Спачатку цана лота складала каля 3,9 мільёна рублёў. Правялі трыі аўкцыёны. На апошнім цана паменшылася да прыблізна 3,2 мільёна рублёў.

Вячаслаў Юшчанка на пасадзе з мая мінулага года. Адзначыў, што бягучая запазычанасць была 1,2 мільёна рублёў... Агульная ж запазычанасць на сённяшні дзень на ўзроўні 11 мільёнаў.

Каб неяк выправіць стан спраў, летам мінулага года перарыентавалі завод на выпуск іншай прадукцыі — так званага фруктовага віна без дадання спірту.

Паводле слоў кіраўніка, на сёння прадпрыемства ў прыцыпне працуе нярдэнна. Нават з невялікім прыбыткам. І ўдалося пагасіць прыблізна 500 тысяч рублёў — бягучай запазычанасці. Вінны матэрыял выкарыстоўваецца з запасаў. Пакуль яны не скончацца, завод будзе працаваць. Што датычыцца калектыву, то сёння ў штаце 73 чалавекі. Сярэднямесячная заработная плата за студзень склала 620,3 рубля.

Суразмоўнік разумее, што людзі вельмі перажываюць, але трэба ўлічваць рэалій жыцця. Лісты ў розныя інстанцыі накіроўваліся неаднаразова. Але, калі завод банкрут, што зробіш?

Ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Полацкага райвыканкама сумесна з адміністрацыяй прадпрыемства ў красавіку мінулага года быў распрацаваны план дзеянняў па пошуку работы членам калектыву.

Неаднаразова прапаноўвалі работу

За студзень — люты, дарэчы, звольнілі толькі траіх. Сярод іх: пенсіянер, другога — у сувязі з афармленнем пенсіі па інваліднасці, трэцяга звольнілі за парушэнне працоўнай дысцыпліны. Для необходнасці ажыццяўлення выторчай дзейнасці прадпрыемства прынялі на работу грузчыка...

Ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Полацкага райвыканкама прааналізавалі, хто працуе на прадпрыемстве, улічваючы спісачную колькасць на пачатак года — 76 чалавек. Высветлілася, што 23 ва ўзросце да 40 гадоў, 14 чалавек — 40—49 гадоў, 39 чалавек старэйшыя за 50 гадоў, у тым ліку пяць чалавек — перадпенсійнага ўзросту (менш за два гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту) і сем чалавек — пенсіянеры па ўзросце.

Чатыры разы, пачынаючы з лістапада да пазамінулага года, упраўленнем былі арганізаваныя інфармацыйна-кансультацыйныя сустрэчы з работнікамі прадпрыемства, якія падлягаюць вызваленню ад работы.

Аказана індывідуальное кансультаванне: па тлумачэнні заканадаўства аб занятасці насельніцтва, пераліку мераприемстваў, якія аказваюцца службай занятасці, у тым ліку аб магчымасці перанавучання, перасялення ў сельскую мясцовасць з прадастаўленнем жылля, выдзялення субсідыі для арганізацыі ўласнай справы, аказанні садзейнічання ў працаўладкаванні з улікам адукацыі, пажаданняў і наяўнасці вакансій.

Упраўленнем, пачынаючы з ліпеня памяжулага года, каля дзесяці разоў арганізоўвалася міні-кірмашы вакансій з запрашэннем работнікаў прадпрыемства. Правядзенне чарговага з выездам на прадпрыемства прайшло 22 сакавіка.

За 2018—2019 гады ва ўпраўленне для рэгістрацыі ў якасці беспрацоўных звярнулася пяць грамадзян, звольненых з прадпрыемства. Усе яны працаўладкаваныя.

Як запэўнілі карэспандэнта, у выпадку вызвалення работнікаў прадпрыемства, будзе забяспечана працаўладкаванне работнікаў на існуючыя вакансіі ў арганізацыі раёна. Плюс акажуць садзейнічанне ў адпаведнасці з нормамі заканадаўства. У мэтах дадь магчымасць заробку ў перыяд пошуку працы будзе арганізавана часовая занятасць у выглядзе аплатных грамадскіх работ.

Аказанне садзейнічання ў працаўладкаванні працягнуць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЧАС ПАКУПНІКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І таму цэны на яе падпрадкоўваюцца не толькі рынкавым законам цэнаўтварэння, заснаваным на балансе попыту і прапанавання, але і такім прыватным фактарам, як фінансавы дабрабыт пакупніку і запатрабаванасць загарадных дамоў у цэлым. А ні тое, ні другое ў апошнія гады не мае станоўчай дынамікі.

Здавалася б, жаданне кожнага прадаўца прадаць даражэй выглумачальнае. «Але ў працэсе продажу не варта забываць, што гэтак жа кожны пакупнік хоча купіць як мага танней, — расказавае менеджар аддзела загарадняй нерухомасці агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Алена Акуліч. — Як мы бачым — інтарэсы супрацьлеглыя. Але прадавець трэба ўсё роўна. І скажу больш за тое: сёння, дзі і апошнія як мінімум пяць гадоў, жаданне прадаўцоў прадаць значна большае, чым пакупнікоў купіць».

Таму можна казаць аб тым, што цяпер рынак не прадаўца, як гэта было ў канцы 2000-х, а пакупніка. І кошт загараднага аб'екта нерухомасці шмат у чым залежыць ад таго, колькі канкрэтны пакупнік гатовы заплаціць за яго.

У першую чаргу пакупнікі арыентуюцца на круглую суму цаны. А вось выйсці за рамкі наяўнага бюджэту (напрыклад, за кошт крэдытных сродкаў) сёння дазваляюць сабе толькі лічаныя адзінкі. У сітуацыі, калі рынкавае прапанаванне значна перавышае існуючы попыт, перад патэнцыйнымі пакупнікамі адкрываюцца шырокія магчымасці выбару. І таму сёння прадаўцам важна весці дыялог з кожным пакупніком. Паколькі, страціўшы аднаго-другога і трэцяга, чацвёртага ён можа чакаць вельмі доўга. І тут лік ідзе не на месяцы, а нават на гады.

Зніжкі? Абавязкова

Тыповы, але пры гэтым няправільны дыялог прадаўца з пакупніком выглядае наступным чынам: пакупніку, якому спадабаўся дом або дача, цана здаецца завышанай. Але прадавец адмаўляецца ісці на зніжэнне кошту ў надзеі на тое, што будуць яшчэ ахвотныя. З аднаго боку, ён мае рацыю — гэты пакупнік не апошні. Але праз колькі часу знойдзецца наступны — гэта вялікае пытанне. Таму што загарадны дом або дача — гэта як пінжак, які павінен «сесці» на пакупніка. Але калі вы гатовыя чакаць пакупніка гадамі, то варта задаць сабе пытанне — якія цэны будуць праз паўгода ці год на рынку, які зніжаецца?

Акрама таго, не на руку прадаўцу іграе сезоннасць. Нягледзячы на тое, што нават у міжсезонне колькасць патэнцыйных пакупнікоў, якія знаходзяцца ў актыўным пошуку, зніжаецца не крытычна, — умовы надвор'я значна ўскладняюць доступ да прадаваных загарадных аб'ектаў. Усё гэта ўпарта цісне на прадаўца і вымушае ісці на зніжэнне кошту. І ў гэтай сітуацыі чым раней прадасца аб'ект, тым гэта будзе больш выгадна для прадаўца.

Дача таннейшая, чым вясковы дом, удвая

Што можна сказаць пра рэальныя цэны здзелак? Уяровень коштаў з найбольш запатрабаванымі сярод пакупнікоў аб'ектамі, як, напрыклад, дачы і невялікія, у добрым стане прыватныя (вясковыя) дамы, застаўся нязменным. Цэны на гэтыя будынкі амаль не мяняюцца на працягу амаль 10 гадоў. Гэта значыць, сярэднестатыстычнае, у добрым стане леціішча ў мінскім рэгіёне каштуе на ўзроўні 10—15 тысяч долараў (у залежнасці ад таго, як далёка знаходзіцца ад горада, велічыні ўчастка і плошчы жылой зоны). А дагледжаны прыватны дом плошчай каля 70—100 квадратных метраў будзе каштаваць 20—30 тысяч «зялёных».

Іншая рэч, што за кошт павелічэння колькасці прапанаваных на продаж аб'ектаў канкурэнцыя паміж прадаўцамі павялічваецца і пры гэтым памяншаецца колькасць ахвотных набыць сабе «домік у вёсцы» або дачу. Таму сёння прадаць хутка — гэта не значыць аддаць выключна танна, а значыць прадаць выгадна і ад гэтага толькі выйграць. Бо ўжо каторы год на практыцы амаль не бывае выпадкаў, каб за перыяд продажу аб'екта цана на яго вырастала.

У структуры прапанавання загарадняй нерухомасці дамы і зямельныя ўчасткі займаюць па 25 %, а дачы і недабудаваныя аб'екты — 30 % і 20 % адпаведна.

ДАЧУ ДАЛЕЙ АД СТАЛІЦЫ МОЖНА ЗНАЙСЦІ І ЗА ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ

Самыя дарагія садовыя домікі, якія прымасціліся каля абласных цэнтраў, цяпер паспяховa прадаюцца ў заходняй частцы нашай краіны. Сярэдні кошт дач у Брэсцкім раёне вагаецца ад 10 да 15 тысяч долараў. Ёсць на другасным рынку загарадняй нерухомасці і бюджэтныя варыянты — ад шасці тысяч долараў.

У Гродзенскім рэгіёне прадаюцца сотні пустуючых будынкаў, якія былі ўзведзены ў дачных кааператывах. Цана невялікіх утульных домікаў тут пачынаецца з 10 тысяч рублёў. Садовыя хаты самыя разнастайныя (па плошчы жылля, велічыні зямельнага ўчастка і гэтак далей), таму часцей і ацэньваецца такі параметр, як квадратны метр. Сярэдняя цана «квадрата» звычайнай дачы каштуе як правіла ад 300 рублёў. Але сустракаюцца і багацейшыя «фазэнды» — ад 1000 рублёў за квадратны метр. Ёсць і нестандартныя варыянты. Прадаецца, напрыклад, невялікая двухпавярховая дача ўсяго за чатыры тысячы рублёў. Чаму так танна, спытае? Усё таму, што на ўчастку адсутнічае электрычнасць.

Хапае загарадняй нерухомасці на продаж і ва ўсходнім рэгіёне. Сярэдні цэнтнік на цалкам якасныя садовыя збудаванні роўны 10—30 тысячам рублёў. Але сустракаюцца і «дойгажыхары», напрыклад, на Віцебшчыне дачы, якія былі пабудаваныя 20—25 гадоў таму, прадаюць часам нават за 2000 тысячы рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

Грошы

Камандзіровачныя падраслі

Акрама таго, з вёскі ў горад цяпер больш выгадна ездзіць, чым наадварот

З мінулай суботы ў нашай краіне павысілі памеры камандзіровачных — да 9 рублёў за суткі. Таксама была зменена схема кампенсацыі расходаў на найме жылога памяшкання. Цяпер такія выплаты залежаць ад статусу населенага пункта, у якім вы спыніліся.

Раней сутачныя за знаходзіння камандзіроўку складалі 3,5 рубля, а за двухдзённыя і больш працяглыя — 7 рублёў у суткі. Цяпер будуць плаціць за суткі 9 рублёў незалежна ад працягласці камандзіроўкі.

Гэтай жа пастановай урада змяняецца схема кампенсацыі расходаў па найме жылога памяшкання. Выдатні па найме жылля ў абласных цэнтрах і Мінску вызначаны ў памеры 50 рублёў у суткі, у раённых цэнтрах — 25 рублёў, у астатніх населеных пунктах — 20 рублёў (без прадстаўлення дакументаў). Калі выдатні па найме перавышаюць гэтыя памеры, наймальнік пакрывае іх на падставе дакументаў, але не вышэй за кошт аднамеснага нумара ў гасцініцы пражывання.

У камандзіроўках пакрываюцца расходы на праезд любым відам транспарту (акрамя таксі) па фактычным кошце квіткоў. Новаўвядзенні датычацца і камандзіровак за мяжу — павялічаны памеры сутачных у некаторыя краіны, а выдатні па найме цяпер будуць кампенсаваць у вызначаных пастановай № 176 памерах без пацвярджальных дакументаў.

Выдатні на праезд пакрываюцца па любых тарыфах, за выключэннем тарыфаў бізнес-класа. Разам з тым, калі работнік накіроўваецца ў камандзіроўку за кошт боку, які прымае (апошні бярэ на сябе выдатні, звязаныя з забеспячэннем харчавання і транспартам у межах месца камандзіравання), то выплата сутачных работніку не будзе, за выключэннем часу знаходжання ў дарозе. За час знаходжання ў дарозе сутачныя выплачваюцца ў памеры 100 % ад устаноўленай нормы.

Сяргей КУРКАЧ.

Да 75-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ 1944 2019

У шпіталі, на фронце, у сэрцы

Месца на вайне і ўнёсак жанчын у Перамогу абмеркавалі ў Мінску падчас круглага стала «Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі». Арганізатарамі выступілі Беларускі саюз жанчын, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальная акадэмія навук.

— У Беларусі каля 70 тысяч жанчын былі партызанкамі і падпольшчыцамі, амаль шэсць соцень ваеннымі ўрачамі. Сярод Гераяў Савецкага Саюза — дзесяць беларусак. Усе ведаюць Веру Харужую, Зіну Партнову, Алену Мазанік, але хто астатнія? Мы павінны ведаць імя кожнай з іх. Лёсы дзяўчат не пакідаюць абыякавымі і з'яўляюцца прыкладамі небывалай мужнасці, — упэўнена намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, **старшыня Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА.** — Нашы папярэднікі заўсёды былі ў самым цэнтры падзей. Не баялося ні цяжкай працы, ні агню, ні ворага. Нельга выхаваць патрыётаў толькі гаворачы і чытаючы, трэба ўцягваць у дзейнасць тых, каго хочам навучыць. Таму так важна стварыць як мага болей нагод для больш цеснага ўзаемадзеяння моладзі са старэйшым пакаленнем, паказваць рэальныя прыклады гераізму.

Круглы стол даў старт шэрагу мерапрыемстваў у межах рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі». Мар'яна Шчоткіна паведаміла, што плануецца правесці экскурсіі ў музей Вялікай Айчыннай вайны для дзяцей з адданых раёнаў краіны і з малазабяспечаных сем'яў. Тут, дарэчы, дзякуючы праекту экспазіцыя папоўнілася выстаўкай, прысвечанай франтавічкам, партызанкам і работніцам тылу.

— У тыя страшныя гады жанчына была ў небе і на зямлі, у тыле і на перадавой, у шпіталі і на заводах. Яны без боязі кідаліся ў бой. Імі трэба ганарыцца, але нельга забываць і пра тых, хто натхняў мужчын на подзвіг, — выказаў думку **дырэктар музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір ВАРАПАЕЎ.** — Вайна — гэта не толькі баталіі, гэтая яшчэ і любоў, у імя якой кожны баец абараняе Радзіму.

Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Акадэміі навук, член-карэспандэнт, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр КАВАЛЕНЯ нагадаў пра няпросты лёс жанчын і пасля вайны:

— Тады Беларусь была краінай удоў і дзяцей-сірот. Ніколі не забуду, як у роднай вёсцы жанчыны збіраліся і суцяшалі адна адну: «Крысціна, і твой прыйдзе...», «Марыся, і твой, можа, ужо на паўшляху дадому...». Назаўсёды ўрэзалася ў памяць іх вернасць — усё яшчэ яны прысвяцілі памяці абаронцаў Айчыны. Жанчыны адбудавалі гарады з нуля, узнялі эканоміку, выгадавалі дзяцей, кормячы іх крапівой і лебядой.

— Усе ведаюць маці-патрыётку Настассю Купрыянаву з Жодзіна: жанчына адправіла на фронт пяцёра сыноў. Гэтая гісторыя такая не адна. У маршала авіяцыі Сцяпана Красоўскага было чацвёра братоў, і ўсе вярнуліся, у генерала Іосіфа Гусакоўскага — пяцёра, яны таксама правялі вайну на франтах, — нагадаў **кандыдат гістарычных навук, прафесар Барыс ДАЛГАТОВІЧ.** — Больш за тое, калі капнуць глыбей, то падобныя прыклады знойдуцца ў кожным раёне Беларусі. І за ўсімі гэтымі жыццямі стаялі іх матулі, якія з дзяцінства выхоўвалі патрыятычны дух, вучылі быць адданымі і смелымі. Ніякі ім паклон!

А вось **удзельніца вызвалення Мінска, сяржант у адстаўцы Валянціна ЧУДАЕВА** назад азірацца не стала. Замест гэтага ветэран звярнулася да падрастаючага пакалення:

— Памятайце, спадчына — гэта не хрусткія банкноты, не бляск золата, а наша з вамі памяць, духоўнасць. Мне хочацца, каб беларуская зямля пахла хлебам, а не порахам, каб неба было чыстым і яго ніколі не рассякалі варожыя самалёты.

Ганна КУРАК.

На ўласныя вочы

«УСЁ НАРМАЛЬНА, МАМА!»

Бацькі і сваякі брэсцкіх дэсантнікаў паназіраліся з армейскім жыццём і побытам сваіх вайскоўцаў

На палігоне «Брэсцкі» прайшоў Дзень адкрытых дзвярэй для сваякоў асабовага складу змешанага артылерыйскага дывізіёна 38-й асобнай дэсантнай штурмавой брыгады. На КП вайсковай часці сваякоў сустракаў намеснік камандзіра дывізіёна па ідэалагічнай рабоце гвардыі капітан Дзмітрый БЯЛЕЦКІ. Ахвотных пазнаёміцца з побытам салдат аказалася больш за сто чалавек. Яны дружна селі ў аўтобусы і накіраваліся на палігон.

Там гасцей чакалі не стрэльбы і вучэнні, а... канцэрт. Так вайскоўцы задалі пазітыўны настрой удзельнікам мерапрыемства, а заадно далі магчымасць сустрэцца і паболеў пагаварыць. Сустрэчы і сапраўды былі цёплыя і радасныя. Мамы, таты, бабулі змаглі ўбачыцца са сваімі роднымі абаронцамі, распытаць, як іх кормяць, як ідзе служба, якія цяжкасці даводзіцца пераадольваць.

Потым удзельнікі імправізавалі заняткі па баявой падрыхтоўцы. Артылерысты трымалі справаздачу перад роднымі, паказвалі, чаму яны навучыліся. Гледачам прадэманстравалі баявы эпізод, былі таксама паказальныя выступленні вайскоўцаў.

Адным з важных момантаў Дня адкрытых дзвярэй, несумненна, стала сустрэча гасцей з камандзірам змешанага артылерыйскага дывізіёна. **Гвардыі падпалкоўнік Вадзім РУДЗЬ** адказаў на ўсе пытанні сваякоў. Найбольш іх цікавілі ўмовы пражывання, харчавання, ну і, вядома, маральна-псіхалагічная абстаноўка ў армейскім калектыве. Камандзір дывізіёна запэўніў бацькоў, што іх сыны вернуцца з арміі здаровымі, узмужнелымі, больш сур'ёзнымі і адказнымі людзьмі. Менавіта гэтаму вучыць маладога чалавека армейскае жыццё.

У другой палове дня ўсе разам елі салдацкую кашу, вельмі смачную, прыгатаваную ў палявых умовах. Было шмат усмешак, добрых слоў, цікавых сустрэч. Маці салдата тэрміновай службы Таццяна Дзмітрук сказала, што яна з'язджала з палігона са спакойнай душой:

— На пачатку службы Рамана розныя былі думкі, сумненні, асабліва пасля сумна вядомых падзей у Печах. Але нам пашанцавала. Мой сын за паўтара года сваёй службы ні разу не паскардзіўся ні на побыт, ні на адносіны ў калектыве. А тут мы самі ўпэўніліся, што нашы дзеці нармальна жывуць, як трэба навучаюцца ваеннай справе. Гэтым разам мы наведалі не стацыянарную казарму, а ваенна-палявы лагер, дзе ім даводзіцца жыць падчас армейскіх заняткаў, тут створаны даволі нармальныя ўмовы.

— У мяне падрастае яшчэ адзін сынок, — прадоўжыла Таццяна Яўгенаўна. — Калі прыйдзе час яму служыць у войску, я не буду сумнявацца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота БелТА.

MINSK 2019

ПАЦЭЛІЦЬ У ЗАЛАТЫ ЯБЛЫЧАК

Як праходзіць падрыхтоўка зборнай па стральбе з лука да галоўнага старту года

На Еўрапейскіх гульнях у Мінску ў гэтым відзе спорту прымуць удзел 128 спартсменаў, сярод іх будзе разыграна восем камплектаў узнагарод. Спаборніцтвы 21—27 чэрвеня прыме спарткомплекс «Алімпійскі».

На папярэдніх гульнях у Баку беларускія спартсмены заваявалі дзве ўзнагароды, «серабро» тады было на рахунку жаночай зборнай у камандных спаборніцтвах і «бронза» ў індывідуальных спаборніцтвах у Антона Прылепава.

Адбор беларускіх стралкоў на сёлетнія Гульні пачынаецца толькі цяпер пасля збору ў Турцыі, наша каманда там жа прыме ўдзел у міжнародных спаборніцтвах, затым паспаборнічае на Гран-пры ў Бухарэсце, а заключны этап адбору пройдзе па ўнутраным рэйтынгу і па выніках этапу Кубка свету ў маі ў Турцыі. *«Такім чынам, мы вызначым склад адразу на два турніры: чэмпіянат свету, які пройдзе з 9 да 16 чэрвеня, і на Еўрапейскія гульні,* — адзначае **галоўны трэнер зборнай Кацярына ЦІМАФЕЕВА.** — *Абодва турніры вельмі важныя для нас, таму што на іх будуць разыгрывацца алімпійскія ліцэнзіі ў Токіа-2020».* Кацярына таксама адзначае, што дамашні турнір дадае адказнасці. *«Турнір важны як для кожнага спартсмена-ўдзельніка, так і для нашага віду спорту ў цэлым, таму наша задача — выступіць на дамашніх Еўрапейскіх гульнях як мага лепш, магчыма паўтарыць вынік Гульняў у Баку. Нам будзе цяжка, бо зараз вельмі шмат прадстаўнікоў еўрапейскіх краін займаюць лідзіруючыя пазіцыі ў свеце, але мы прыкладзём усе намаганні»,* — рэзюмуе Кацярына Цімафеева.

Лідарамі каманды сёння застаюцца вопытныя спартсмены Антон Прылепаў і Ганна Марусава, аднак на пяткі ім наступае і моладзь, якая ўсё больш прагрэсіруе ў апошнія гады. Напрыклад, самая маладая спартсменка ў нацыянальнай зборнай васямнаццацігадовая Карына Казлоўская толькі год таму трапіла ў зборную, але ўжо годна прадставіла краіну на дарослым чэмпіянаце Еўропы. Карына адзначае, што, нягледзячы на свой юны ўзрост, яна здольная пазмагацца за тое, каб трапіць на Еўрапейскія гульні, і за ўзнагароды турніру. *«Для мяне сёння складанасць у тым, што я маю недастаткова вопыту ў міжнародных стартах, але гэта адначасова не перашкаджае мне трапляць у цэлі, спрэчлівыя з эмоцыямі і перамагаць»,* — адзначае спартсменка і дадае — *Мая галоўная задача цяпер прыстраляцца, добра фізічна і псіхалагічна падрыхтавацца да адказных турніраў».*

2—5 мая на стадыёне ў САК «Алімпійскі» пройдзе тэставы турнір па стральбе з лука, ён адбудзецца ў фармаце чэмпіната Беларусі, на турнір будзе запрошаны прадстаўнік з Міжнародная федэрацыі стральбы з лука, які ацэніць гатоўнасць краіны да прыняцця буйнога турніру.

«Еўрапейскія гульні для нас — гэта, у першую чаргу, папулярызацыя віду спорту, бо стральба з лука дастаткова закрыты від. Дзякуючы Гульням у нас ужо палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база, з'явіўся свой стральковы комплекс, стральковае поле добрага еўрапейскага ўзроўню, а калі мы яшчэ заваюем медаль на Гульнях, гэта дасць яшчэ большы штуршок да развіцця», — адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі стральбы з лука Сяргей ШЧАМЯЛЁЎ.**

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Душа і творчасць

Станоўчая тэндэнцыя жыцця

Прэзентацыю работ пераможцаў Міжнароднага конкурсу сацыяльнага плаката «Зараз!» можна будзе ўбачыць з красавіка ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Гэты праект прысвечаны валанцёрству і дабрачыннасці.

У конкурсе прынялі ўдзел плакаты з 24 краін свету. Сярод 250 работ было адабрана 60 найлепшых і тры пераможцы. Менавіта яны і будуць прадстаўлены на заяўленым мерапрыемстве. Многія аўтары — знакамітыя прафесіяналы ў сваіх краінах. Плакаты ацэньвала міжнародная журы.

Першае і другое месца ў дызайнеразаў Польшчы, трэцяе — у беларускага ўдзельніка. Цікава, што сертыфікаты пераможцам будуць уручаць не праз электронную пошту, а праз пасольства той краіны, дзе жыве ўдзельнік конкурсу.

— Гэта дапаможа яшчэ больш папулярызаваць праект, — лічыць **куратар «Зараз!» Таццяна КУПАВА.** — Тэма дабрачыннасці актуальная заўсёды. Нам, арганізатарам праекта, хацелася зрабіць нешта карыснае, што будзе фарміраваць у грамадства актыўную жыццёвую пазіцыю. Для рэалізацыі задумы было важна, каб праект ажыццяўляўся добраахвотнымі намаганнямі — валанцёрамі. Менавіта яны рассылалі аб'явы ў розныя краіны свету, звязваліся з іншымі валанцёрскімі групамі, з пасольствамі і консульствамі.

Акрамя выстаўкі, у гэты дзень з 11.00 да 15.00 пройдзе дабрачынная акцыя, у рамках якой будуць прадстаўлены работы беларускіх медыяперсон. Грошы, сабраныя на ёй, пойдуць на дапамогу інваліду.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Сталічны ЧАС

● У сталіцы падвялі вынікі першых двух месяцаў года па грузавых і пасажырскіх перавозках. Па словах спецыялістаў, паведаміла агенцтва «Мінск-Навіны», грузаабарот усіх відаў транспарту за гэты перыяд склаў 5,3 млрд тона-кіламетраў, ці 99,2 % да ўзроўню студзеня — лютага 2018-га. За два месяцы арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі перавезлі 11,8 млн тон грузаў, ці 93,1 % ад аб'ёму, перавезенага ў студзені — лютым 2018-га. Ва ўпраўленні таксама адзначылі, што паслугамі сталічнага пасажырскага транспарту з пачатку года скарысталіся 135,1 мільёна чалавек. Гэта на 5,8 % больш, чым у студзені — лютым летась. Пасажырабарот транспарту склаў 1 592,2 млн пасажыра-кіламетраў, або 115 % да ўзроўню студзеня — лютага 2018 года.

● З 25 сакавіка пачалося грамадскае абмеркаванне горадабудаўнічага праекта дэталёвага планавання тэрыторыі ў межах вуліц Кісялёва — Куйбышава — пр. Машэрава — пр. Незалежнасці, паведамляе карэспандэнт агенцтва «Мінск-Навіны».

Зараз у названых межах знаходзяцца карпусы ААТ «Гарызонт», жылыя шматпавярховікі, адміністрацыйныя будынкі, а таксама выцвярчыя аб'екты былога тралейбуснага дэпо № 1.

Што ж прапануюць на перспектывы?

Квартал 1, куды ўвайшла тэрыторыя «Гарызонта», па праекце павінен ператварыцца ў грамадскую забудову з жылымі элементамі. Напрыклад, карпусы ўздоўж вул. Куйбышава і часткова пр. Машэрава прапануецца рэканструяваць пад культурна-адукацыйныя і забаўляльныя цэнтры. Будынкі ўздоўж вул. Кісялёва захаваюць адміністрацыйную функцыю. А вось доўгі будынак уздоўж пр. Машэрава (9 к. 8) прапануецца ператварыць у жылы дом з паркінгам у двух узроўнях на першым паверсе трансфармаванага корпуса. У сярэдзіне квартала намечаны знос шэрагу заводскіх пабудоў і ўзвядзенне на вызваленай пляцоўцы гандлёва-забаўляльнага цэнтра з падземным паркінгам.

У квартале 2, да якога належыць тэрыторыя былога дэпо, збіраюцца будаваць шматкватэрныя жылыя дамы. У іх таксама прадугледжваюцца ўбудавана-прыбудаваныя аб'екты грамадскага прызначэння. Запланаваны тут і нявялікі дзіцячы сад на 60 месцаў. Паркоўка — падземная. Будынкі, якія ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць, захоўваюцца з выкананнем рэжымаў зон аховы і рэгулявання забудовы. Гэта значыць, вышыня дамоў будзе абмежаваная.

У першую чаргу, да 2025 года, мяркуецца асваенне квартала 2 (былога дэпо). Што датычыцца тэрыторыі «Гарызонта», то тут перамены запланаваны да 2030 года.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ЗА ШЧУПАКА З ІКРОЙ — ПА ТРАЙНОЙ ТАКСЕ

Пяць грубых фактаў браканьерства са здабычай шчупака, які зараз нарастае, выявілі інспектары за тыдзень.

У Лідскім раёне дзяржінспектары, супрацоўнікі Дэпартамента аховы МУС і раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў падчас суменсага рэйду затрымалі аўтамабіль, у якім жыхар Бярозаўкі перавозіў незаконны ўлоў. Уся рыба ў ім вагой 40,5 кілограма мела слады дзе сетак.

Нягледзячы на тое што ў самой машыне забароненых прылад лоўлі не выявілі, дома ў рыбака-нелегала знайшлі шэсць сетак, два пад'ёмнікі і два качкі з электраправодам. Пры абследаванні вадаёма, дзе, як мяркуецца, магла быць здабыта рыба, таксама знайшлі ўстаноўленую сетку даўжынёй 700 метраў.

Сярод іншых рыб ва ўлове парушальніка было і 14 шчупакоў з ікрой. Вылаў гэтага віду цяпер забаронены ў сувязі з нерастам. За кожнага шчупака, злоўленага падчас забароны, прыдзецца заплаціць 229,5 рубля. Агульная сума шкоды, нанесенай браканьерам, ацэньваецца ў 5,3 тысячы рублёў. Заведзена крымінальная справа.

Браканьеры-сеткавікі са шчупаком ва ўловах былі затрыманыя на мінулым тыдні ў Баранавіцкім (рака Смалянка), Клецкім (Чырвонаслабодскае вадасховішча), Жытковіцкім (возера Чырвонае) раёнах і ў Рагачове (рака Дняпро). Усім ім пагражае крымінальная адказнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

140 КІЛАГРАМАЎ НАРКОТЫКАЎ КАНФІСКАВАЛІ БЕЛАРУСКІЯ МЫТНІКІ

Рэкордную партыю наркотыкаў затрымалі на беларускай мытні ў панядзелак. 130 кілаграмаў гашышу і 10 кілаграмаў таблетак экстазі былі знойдзены падчас рэнтгенаўскага догляду на пункце пропуску «Грыгараўшчына», які знаходзіцца на беларуска-латвійскай мяжы. Апошняя партыя стала абсалютным рэкардсменам — больш буйной колькасці экстазі беларускія праваахоўнікі яшчэ не сустракалі.

Такі «ўлоў» стаў магчымы дзякуючы аперацыі, якую распрацавалі і правялі супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па наркаканторлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі і Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з кантрабандай і постмытнага гандлю Дзяржаўнага мытнага камітэта Эдуард ДАНІЛОВІЧ. — Кіраваў ім 52-гадовы грамадзянін Літвы. Схованку ўскрылі пры дапамозе кінолагаў і спецыяльнага інспекцыйнага-даглядчага комплексу. Тайнік быў абсталяваны настолькі добра, што яго ламалі пяць гадзін. Там аказаліся ўпакаваныя скруткі з пласцінамі і таблеткамі. Судовая экспертыза пацвердзіла, што гэта — гашыш і экстазі.

Заведзена крымінальная справа па частцы 1 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Паводле аператыўнай ацэнкі, кошт наркотыкаў перавышае 2,5 мільёна долараў.

— Дзякуючы мерам, якія прымаюцца на дзяржаўным узроўні, агульная наркасітуацыя паляпшаецца, — адзначыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па наркаканторлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Генадзь КАЗАКЕВІЧ.** — Але ўзровень пагрозы меншы не стаў, пра што сведчыць, у прыватнасці, і гэты выпадак.

Агулам на сёлета было канфіскавана больш за 270 кілаграмаў наркотыкаў і псіхатропаў. Перакрыта дзевяць каналаў іх пастаўкі і транзіту. Пры гэтым за мінулы год праваахоўнікі перапынілі рух больш як тоны дурману, у тым ліку транзітнага. Частка яго вяртаецца ў Беларусь так званым «рээкспартам».

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

У КРАІНЕ — ПАЛЯВАННЕ НА ПТУШЫНУЮ ДЗІЧЫНУ

Да другой нядзелі мая (сёлета яна прыпадае на 12-е чысло) дазваляецца ружэйная здабыча пралётных гусі: шэрай, белалобай, гуменніка, канадскай казаркі, а таксама самцоў (качараў) качкі: крыжанкі, свіязі, гогаля, шыраканоскі, чырвонагаловай і чубатай чэрнецы, чыркоў-свістункоў і траскунка, качкі шэрай. Паляванне дазваляецца ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 12 да 18 гадзін.

Для вышуку і падачы здабытай дзічыны можна выкарыстоўваць паляўнічых сабак — тэр'ераў, таксаў, выжлых, спаніэляў, рэтрыверaў, водных сабак.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, агульная працягласць веснавога сезона паляванння на гусей і качак не павінна перавышаць 28 дзён на працягу дазволенага перыяду, за выключэннем паляванння па паляўнічых турах. Веснавы сезон паляванння на гусей і качак у рамках правядзення апошніх доўжыцца з другой суботы сакавіка да другой нядзелі мая.

Існуе пералік паляўнічых угоддзяў, на тэрыторыі якіх забараняецца паляванне на асобныя віды птушак у веснавы сезон паляванння. Азнаёміцца з ім можна на сайце Дзяржінспекцыі.

У веснавым сезоне паляванння на гусей або качароў качак дапускаецца выкарыстанне замест скрадка маскіровачнага халата (маскіровачнага касцюма), надзетага на паляўнічага, які забяспечвае яго непрыкметнае для паляўнічых жывёл знаходжанне ў паляўнічых угоддзях (маскіроўку).

Сяргей РАСОЛЬКА.

«У ВЯСНУШКАХ ВЯСНА СОК БЯРОЗАВЫ П'Е»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Можна таксама аформіць білет і напрыстоўваць самастойна на тых участках, якія пакажуць леснікі. Але апошняе не карыстаецца попытам у насельніцтва, бо дзялянкі тут знаходзяцца даволі далёка ад населеных пунктаў.

— У іншых лясніцтвах нарыхтоўваюць і самі людзі, — гаворыць **Алена МЁРЗЛАЯ, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Лунінецкага лясгаса.** — Сёлета толькі адзін выпадак парушэння зафіксавала камера назірання ў лесе. Грамадзянін, які нарыхтоўваў самавольна, аштрафаваны. Але ў цэлым людзі праяўляюць разуменне. Вядома, лепш купіць бярозавік па 15 капеек за літр і не парушаць закон.

— Вядзём нарыхтоўку крыху больш за тыдзень, — працягвае Людміла Уладзіміраўна, — ужо сабралі 380 тон. Спяшаемся, бо бярозы сёлета капрызныя, крыху сонейка больш засвеціць, і яны перастануць аддаваць сок. У мінулыя гады і соку больш было, і быў ён саладзейшы за цяперашні. Але ж год на год не прыходзіцца. Летась мы нарыхтавалі і прадалі, у тым ліку на экспарт, 650 тон. Як будзе цяпер, прагназаваць пакуль не бяруся. Асобныя лясніцтвы за дзень нарыхтоўваюць каля 20 тон.

У Брэсцкім вытворчым лесагаспадарчым аб'ядненні расказалі пра планы атрымаць 4,5 тысячы тон гаючага напою. **Вядучы інжынер Уладзімір ІЛЬЮКЕВІЧ** паведаміў, што прадукцыя накіроўваецца на ААТ «Савушкін прадукт», на Ляхавіцкі і Пружанскі кансервавыя заводы, Маларыцкі агародніна-сушыльны камбінат, Гарынскі агракамбінат, гродзенскае прадпрыемства «АВС». Летась з Лунінца, Ганцавічаў, Пінска, Івацэвіч у 250 тон прадалі ў Літву. Сёлета пастаўкі ў ЕС таксама вядуцца. Прыкладна 600—700 тон мяркуецца рэалізаваць насельніцтву.

Гадоў восем таму давялося пісаць пра сямейныя брыгады нарыхтоўшчыкаў з Жабінкаўскага раёна. Тады Людміла і Мікалай Козічы працавалі з яшчэ адной сямейнай парай. Цяпер Козічы стварылі ўласную брыгаду, да іх далучыліся сын з пляменнікам. На асноўнай рабоце яны бяруць водпуск і перасяляюцца ў лес.

Жывуць тры-чатыры тыдні ў вагончыках, якія загадзя сюды перагналюць. У кожным з такіх пакояў на колах стаяць ложкі, ёсць усё неабходнае для паходных гігіены і харчавання. Побач абсталяваны стол і месца для вогнішча.

— Устанеш у шэсць раніцы, — расказвае Людміла Мікалаеўна, — вакол лясная цішыня, якую перарываюць першыя птушыныя галасы. Паветра чыстае, гаючы бярозавік, змена гарадской абстаноўкі на прыродную асяроддзе. Іншыя за экалагічны турызм такія грошы плацяць, а тут мы яшчэ зарабляем. Ну, вядома, праца не лёгкая, але ж не засумуеш.

На гэтую дзялянку прыязджаюць брастаўчане купляць сок. Кожную вясну Козічы робяць шмат здымкаў, вядуць гісторыю сваіх нарыхтоўчых кампаній, і гэтай хронікі засталося не многа да дваццаці гадоў. Тады мы з Людмілай гаварылі, што ў альбом так просяцца радкі Язэпа Пушчы: «У вяснушках вясна сок бярозавы п'е за здароўе тваё і каханне маё...» Цяпер яны там ёсць.

І яшчэ. Людміла даўно развеяла міф, увасоблены ў «Новай зямлі», што нельга варыць клёцкі на бярозавым соку. Яна гатуе на соку ўсе стравы, яны нават не бяруць у лагер пітную ваду. Нарыхтоўшчыкі ўсім рэкамендуюць пакашаваць чай і каву на бярозавым соку, а таксама як мага больш ужываць сок свежым.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Лунінецкі, Жабінкаўскі раёны.

Цікавы досвед

НЕ СМАРТФОНАМ АДЗІНЫМ...

Як арганізоўваюць вольны час для дзяцей і моладзі ў Германіі

У рамках сумеснага праекта «Моладзь у журналістыцы» Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА і нямецкай грамадскай арганізацыі Pressenetzwerk fur Jugendthemen e.V. (PNJ) беларускія журналісты адправіліся ў Берлін, каб высветліць, як мясцовая моладзь праводзіць вольны час. Наш карэспандэнт даведаўся, ці ёсць адрозненні ад беларускіх рэалій, як мясцовым дзецям прывіваюць любоў да сельскай гаспадаркі, а таксама як у Германіі дапамагаюць разнастаіць жыццё малазабяспечаным сем'ям з дзецьмі.

Месца для душы

Першым пунктам нашага візіту была маладзёжная ферма Moritzhof. Дзіўнае па многіх прычынах месца, яно размяшчаецца на тэрыторыі адрэзку колішняй Берлінскай сцяны. Тлумачым: гэта грандыёзнае збудаванне паступова мадэрнізавалі і ў выніку яно ператварылася ў сур'ёзную інжынерна-тэхнічную канструкцыю, якая складалася з дзвюх сцен, металічнай сеткі з калючым дротам, паласы з металічнымі шыпамі, вартавых вежаў... Увогуле, памiж дзвюма сценамі (цяпер іх, вядома, няма) і размяшчаецца маладзёжная ферма!

Цікавы факт: вакол легендарнага графіці на Берлінскай сцяне дзяжурыць натоўпы турыстаў, каб зрабіць фота. Хочаш атрымаць сваё — трэба выбраць момант і з усіх ног бегчы да палатна.

Дарэчы, сёння зямля ў такіх месцах каштуе шалёных грошай, таму побач з фермай актыўна ўзводзяцца новыя будынкі, у тым ліку і жыльля дамы. Наяўнасцю незвычайнага аб'екта на такім прынадным кавалачку многія збудоўшчыкі не задаволеныя.

Але вернемся да фермы: як расказала Крыстэль Хэфенбергер, адна з супрацоўніц каманды Moritzhof (у нас пасаду назвалі б педагог-арганізатар), гэта такое месца, куды могуць прыйсці дзеці і займацца ўсім, чым ім захочацца (зразумела, у рамках закона). На ферме жывае мноства свойскіх жывёл — куры, кошкі, свінні, авечкі, козы, коні — іх можна даглядаць; а яшчэ там ёсць проста няўзнача кольсць розных інструментаў — можна нешта майстраваць і будаваць.

Рашэнне аб стварэнні такой фермы было прынята раённым урадам Берліна, яна існуе ўжо каля 20 гадоў. Зараз тут стала працуе чатыры чалавекі, а яшчэ чацвёра выступаюць у ролі валанцёраў. Цікава, што такіх цэнтраў на Берліне некалькі, ёсць таксама месцы і па ўсёй Германіі.

Па сутнасці, гэта варыянт для праваднення вольнага часу пасля школы. Сюды прыходзяць дзеці ад 6 да 16 гадоў, на кожную ўзроставую катэгорыю прадугледжана свая актыўнасць. Для дзяцей гэта ўсё бясплатна: фінансуе ферму той самы раённы ўрад, частка даходаў паступае ад аховяванняў. Дарэчы, выніковую справаздачу па расходах вельмі строга вывучае дзяржава.

Па словах Крыстэль Хэфенбергер, на ферме ўсе дзеці становяцца роўныя. Няважна, колькі зарабляюць бацькі, у якой кватэры жывуць, на якой машыне ездзяць. Сюды прыходзяць дзеці з сем'яў з самым розным дастаткам, але гэта ніяк не ўплывае на іх адносіны.

Яшчэ, на яе думку, такая ферма — гэта выдатная магчымасць для дзяцей расслабіцца. Сёння бацькі ў Германіі імкнуцца нагрузіць дзіця, заняць яго час рознымі справамі (дарэчы, немцы вельмі цікава называюць такіх актыўных мам і татаў — бацькі-верталёты). А тут — свабода і магчымасць рабіць усё, што душа пажадае.

У халодную пару года дзяцей на ферме, натуральна, менш — 20—25 у дзень. Але як толькі пачынаецца пацяпленне, іх колькасць узрастае да 60 у дзень. Ферма адчыняе свае дзверы з панядзелка да суботы, прычым не на вялікі прамежак часу. З чым гэта звязана? Жывёлам таксама патрэбны адпачынак ад людзей.

Вядома, дзяцей кантралююць, аднак гэта не нагляд — у Германіі ёсць разуменне: у першую чаргу за тое, што адбываецца з дзіцем, адказваюць бацькі. Зразумела, што пэўная адказнасць ляжыць на работніках фермы, але, напрыклад, калі дзіця захоча крыху раней пайсці дадому, яго адпусцяць і пры гэтым патэлефануюць бацькам — на гэтым усё.

У любым выпадку ферма — гэта выдатнае месца, якое ў гульнявой форме прывівае дзецям любоў да жывёл, да працы рукамі, у больш шырокім сэнсе — да сельскай гаспадаркі.

Берлінскі палац дзяцей і моладзі

Так, тут усё правільна напісана — адным з пунктаў нашага візіту стаў, як аказалася пазней, фактычны аналаг вядомага сталічнага цэнтра — FEZ-Berlin. Ён быў заснаваны ў 1979-м у ГДР як Палац піянераў. Не, не падобны на наш палац воннака, проста выконвае падобныя функцыі.

У размове з кіраўніком PR-дэпартамента цэнтра Марыён Гузэлай высветліласъ, што плошча будынка, у якім размяшчаецца цэнтр, — 13 тысяч квадратных метраў, а плошча прылеглай паркавай тэрыторыі — 20 гектараў. Ёсць дзе разгарнуцца!

Тут пастаянна праводзяцца мерапрыемствы для сем'яў з дзецьмі ва ўзросце ад аднаго да 14 гадоў, прычым тэмы ўвесь час вар'іруюцца. Колькасць наведванняў таксама ўражвае — у залежнасці ад мерапрыемства ў выхадныя сюды прыходзяць ад дзвюх да дзесяці тысяч наведвальнікаў. Мерапрыемствы платныя, уваходны білет у выхадны дзень — 4 еўра (для шматдзетных — 3,5 еўра). У працоўныя дні сюды прыходзяць групы з дзіцячых садкоў і школ, кошт на групу з 30 чалавек — ад 50 да 80 еўра.

Сапраўды вялікую колькасць вараянтаў правядзення вольнага часу цэнтр прапануе на канікулах. Марыён Гузэла без залішняй сціпласці заявіла, што яны арганізуюць найлепшыя канікулы ў Берліне. Напрыклад, узімку праходзілі дні Гары Потэра, таму ўвесь будынак (успомніце яго плошчу) ператвараўся ў магічную школу Хогвартс, а дзеці сталі яе вучнямі.

Такім чынам яны становяцца дзейнымі асобамі квэсту — збіраюць магічныя камяні, рашаюць розныя задачы.

А летам, напрыклад, праводзіцца буйное мерапрыемства, калі будынак цэнтра і прылеглая тэрыторыя становяцца гарадам: дзеці афіцыйна атрымліваюць ад яго ключ, абіраюць урад, шукаюць працу, ходзяць у банк і супермаркет... Чымсьці нагадвае дзень самакіравання ў беларускіх школах, толькі ў большым маштабе.

Маладзёжная ферма Moritzhof.

А што, калі мала грошай?

Гэта лагічнае пытанне, нават нягледзячы на тое, што многія актыўнасці для дзяцей і моладзі ў Германіі праводзяцца бясплатна. Многія бежанцы, якія прыязджаюць у гэтую краіну, у перашкоду работы цэнтра: вучэнне праз перажыванні, эмоцыі ад таго, што адбываецца. Не сухая тэорыя, а пастаянныя дзеянні.

Унутры цэнтра ёсць мноства спецыялізаваных пляцовак — ад сцэн для выступленняў да ўласнага лячнага тэатра, але найбольшае ўражанне робіць цэнтр касманаўтыкі. Тут ёсць літаральна ўсё: ад трэнажораў для касманаўтаў да рэальнага касмічнага чаўнака.

шую чаргу думаюць не пра тое, як развесяліць дзяцей, а пра тое, як іх пракарміць. Тым не менш, каб дзеці не выпадалі з грамадскага жыцця і ўвесь час развівалася, у Германіі прыдумалі цікавы праект.

Пра яго сутнасць расказаў менеджар Маладзёжнай культурнай службы Гунар Гульднэр: каб падтрымаць малазабяспечаныя сем'і, у краіне ўвялі так званую сямейную карту.

Што яна сабой уяўляе: гэтая невялікая кніга коштам у шэсць еўра, у якой ёсць 300 купонаў, каб атрымаць зніжку на тое ці іншае мерапрыемства. Тыраж кнігі — 50 тысяч асобнікаў. Дарэчы, такую кнігу можа купіць любая сям'я, не толькі малазабяспечаная, але разлік у першую чаргу на іх.

Маладзёжная культурная служба мае каля 500 партнёраў — катакі, басейны, музеі, заапаркі і іншыя ўстановы, дзе можна з карысцю правесці вольны час. Сумесна з імі і стварацоўца купоны.

Цікавая асаблівасць кнігі — 200 латарэй. Купляючы «сямейную карту», кожны атрымлівае магчымасць выйграць наведванне бясплатнага мерапрыемства — напрыклад, схадзіць у тэлестудыю. Самая класная латарэйная пазіцыя — экскурсія ў дацкі горад Білун, у якім знаходзіцца парк забаў Легалэнд.

...І дарэчы, ва ўсіх месцах у Берліне, куды вадзілі беларускіх журналістаў, пастаянна казалі аб планах на будучыню. Імкненне да развіцця, магчыма, галоўная рыса, якая асаблівa прыцягвае ў нямецкай сістэме.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
Фота аўтара,
г. Берлін.

Камунальныя стасункі

Канфеці, акуркі, бутэлькі...

і іншыя паслязімовыя «падарункі» вясновага навядзення парадку

Сёлетні месячнік па добраўпарадкаванні, які пачнецца неўзабаве, будзе скіраваны больш на ўпарадкаванне і азеляненне тэрыторыі, пасадку клумбаў і добраўпарадкаванне дваровых і грамадскіх могілак, чым на ўборку, лічаць сталічныя камунальнікі. Цёплае надвор'е дазваляе прыбіраць зімовыя наступствы ад прыроды і жыхароў раней.

Фота Андрэя СКОЎНІВА.

ПРЫДАРОЖНЫ КАНТРАФАКТ

Ранняя вясна 2019-га дазваляе да пачатку месячніка прыбраць асноўную частку смецця з газонаў і падрыхтаваць дварэ да пасадак дрэў і кветак, хоць раней усё гэта прыходзілася рабіць пераважна, кажуць прадстаўнікі ЖКГ.

Да пачатку вясенняй уборкі майстры абыходзяць тэрыторыю і складаюць план, дзе што трэба адрамантаваць, пафарбаваць і адладзіць. А яшчэ — забаўляюць горад ад несанкцыянаваных шчытоў з рэкламай. Хоць змагаюцца з нелегальнай прапагандай камунальнікі цягам усяго года, новыя заклікі да паслуг, якія не ўзгоднены з уладамі, рэгулярна з'яўляюцца ўздоўж дарог, каля прыпынкаў, ля крам. Тэрмін месцы лічацца самымі праглядаемымі і наведваемымі.

— Такія «рэклямадаўцы» — кожны сам умелец у сваёй справе. Рэкламуюць самыя розныя рэчы: крамы, рамонт абутку, гадзіннікаў, цягнікі ранняга раз'ізда — як правіла, гэта справа дробных прадпрымальнікаў. Некаторыя пасля таго як шчыт прымем, перастаюць самавольна папулярызаваць сябе такім чынам, іншыя пасля папярэджання проста перастаўляюць шчыт у іншае месца, — гаворыць **Алеся САВІЧ, намеснік дырэктара па добраўпарадкаванні ЖКГ № 2 Фрунзенскага раёна Мінска.** — Адносіны я зваліла на рэкламным нумары і прасіла прыбраць шчыт з вуліцы Глебкі. Прыняліі, але літаральна праз пару гадзін я натрапіла на яго на вуліцы Жудро.

Сабраны кантрафакт складзіруецца ў камунальнікаў, і яго можна забрацъ. Штрафаваць пры гэтым ніхто не будзе, аднак лекцыю пра парушэнне такім чынам заканадаўства гора-рэкламшчыкі выслухаць давядзецца. Праўда, прыходзяць па канфіскаваную маёмасць адзінкі, і праз нейкі час шчыты ўтылізуюць, бо захоўваць няма дзе. А збіраецца такой прадукцыі вельмі шмат — 50-60 штук за пару тыдняў. Прыбіраюць яе з вуліц не толькі камунальнікі, але і дарожнікі, і азеляняльнікі.

— Калі падлічыць, колькі каштуе шчыт і мацаванне, а пасля яшчэ і штраф, калі папярэджанне не дайшло, то, пэўна, узгодненая па законе рэклама абышлася б танней, — разважае Алеся Савіч. — Дарэчы, прапаганды паслуг без узгаднення становіцца менш. Бы і тое, што людзі не прыходзяць забірацъ сваю маёмасць, сведчыць: яны ўсведамляюць, што здзейснілі правапарушэнне.

Пакуль мы размаўляем, камунальнікі перакусваюць абцугамі ланцужок, якім чарговы кантрафакт прышпілены да прыдарожнага слупа. На тыдні гэты «ўлоў» далёка не першы.

СІСТЭМА СІТА І РУЧНАЯ ПРАЦА ДЗЕЛЯ ГАЗОНА

Рыхтуючы горад да вясны, займаюцца і варушэннем снежных куч, якія стварыліся пры зімовай уборцы. Калі зляжалы снег раскідаць з гурбаў, ён хутчэй растае, і тады можна спорна вымятаць з клумбаў лісце, акуркі, канфеці і іншае смецце. Часта ў такіх завалах знаходзяць і бутэлькі, і цэлыя пакеты з адходамі.

— Адночы я прыехала на агляд, а мне акурат пад ногі з акна прыляцеў пакет са смеццем. І гэта сведчанне нізкай культуры насельніцтва. Як ужо чалавек прывык рабіць, так будзе і далей дзейнічаць.

Разам з ёй мы назіраем, як камунальнікі-мужчыны лапатамі раскідваюць снег з куч (рэпартаж мы рабілі на мінулым тыдні), а жанчына граблямі выграбае дробнае смецце з участка, дзе раскіданы напярэдадні снег ужо растаў.

— Зараз вельмі спрыяльнае надвор'е для варушэння. Днём гурбы падтайваюць, а ўначы падмарожваюцца, і ўнутры іх з'яўляюцца ледзяшы. Так што сыходзіць яны будуць вельмі доўга. Калі не варушыць, то і да мая даляжаць у цені, чорныя і брудныя. А так атрымліваецца сістэма сіта: снег тае, вада сыходзіць, і застаецца дробнае смецце, якое лёгка сабрацъ, — кажа спецыяліст.

Ад жыхароў заўваг не складзіраваць снег пад вокнамі ўзімку і не варушыць вясной ніколі не было, гаворацъ камунальнікі. Наадварот: чым раней «прыбяруць зіму», тым хутчэй клумбы заквітнеюць, і можна будзе высаджваць кветкі і рабіць нешта па сезоне.

Небяспекі для раслін такі снег таксама не ўяўляе, бо пешаходныя сцежкі, каб яны не ледзянелі, пасыпаюць рэагентамі ўжо пасля таго, як снег счышчаюць з дарогі. Так што нават калі тут і трапляецца «хімія», то ў мінімальнай колькасці.

— Снежныя кучы пасля зімы таксама можна было б пасыпаць рэагентамі, каб яны хутчэй растаралі, аднак тады на гэтым месцы не будзе ні кветніка, ні газона. Таму прыходзіцца таксу цяжкую працу выконваць рукамі, каб захаваць азеляненне тэрыторыі, — заўважае Алеся Савіч.

Ірына СІДАРОК.

❍ У тэму

СЯМЕЙНЫЯ ДРЭВЫ, БАРШЧЭЎНІК І МАЛЫЯ ГАРАДЫ

У межах красавіцкага месячніка Мінск упрыгожыцца 2880 дрэвамі і 19 тысячамі кустоў, сярод якіх, напрыклад, фарзіцыя, шыпшына, туі, ядловец. З больш чым 1,5 мільёна кветак абкружаюць стварыць прыгожыя кампазіцыі і зладзіць вертыкальнае і гарызантальнае азеляненне. На 160 тысячах м² пазбавяцца ад крытычнай ямкавасці, пасля чаго пачнецца плануемы рамонт іншага асфальтавага пакрыцця. На гэтыя і іншыя работы па добраўпарадкаванні сёлета выдзелена 44 мільёны 233 тысячы рублёў, расказала **Валянціна БАРКОЎСКАЯ, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.** Яна ўдакладніла, што сёлета плануецца капітальна адрамантаваць 28 дварэў, збудаваць 103 кантэйнерныя пляцоўкі, адрамантаваць 173 вонкавыя лесвіцы і 35 гектараў газонаў.

А вось прадстаўнікі сталічнага камітэта аховы прыроды асаблівую ўвагу падчас навядзення парадку на зямлі аддаюць наяўнасці несанкцыянаваных звалак на тэрыторыях прадпрыемстваў, прыдарогах і месцах адпачынку, а таксама недапушчэнню захвання другасных матэрыяльных рэсурсаў на палігонах, заznачыў **Сцяпан ДУБНІЦКІ, намеснік старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

— Сярод праблемных пытанняў па-ранейшаму застаюцца нясвоечасовыя меры па падтрымцы зямельных участкаў у належным санітарным стане, нясвоечасовы вывад адходаў і іх складзіраванне ў несанкцыянаваных месцах, — расказаў ён.

У межах Года малой радзімы, якімі аб'яўлены 2018—2020 гады, Міністэрства прыродных рэсурсаў праводзіць экалагічную кампанію «Добраўпарадкуем малую радзіму». Яе сутнасць у тым, што кожнае прадпрыемства і жыхар павінны ўнесці свой уклад у добраўпарадкаванне паркаў, сквераў і дварoў. Прыбрацъ смецце, насадзіць дрэва, зладзіць дзіцячую пляцоўку.

Да 1 чэрвеня ва ўсёй краіне плануюць стварыць паркі сямейных дрэваў. У сталіцы яны з'явяцца ў Фрунзенскім, Першамайскім, Ленінскім і Савецкім раёнах. За жаданне мець уласнае дрэва, прыдзесца заплаціць. У залежнасці ад віду дрэва кошт яго будзе ад 7 да 40—50 рублёў. Упершыню такую паслугу будуць прапаноўваць і ў загсах. Прычым не толькі падчас рэгістрацыі шлюбу, але і пры скасаванні, а таксама пры нараджэнні дзіцяці.

А вось ад баршчэўніка будуць працягваць пазбаўляцца. Яго плошчы ўжо паменьшыліся амаль на 17 гектараў. Цяпер у сталіцы ён сустракаецца на 40,6 гектара. Аднак складанасць у тым, што яго насенне нават праз дзесяць гадоў здольнае прарастаць.

Акрамя таго, штогод у Беларусі праходзіць конкурс па комплексным добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Сёлета камісію асабліва ўразілі менавіта невялікія населеныя пункты краіны. Сярод найбольш руплівых — аграгарадок Белавежскі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці, Буда-Кашалёва ў Гомельскай вобласці, Капыль, Мядзел і аграгарадок Суднікі, што ў Валожынскім раёне на Міншчыне, заўважалъ **Ганна КУДРАВЕЦ, кансультант аддзела горадабудаўніцтва галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:**

— Мы не чакалі, што такія пакаэчыкі будуць у малых гарадах. Такая разнастайнасць у прымяненні сучасных тэхналогій і цікавых рашэнняў архітэктурнага асяроддзя па стварэнні паркаў, сквераў, дзіцячых і спартыўных пляцовак. Толькі гледзячы на карцінку, ужо хочацца там пабываць.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА

Полное наименование: *открытое акционерное общество «УНИВЕРСАМ РИГА»*
Адрес: г. Минск, ул. Сурганова, 50, тел./факс 342–80–15
Ф.И.О. директора: Сушкевич Лариса Францевна
Ф.И.О. гл. бухгалтера: Черкас Ирина Александровна
Основной вид деятельности: *сдача внаем собственного и арендуемого недвижимого имущества*
Единица измерения: *тыс. руб.*
УНП 100299678

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

Наименование	Код строки	На 31 декабря 2018 года	На 31 декабря 2017 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	4702	4804
Вложения в долгосрочные активы	140	184	1
Долгосрочные финансовые вложения	150	5834	5781
ИТОГО по разделу I	**190**	**10720**	**10586**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы (материалы)	210	8	9
Расходы будущих периодов	230	—	—
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	7009	7062
Денежные средства и их эквиваленты	270	79	147
ИТОГО по разделу II	**290**	**7096**	**7218**
БАЛАНС	**300**	**17816**	**17804**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	656	656
Резервный капитал	440	29	29
Добавочный капитал	450	4990	4990
Нераспределенная прибыль	460	9992	9678
ИТОГО по разделу III	**490**	**15667**	**15353**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	1851	2004
ИТОГО по разделу IV	**590**	**1851**	**2004**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	—	—
Краткосрочная кредиторская задолженность в том числе:	630	298	447
по поставщикам	631	4	5
по авансам полученным	632	19	72
по налогам и сборам	633	79	57
по социальному страхованию и обеспечению	634	4	4
по оплате труда	635	11	9
собственнику имущества	637	151	274
прочим кредиторам	638	30	26
Обязательства, предназначенные для реализации	640	—	—
ИТОГО по разделу V	**690**	**298**	**447**
БАЛАНС	**700**	**17816**	**17804**

*Коды строк баланса с нулевыми показателями не печатаются.

Отчет о прибылях и убытках за 2018 год

Наименование	Код строки	Январь-декабрь 2018 г.	Январь-декабрь 2017 г.
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	1397	1197
Валовая прибыль (010–020)	030	1397	1197
Расходы на реализацию	050	(720)	(790)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030–040–050)	060	677	407
Прочие доходы по текущей деятельности	070	—	—
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(35)	(17)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070–080)	090	642	390
Доходы по инвестиционной деятельности	100	6	9549
Расходы по инвестиционной деятельности от выбытия основных средств	110	—	(10184)
Доходы по финансовой деятельности	120	120	—
Расходы по финансовой деятельности	130	(315)	—
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100–110+120–130)	140	(189)	(635)
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	453	(245)
Налог на прибыль	160	(88)	—
Чистая прибыль (убыток) (±150–160±170±180–190–200)	210	365	(245)
Совокупная прибыль (убыток) (210±220±230)	240	365	(245)

*Коды строк с нулевыми показателями **не печатаются.**

Данные отчетности подтверждены:
Аудиторская организация – Индивидуальный предприниматель — МИШИНА Татьяна Александровна, УНП 191172365.

К сведению акционеров ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА»:
ВЫПЛАТА ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ РАБОТЫ ЗА II-ое ПОЛУГОДИЕ 2018 ГОДА будет производиться 8, 9 и 10 апреля 2019 года с 11.00 до 17.00 по адресу: 220040, г. Минск, ул. Сурганова, 50, 2-этаж, бухгалтерия

Открытый аукцион № 25/16/6 по продаже погрузчика вилочного, принадлежащих ООО «Минский дом окон»

Собственник: ООО «Минский дом окон» (находится в процедуре банкротства). Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», адрес: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701
Аукцион состоится 29.04.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701

№ лота	Предмет аукциона	Начальная цена лота, руб.	Сумма задатка (10 %), руб.	Шаг аукциона (5 %), руб.
1	Транспортное средство **Погрузчик вилочный HANGCHA CPCD50N-RXW19**, рег. № 04030, 2012 г.в., кузов №- 120	19 313,14	1931,31	965,66
Порядок проведения	Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере 5 процентов от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе принял участие один участник либо на аукцион явился один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия			
Прием заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. **Последний день приема заявлений — 25.04.2019 до 17.00**			
Задаток	Для участия в аукционе необходимо внести задаток в размере 10 % от начальной цены лота (участник аукциона, желающий участвовать в нем по нескольким предметам аукциона, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой). Банковские реквизиты: - для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70LSAN30124358100130000000 в ЗАО Банк БТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22; - для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) — расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк БТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068. Назначение платежа для открытого аукциона № 25/16/6: «Задаток согласно извещению о проведении аукциона № 25/16/6»			
Затраты	Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Собственника сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения. Победителем аукциона (единственным участником) возмещаются фактические затраты, связанные с организацией и проведением торгов по соответствующему лоту. Фактические затраты по каждому лоту уточнять у организатора торгов			
	1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона. Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона. 3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 5 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 10 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке			
	КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА: +375 (17) 256-61-35 і +375 (17) 213-02-95 і auction@expertiza.by / Игорь Владимирович Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу **http://www.expertiza.by**			

Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 30 апреля 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. руб.)	Размер задатка (бел. руб.)	Расходы по изготовлению документации (бел. руб.)
1	аг. Острошицы, ул. Лесная, 2Б кадастровый номер 623286306601000583	0,1335	Черта населенного пункта Имеются сети: электрификация, водоснабжение, газификация	14 500,00	1450,00	1818,16 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона: 30 апреля 2019 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.
Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 24.04.2019 включительно; к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.
Задаток перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X.
УНН 600537220, код платежа — 04901, получатель — Острошицкий сельский исполнительный комитет.
Условия: победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.
Конт. тел.: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 366 76 48.
Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Спытайце пра радзіннае

ШТО ТАКОЕ КАМАЕДЗІЦА?

«З дзецьмі ў школьным гуртку ладзім адраджэнне цікавых беларускіх абрадаў. Даведалася, што на пачатку вясны на поўначы Беларусі некалі святкавалі Камаедзіцу — у гонар мядзведзя, які прачынаецца. Ці можна даведацца больш падрабязна, які сэнс гэтага свята і калі яго адзначалі», — пытаецца Ганна Герасімовіч з Брэста.

Значнае месца ў старажытных вераваннях і міфалагічных уяўленнях усходнеславянскіх народаў сапраўдны займаў мядзведзь. З аднаго боку, моцная жывёла выклікала захапленне; з другога — здольнасць хадзіць на задніх лапах правакавала параўнанне яго з чалавекам і надзяляла незвычайнай магічнай сілай. Яскравым сведчаннем таго, што мядзведзь некалі быў сакральнай татэмнай жывёлінай, з'яўляецца вялікая колькасць паданняў, легендаў і казак і некаторыя абрады і сакральна-магічныя ўзаемаадносіны чалавека і гэтага магутнага звера.

Прысутнасць вобраза мядзведзя ў вясельных абрадах, у любоўнай магіі, лячэнні бясплоднасці, а таксама ў калядных і масленічных абрадах тлумачыцца тым, што мядзведзь у народнай культуры атаясамліваецца з пладаноснасцю і ўрадлівасцю. Адно з самых распаўсюджаных вясельных пажаданняў гучыць так: «Дарую медзі, каб дзеці былі як мядзведзі». А калі дзяўчына страціла цнатлівасць яшчэ да вяселля, то ў песні гучалі словы пра тое, што яе «задраў мядзведзь».

Зразумела, што такая моцная праяўленасць культу мядзведзя ў міфалагічнай і вуснапаэтычнай спадчыне беларусаў не магла не набыць статусу самастойнага святочна-абрадавага комплексу, у якім рытуальны дыялог чалавека са сваім першапродкам павінен быў маркіравать адпаведную падзею ў структуры традыцыйнага календара. Такое свята на самай справе было зафіксавана ў Доксыцкім раёне (абшары Бягомльшчыны) Віцебскай вобласці. Яно адзначалася 6 красавіка (24 сакавіка па старым стылі), якраз напярэдадні Дабравешчання і атрымала назву — Камаедзіца.

У гэты дзень рыхтавалася асаблівая ежа. На першую страву гатавалі сушаны рэпнік у знак таго, што мядзведзь ужывае пераважна раслінную ежу. Потым падавалі аўсяны кісель, таму што мядзведзь любіць авёс. А вось месца трэцяй рытуальнай стравы займала гарохавая каша, якая разварвалася або ўправала так, што калі яе падавалі на стол, то яна была ў выглядзе камоў (камкоў, камякоў). Менавіта каша і стала асновай для ўзнікнення назвы абраду — «есці камы» — і свята, падчас якога ён выконваўся.

Пасля таго як завяршалася святочная трапеза, усе дамачадцы прымалі ўдзел у выкананні спецыяльнага абраду. І старыя, і маладыя клаліся хто на ложкі, хто на печ, але не адпачывалі і не спалі, а, як адзначалі этнографы, «памінутна самым павольным спосабам перакочваюцца з боку на бок, як мага больш стараючыся прыладзіцца да паварочвання мядзведзя. Цырымонія гэта працягвалася каля дзвюх гадзін, і ўсё гэта робіцца для таго, каб мядзведзь лёгка ўстаў са сваёй зімовай бярлогі».

Даследаванні гісторыкаў культуры і этнографаў сведчаць пра тое, што падобныя абрады, у аснове якіх ляжаць імітацыйная магія, адносяцца да найбольш архаічных і судносяцца па часе ўзнікнення з той эпохай, калі галоўным заняткам старажытнага чалавека было паляванне на звяроў.

Такім чынам, беларускае свята Камаедзіца хутчэй за ўсё адносіцца да самай старажытнай эпохі фарміравання сістэмы светапоглядных уяўленняў у цэлым і структуры традыцыйнага календара, у прыватнасці. І вельмі добра, што такі старажытны абрад, няхай сабе і ў гульнявой форме, атрымае другое жыццё.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця календарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з назнакай «Пра радзіннае».

Фестывалім!

ІДУ НА «КАНТАКТ»

Магілёў з задавальненнем акунуўся ў напружаны тэатральны рытм

На жаль, усё прыемнае калі-небудзь заканчваецца. Вось і цудоўнае свята ў выглядзе міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму «М.@rt.кантакт-2019» сёння развітаецца з Магілёвам да наступнага года.

Вечарам на сцэне лялечнага і абласнога драматычнага тэатраў адбудуцца апошнія спектаклі і прагучаць назвы пастановак, якія, па версіі прафесіяналаў і асобна маладых тэатралаў, могуць прэтэндаваць на званне «Падзея форуму». Будзе таксама названы спектакль, які атрымае прыз глядацкіх сімпатый. Пасля прагляду пастаноўкі кожны ахвотны можа прагаласаваць сваім білетам, апусціўшы яго ў адмысловую скрыню. Па традыцыі свае меркаванні гледачы могуць выказаць і на сцяне форуму, якая ўстаноўлена ў фае драматычнага тэатра. Там, дарэчы, ужо практычна не засталося вольнага месца.

На сцэне лялечнага тэатра «ГЭТАМЫ». «Паляванне на сябе» і «Яна яго кахала», сацыяльны рэйв-бэнд «ЦэШо» ўкраінскага Цэнтра сучаснага мастацтва «Дах» — яшчэ спатрэбіцца час, каб усё гэта асэнсаваць і пераварыць. А як пранізліва і тонка перадала свае пачуцці непаўторнальная Нарынэ Грыгаран у монаспектаклі «Мая сям'я ў маім чамадане». У аснове яго споведзь гераіні пра жахлівы эпізод з яе жыцця падчас вяснаванага карабахскага канфлікту, калі яна была яшчэ школьніцай. Магілёву пашчасціла ўбачыць рэжорднаю колькасць пастановак паводле вядомых нам яшчэ з школьнай праграмы класічных твораў Чэхава, Гогаля, Мальера, Шэкспіра, але ў сучасным прачытанні. Кагосьці тэма парадавала, кагосьці, наадварот, расчаравала. Нават строгія тэатразнаўцы разышліся ў ацэнцы «Тарцюфа», якога прывёз вядомы тэатр «Майстэрня» з Санкт-Пецярбурга. Маладыя крытыкі былі больш катэгарычныя ў сваіх выказваннях, а старэйшыя дыпламатычна адзначалі, што рэжысёр Рыгор Казлоў нічога проста так не робіць. Але ўсе адначалосна пагадзіліся з тым, што сцэнаграфія зроблена вельмі добра. Шмат кампліментаў атрымаў спектакль магілёўскага лялечнага тэатра «Кандыд, або аптымізм» Ігара Казакова. Для мяне Нарына і «Кандыд» пакуль што фаварыты форуму. Што, на жаль, не скажаш пра беларускія спектаклі на малой сцэне. Яны мяне не зачапілі.

Анастасія прызналася, што вельмі чакае спектакль Стаса Жыркова «Гэта ўсё яна», які якраз сёння пройдзе на сцэне лялечнага тэатра.

— Ён быў напісаны ў лабараторыі Цэнтра беларускай драматургіі сумесна з Андрэем Іванавым, мне здаецца, што гэта таксама будзе вельмі цікавае адкрыццё.

Фестывальныя дні былі насычаны калятэатральнымі падзеямі. Адбыліся майстар-класы, прэс-канферэнцыі, творчыя сустрэчы, выстаўкі. Форум цікавы яшчэ і тым, што дае магчымасць не толькі паглядзець, але і абмеркаваць спектакль. Творчая майстэрня, дзе можна было паслухаць, што думаюць людзі пра ўсе гэтыя тэатральныя эксперыменты, працавала нават у выхадныя. І гэта было цудоўна, бо вельмі цікава параўнаць адчуванні прафесіяналаў з глядакімі.

Форум прайшоў 14-ы раз, і гэта яскравае сведчанне таго, што ён знайшоў сваё месца на фестывальнай афішы Беларусі. Яго чакаюць і з ім лічацца. Пра гэта на адкрыцці форуму казалі і міністр культуры Юрый Бондар, і намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч. Гэтая тэатральная падзея запатрабаваная, а значыць, у яе ёсць будучыня.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота Сяргея КАРПЯКОВА.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, офис 5
Продавец	ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30)
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО»
(регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 4 января 2019 г.).
Состав имущества и имущественных прав см. на сайте www.cpo.by

Месторасположение производственной базы –
Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины

Начальная стоимость без НДС – 160 746,88 бел. руб.
Шаг аукциона без НДС – 8 037,344 бел. руб.

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60LBBS30120191021390001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи	15 (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 2 % от итоговой цены продажи предмета электронных торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата, время и место проведения электронных торгов: 02.05.2019 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**). Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени, для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае непрохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн.

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация), в т. ч. переплочения задатка: 29.03.2019 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов: открытое акционерное общество «Строительный трест № 8», 224028, Брестская область, г. Брест, ул. Гоздецкого, 12, факс 56 30 14, +375 162 54 83 94, +375 162 54 84 04.
Оператор электронной торговой площадки: ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
Торги проводятся 14.05.2019 на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by. **Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

№ лота	Наименование предмета торгов; его место-нахождение	Краткая характеристика	Начальная цена лота, бел. руб. без НДС	Сумма задатка, бел. руб. без НДС
1	Технологическая линия VST для производства конструкций по технологии несьемной опалубки; Брестская обл., г. Брест, ул. Гоздецкого, 12	Объект представляет собой комплект-ную линию по производству несьем-ной опалубки из цементно-стружечных плит. Запатентованная VST-СИСТЕМА (это система несьемной опалубки, состоящей из цементно-стружечных плит (ЦСП) толщиной 24 мм, соединенных в заводских условиях в готовые элемен-ты. Технология разработана компанией Verbundschalungstechnik Gesmbh (VST, Австрия). Объект является специализи-рованным нестандартным оборудова-нием. Производительность непрерыв-ного производства — 120 м² стеновых панелей в смену (8 часов) и 100 м² панелей перекрытия в смену (8 ча-сов). Занимаемая площадь — 4000 м². Необходимое рабочее давление — 6 бар. Необходимое напряжение в сети — 3-фазная сеть 380 В. Комплектность: 1) устройство для поднятия плит, инв. № 3252; 2) линия VS , инв. № 3253; 3) линия VST, инв. №3254; 4) двухуров-невый монтажный стенд, инв. № 3255; 5) двухуровневый монтажный стенд, инв. № 3256; 6) устройство для резки, фрезировки, обработки плит, инв. № 3257; 7) транспортировочный контей-нер, инв. № 3258; 8) устройство для подъема плит, инв. № 3259; 9) раскроечный станок VST CUT 2010/2, инв. № 3260; 10) пила VST, инв. № 3261; 11) сварочный автомат VST, инв. № 3262; 12) транс-портировочный контейнер, инв. № 3263; 13) транспортировочный контейнер, инв. № 3264; 14) раскроечный станок VST CUT 2010/1, инв. № 3265	3 696 000,00	184 800,00

Продавец:
ОАО «Строительный трест № 8», 224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, 12; тел. +375 162 50 88 18, 8 (029) 170 18 30.

Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – 04.05.2019, до 15:00.
Задаток для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000068940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
Срок внесения задатка – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка для участия в электронных торгах ред. № ____ по заявлению № ____.
Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
Сроки возмещения затрат на организацию и проведение торгов:
Победитель (единственный участник) торгов в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.
Сроки и условия заключения договора:
Срок подписания договора купли-продажи имущества – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов

Пакінуць нельга рataваць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Мсціслаўскім раёне — 22 помнікі архітэктуры і 56 помнікаў археалогіі. Сярод іх — паўразбураная Анфрыеўская царква ў вёсцы Сялец, пажарная каланча, езуіцкі касцёл, былая мужчынская гімназія і драўляны лямус, якія па дакументах з 2013 года належаць Мсціслаўскаму археалагічна-краязнаўчаму музею. Большасць будынкаў у запушчаным стане, а ўстанова — бюджэтная і зусім не багатая.

Нельга сказаць, што тутэйшы ход абыкаваны да праблемы. Каго на вуліцы ні спыні — усё раскажуць і пакажуць. Не толькі словам, але і справай дапамагаюць. Так, адзін гараджанін зладзіў дабрачынны канцэрт, а грошы, атрыманыя ад продажу білетаў, перавёў на рахунак мясцовага фонду «Адраджэнне гісторыка-архітэктурных помнікаў Мсціслава». Дарэчы, за год на яго паступіла больш за адзінаццаць тысяч рублёў.

Калі ў інтэрнэце праглядзець апошнія навіны, звязаныя з захаваннем архітэктурнай спадчыны Мсціслава, то абавязкова знойдзеш відэаролікі блогера Дзяніса Касцюкевіча. Малады чалавек праслаўся, запісваючы звароты па Міністэрства культуры з просьбамі выдатковаць сродкі на рэстаўрацыю касцёла ў родным горадзе.

Мы пачалі пісаць лісты ў Міністэрства культуры значна раней і нават дабіліся таго, што касцёл уключылі ў пералік помнікаў, якія могуць фінансавацца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Неаднаразова звяталіся ў аблвыканкам, у іншыя інстанцыі і арганізацыі паведамлялі аб стане аб'екта, адпраўлялі лісты па райвыканкамах з просьбай аб размяшчэнні на сваіх сайтах рэквізітаў дабрачыннага, — дзеліцца **дырэктар музея Людміла КІРЫЛЕНКА.** — Не лепшая сітуацыя з кармеліцкім касцёлам, які з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і катэгорыі. Ён стаіць у спісе на фінансаванне даўно, але пакуль мінімум разводзіць рукамі, тлумачачы: «У рэканструкцыі, іх необходна завяршыць. Інакш пачнем паўсюль, а скончыць ніадзе не зможам».

Музейшчыкі робяць усё, што ў іх сілах: займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі, прылеглых да будынкаў, і праводзяць шыкоўныя экскурсіі па горадзе, якія, на жаль, не пазбаўленыя сумных нотак.



Кармеліцкі касцёл таксама доўга не працягне без належнай рэканструкцыі.

Два з паловай мільёны і спадзяванні

— Будынак былога езуіцкага касцёла не эксплуатуецца каля пяцідзесяці гадоў. У канцы 80-х у ім распачалі рэканструкцыю, але Савецкі Саюз разваліўся, грошы зніклі і праект згарнулі. З таго моманту ніякіх работ не вялося, — расказвае **намеснік старшыні райвыканкама па пытаннях развіцця будаўнічага комплексу, архітэктуры, жыллёвай і камунальнай гаспадаркі Віталь ШМАТАЎ.**

Мсціславу пашчасціла і не пашчасціла адначасова. З аднаго боку, у горадзе захавалася столькі архітэктурных помнікаў. Вялікая ўдача для правінцыйнага гарадка! З іншага, усё гэтае харасціо трэба трымаць у належным стане, што бюджэт райцэнтра, вядома, сам пацягнуць не можа. Адкуль возьмуцца грошы ў раёне, які, паводле статыстыкі, адзін з самых небагатых у краіне?

— Пра рэстаўрацыю касцёла гаворка не ідзе. Зараз задача — зняць аварыйнасць будынка і захансераваць у тым выглядзе, які маем на дадзены момант. Праектаваннем займаецца «Магілёўгрtoмадзянпраект», выканаўца — будтрэст № 12 Магілёўскага УКБ. Акрама таго, працэс курыруе спецыяліст з «Белрэстаўрацыі». Каб да пачатку асноўных работ сцены касцёла «не паехалі», там усталявалі часовыя драўляныя падпоркі. У інтэрнэце «добрыя каментатары» пачалі пісаць пра банер, якім нядаўна абнеслі будынак. Маўляў, такім спосабам мы імкнёмся схаваць праблему. Гэта не так. Банерная сетка не дае адскочыць асобным цаглінкам і аскепкам на галаву мінакам, — тлумачыць Віталь Шматаў. — Ужо ў гэтым годзе плануецца ўзмацніць фундамент, зрабіць жорсткі каркас унутры і «сцягнуць» сцены, падлатаць дах. Ёсць у будынку элементы, якія аднавіць немагчыма, таму іх прыбудзецца прыбрадь.

— Сцяна аббалілася ў канцы 2017-га, а пастанова на абласным узроўні аб прыняцці змяшчэнні выканаўца работ было прынята толькі ў верасні. Чаго так доўга чакалі?

— Гэта гісторыка-культурная каштоўнасць. Як бы ні хацелася паскорыць працэс, без дазволу спецыялістаў мы не маем права нічога чапаць. Абследаванне, складанне рэкамендацый, першасная ачыстка завалаў — усё патрабуе часу, — тлумачыць спадар Шматаў. — Праблема не толькі ў тым, што мы губляем архітэктурны помнік. У адным дварэ з касцёлам — будынкі музычнай школы і цэнтра дзіцячай творчасці. Пакуль яго не закансервуюць, побач знаходзіцца небяспечна. Зараз навучэнцаў «раскідалі» па горадзе, спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час яны вернуцца ў свае класы. На ўсё пра ўсё нам спатрэбіцца 2,5 мільёна рублёў. Пэўную суму выдаткавалі аблвыканкам. Зараз спадзяёмся на станоўчы адказ з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва.

Слова эксперту

Езуіцкі храм быў пабудаваны ў 1750-х гадах, а карміліцкі — у 1760-х. **Старшы навуковы супрацоўнік аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Андрэй МЯЦЕЛЬСКІ** зараз якраз працуе над кнігай, прысвечанай касцёлам Мсціслаўскага ваяводства. У канцы 80-х гадоў кандыдат гістарычных навук меў дачыненне да рэстаўрацыі кармеліцкага храма, а пасля таго як фінансаванне зніклa, вымушаны прыглядваць за ім збоку. Навуковец метафарычна называе мсціслаўскія касцёлы «хворымі» і кажа, што лячэнне ім патрэбна тэрмінова. Праўда, у цудоўнае выратаванне езуіцкага храма ён не верыць: «Памрэ, так і не дачакаўшыся хуткай дапамогі».

— Я быў унутры езуіцкага касцёла за чатыры месяцы да абрушэння. Ужо тады было зразумела, што вось-вось ён складзецца, быццам картачны домік. Дах працякаў дзесяцігоддзямі, а вада, як вядома, камень точыць. Акрама таго, склалася ўражанне, што ў касцёле мелі месца «чорныя раскопкі». Скляпенні падвалаў былі па-варварску прабітыя чалавекам — пры натуральных абрушэннях зямля ляжыць зусім не так, — дзеліцца Андрэй Анатолевіч. — Сёння пра поўнае адначленне езуіцкага касцёла ніхто не кажа. Але ці загаворыць пра яго пасля? Праблема не толькі ў адсутнасці грошай. Фактычна ніхто не бачыць патрэбы ў гэтым будынку з практычнага пункту гледжання. Відома, што проста так грошы ў рэстаўрацыю ўкладваца не будуць. З самага пачатку павінна быць канцэпцыя далейшага выкарыстання. Будынак вялізны, а Мсціслаў не Магілёў — нацыянальнага ўсяго дзесяць тысяч жыхароў. Не зробіш канцэртную ці выставачную залу, а каталіцкая парафія на самым усходзе Беларусі зусім маленькая, ім хапае карміліцкага храма. Ён, дарэчы, таксама даўно патрабуе працяжу сур'ёзнай рэстаўрацыі. Там бяда была з першага дня. Касцёл будавалі на рагу паміж двух яроў, што моцна паслабіла канструкцыю, і ўжо ў XIX стагоддзі скляпенні пачалі «трашчаць». Тады яры засыпалі, чым крыху прытармазілі працэс, але арыгінальныя каменныя скляпенні ўсё роўна абвалілісь, і замест іх паставілі драўляныя. А мы ў свой час заліваві бетонныя. Дарэчы, так яны з 1991-га ў апалубках і стаяць.

На словах навукоўца, багатыя фрэскі карміліцкага касцёла — неверагодны культурны скарб. Тут евангельскія сюжэты і выявы святых пераплятаюцца з роспісамі, прысвечанымі гісторыі горада. Напрыклад, «Узяцце Мсціслава рускімі войскамі» і «Трубяцкая разня». Першая фрэска мае шматфігурную кампазіцыю, складаныя калеравыя пераходы і, што асабліва каштоўна, — мы бачым гарадскую панараму. Другая выява паказвае ўварванне ў горад князя Трубяцкога. Цікава, што менавіта гэтыя фрэскі збераглі касцёл ад разбурэння ў часы атэізму.

— Літоўскія гісторыкі, мастацтвазнаўцы і архітэктары любяць паказваць у сваіх кніжках здымак карміліцкага касцёла ў Мсціславе як «самы ўсходні помнік у стылі віленскага барока», — зазначае Андрэй Мяцельскі. — Яны маюць рацыю. Але для беларусаў гэтыя будынкі — яшчэ і самыя старыя архітэктурныя аб'екты, якія захаваліся ў задняпроўскай частцы Магілёўскай вобласці. Бяк чаму ж замежнікі высока ацэньваюць іх, а мы так нядбайна абходзімся?

Напрыканцы зноў хочацца звярнуцца да Каратквеіча, які марыў, што аднойчы Мсціслаў стане «горадам-музеем і тым дасць прыклад на стварэнне яшчэ некалькіх». Варта зазначыць, для ўвасаблення задумы пісьменніка ў жыццё тут робіцца нямала: тры гады таму да абласных «Дажынак» адрэстаўравалі пажарную каланчу (таких у Беларусі ўсяго тры: тут, у Гродне і ў Полацку), а таксама адналілі праваслаўную Траецкую царкву ў цэнтры горада. На тэрыторыі раёна знаходзіцца знакамітыя Пустынскі Свята-Успенскі манастыр, які паступова выходзіць са стану запусцення і падымаецца з руін. На Замкавай гары з небяшця паўстаў цуды драўлянай горад: археолагі знайшлі рэшткі старажытнага Мсціслава XII—XIII стагоддзяў. Але ж колькі працы яшчэ наперадзе. Уладзімір Сямёнавіч гэта прадбачыў, таму і пісаў: «...Аднаму раёну гэтага не ўзяць. [...] Дапамагчы б ім яшчэ зберагчы, не запаскудзіць, утрымаць у прыгажосці слаўнае сваё мінулае».

Ганна КУРАК,
фота аўтара.
Мінск — Мсціслаў — Мінск.

Будынкі езуіцкага комплексу стаяць сцяной да сцяны. Абваліцца адзін — пацягне за сабой астатнія.

Информация о совершении сделки, в отношении которой имеется заинтересованность аффилированных лиц эмитента:
- полное наименование и местонахождение эмитента:
открытое акционерное общество «Амкодор-КЭЗ», 211060, ул. Промышленная, 3, промышленная зона, г. п. Коханово, Толочинский район, Витебская область, Республика Беларусь;
- дата принятия решения о совершении сделки: 25 марта 2019 года;
- вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок): договор купли-продажи;
- стороны сделки (каждой из взаимосвязанных сделок): открытое акционерное общество «Амкодор-КЭЗ» (продавец) и производственное унитарное предприятие «Амкодор-ДОМЗ» (покупатель);
- предмет сделки: купля-продажа основных средств — оборудования в количестве трех единиц;
- критерии заинтересованности в соответствии с частью первой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» лиц, указанных в абзацах втором—четвертом части седьмой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах»: отсутствуют;
- сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок): 3 181,20 руб., в т. ч. НДС 530,20 руб.;
- балансовая стоимость активов (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении такой сделки (стоимости активов): на 01.01.2019 — 23 310 тысяч рублей.

УНП 300028841

Информация о совершении сделки, в отношении которой имеется заинтересованность аффилированных лиц эмитента:
- полное наименование и местонахождение эмитента:
открытое акционерное общество «Амкодор-КЭЗ», 211060, ул. Промышленная, 3, промышленная зона, г. п. Коханово, Толочинский район, Витебская область, Республика Беларусь;
- дата принятия решения о совершении сделки: 25 марта 2019 года;
- вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок): договор купли-продажи;
- стороны сделки (каждой из взаимосвязанных сделок): открытое акционерное общество «Амкодор-КЭЗ» (продавец) и общество с ограниченной ответственностью «Амкодор-Брянск», РФ (покупатель);
- предмет сделки: купля-продажа основных средств — оборудования в количестве четырех единиц;
- критерии заинтересованности в соответствии с частью первой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» лиц, указанных в абзацах втором—четвертом части седьмой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах»: отсутствуют;
- сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок): составляет 674 645,23 российского рубля, в том числе НДС 0 %;
- балансовая стоимость активов (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении такой сделки (стоимости активов): на 01.01.2019 — 23 310 тысяч рублей.

УНП 300028841

Зялёныя ЭкаДамы-башні, блакіт акіяна, прагулачныя паруснікі — заўтрашні дзень планеты Зямля?

ТАЛЕНАВІТЫ ВЫНАХОДНІК З ПАЛЕССЯ

«Мы павінны мысліць смела і прымяняць рашэнні, якія яшчэ ўчора здаваліся немагчымымі»

У сярэдзіне красавіка будзе святкаваць свой юбілей наш зямляк, знакаміты інжынер і нястомны вынаходнік Анатоль ЮНІЦКІ, правадзейны член (акадэмік) Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук (РАЕН, 1999 г.) і Рускай акадэміі навук і мастацтваў (РуАН, 1998 г.), вучоны ў галіне транспартных сістэм — доктар філасофіі транспарту (2002 г.), член Федэрацыі касманаўтыкі СССР (1986 г.), лаўрэат Славацкай Прэміі міру (2018 г.).

Наша газета двойчы даволі падрабязна расказвала пра інавацыйную транспартную тэхналогію SkyWay («Нябесны шлях») — незвычайны праект Анатоля Эдуардавіча, што не мае аналагаў у свеце і можа стаць самым грандыёзным у XXI стагоддзі. Коратка паўторымся: транспартныя сродкі SkyWay перамяшчаюцца над зямлёй, на бяспечным «другім узроўні», па спецыяльнай рэйкава-струннай эстакадзе, пры ўзвядзенні якой спатрэбіцца істотна менш будаўнічых матэрыялаў, чым на будаўніцтва чыгунак ці асфальтаваных дарог. Па эстакадзе рухаюцца рэйкавыя аўтамабілі на стальных колах, аснашчаныя супрацьсходнай сістэмай і інтэлектуальнай сістэмай бяспекі і кіравання. Лёгкія і кампактныя юнікары і юнібайкі прывозіць у дзеянне матор-кола, як і высакаскоснага юнібусы з надзвычай высокімі аэрадынамічнымі якасцямі. Падмацаваная патэнтамі і дыпломамі сусветных галіновых выставак, сістэма дазваляе ажыццяўляць пасажырскія і грузавыя перавозкі любых аб'ёмаў. Пры гэтым спецыялісты фірмы-распрацоўшчыка падчас гутаркі з журналістамі падкрэсліваюць: інавацыйная транспартная тэхналогія SkyWay з'яўляецца найбольш эканамічнай, экалагічнай і бяспечнай з усіх вядомых транспартных сістэм і здольная эфектыўна вырашыць праблемы перавозак людзей і грузаў не толькі ў гарадах і рэгіёнах, але і паміж краінамі і кантынентамі. А з цягам часу і на планетарным узроўні.

Толькі адзін прыклад з нашага жыцця. Дарога ад заходняй граніцы Беларусі да расійскай сталіцы на камфартабельных юнібайках зойме не 13—14 гадзін, як цяпер цягнікамі, а толькі каля дзвюх гадзін. Не выпадкова новыя тэхналогіі SkyWay на адной з выставак у Белакаменнай выклікалі цікавасць Дзмітрыя Мядзведзева, у той час прэзідэнта Расіі.

Агульнапланетарны транспартны сродак, сумешчаны з транспартнай сістэмай SkyWay (візуалізацыя).

Анатоль ЮНІЦКІ: «Струнны транспарт на Зямлі — гэта факт. Струнны транспарт у космасе — задача ўжо заўтрашняга дня, ад рашэння якой залежыць, ці будзе ў зямной цывілізацыі будучыня».

Сусветнае прызнанне

СЛАВАЦКАЯ ПРЭМІЯ МІРУ АНАТОЛЮ ЮНІЦКАМУ

Зусім нядаўна, 11 снежня 2018 года, у сталіцы Славакіі Браціславе адбылася цырымонія ўзнагароджання Анатоля Юніцкага міжнароднай Прэміяй міру, другой па сваёй значнасці пасля Нобелеўскай прэміі міру. Яна ўручаецца выдатным навуковым і грамадскім дзеячам, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё чалавечай цывілізацыі.

Пры ўручэнні яму Прэміі міру Анатоль Юніцкі зазначыў:

«Для меня вялікі гонар быць узнагароджаным Славацкай Прэміяй міру. Хачу падзякаваць камітэту прэміі за высокую ацэнку маёй працы ў галіне стварэння інавацыйных транспартна-інфраструктурных тэхналогій. Асабліва важным у гэтай сувязі лічу міжнародны фармат прэміі, што адпавядае маштабам тых задач, вырашэнню якіх прысвечана ўсё маё жыццё — больш за 40 гадоў.

Мы павінны мысліць смела і прымяняць рашэнні, якія яшчэ ўчора здаваліся немагчымымі. Калі для выратавання планеты нам патрэбна будзе стварыць альтэрнатыву аўтамабілю — гэта неабходна зрабіць ужо зараз, а не адкладваць на заўтра. Бо аўтамабілі, у тым ліку электрамабілі, штогод забіваюць на планеце каля 1,5 мільёна чалавек, больш за 10 мільёнаў робяць інвалідамі і калекамі, і каб дагадзіць ім, ужо «закатаны» ў асфальт глебы на тэрыторыі, роўнай плошчы дваццаці Славакій.

Калі для забеспячэння ўстойлівай будучыні прамысловасць трэба вынесці на калязямную арбіту — распрацоўкі ў гэтым кірунку таксама неабходна пачынаць як мага хутчэй.

Рэфармаванне транспартна-інфраструктурнай сферы планеты, у тым ліку геакасмічнай, павінна стаць асновай для якасных змен, і мае інавацыйныя распрацоўкі могуць забяспечыць неабходны фундамент для іх.

За апошнія гады праект струннага транспарту SkyWay — самага экалагічнага і бяспечнага спосабу перамяшчэння з усіх калі-небудзь створаных — здзейсніў вялікі скачок у развіцці і ўшчыльную наблізіўся да рэалізацыі. Транспартнымі комплексамі, заснаванымі на маіх напрацоўках, ужо цікавяцца ўлады многіх краін па ўсім свеце. Гэта сведчыць аб тым, што пытанні ўстойлівага развіцця і экалогіі не толькі не страчваюць сваёй важнасці, але і становяцца ўсё больш актуальнымі».

❍ Даведка

Прэмія існуе з 2015 года, і сярод яе лаўрэатаў, напрыклад, Хасэ Анхель Гурыа — адзін з найбуйнейшых у свеце фінансістаў, генеральны сакратар Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Дарэчы, летась было 12 намінантаў — кароль Бутана, генерал дэ Голь і іншыя прыкметныя ў сусветнай палітыцы і эканоміцы фігуры. Перамогу прысудзілі нашаму земляку. Кантэкст быў такі: «Юніцкі дае чалавецтву шанц выжыць».

На ўрачыстасці прысутнічалі міністр абароны Славакіі, паслы Расійскай Федэрацыі і Кітая, а таксама навукоўцы і палітыкі, паспяховыя прадпрымальнікі.

Асноўай гэтай кнігі з'яўляецца манаграфія Анатоля Юніцкага «Струнныя транспартныя сістэмы: на Зямлі і ў космасе». Упершыню кніга выйшла ў свет у 1995 годзе. Пашыранае аўтарам і багата ілюстраванае навуковае выданне выходзіла ў 2017 годзе і вось зараз, у 2019-м.

з першых вуснаў

«БЕЛАРУСКІЯ ЭЛЕКТРАМАБІЛІ БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНЫЯ ЗА «ТЭСЛУ»

Гутарка з юбілярам на фоне несумненных поспехаў, у якіх тым не менш сумняваюцца

Гісторыя станаўлення асобы Юніцкага як навукоўца пачыналася ў Беларусі. З кароткімі перапынкамі на Казахстан, Расію і шэраг іншых краін потым зноў прадоўжылася на радзіме.

Каб падрабязна расказаць яе, спатрэбіцца кніга. Дарэчы, такая кніга ёсць. А ў нас месца толькі на штрыхі. Бо важна спыніцца на галоўным, найбольш рэальным сёння і ў хуткім часе запатрабаваным. Калі пакуль што не на радзіме, то ў краінах, найбольш прасунутых у сэнсе ўспрымальнасці да парадаксальных навацый навукова-тэхнічнага прагрэсу і больш багатых.

— Цяга да вынаходніцтва абудзілася ў вас, відаць, калі жылі ў Казахстане, непадалёку ад Байканура? Паўплываў Байканур?

— Значна раней. Мне было гадоў 5-6, калі пачаў рабіць першыя ракеты. Яшчэ ў Беларусі, у вёсачцы сваёй, у камарынскіх Кругах, дзе цяпер самая «злосная» чарнобыльская зона. І так гэтым захапіўся, што шукаў любую магчымасць. Тады кіно ў вёску вазілі кінаперасоўкамі, фільмы былі на шырокіх плёнках, якія часта рваліся, і іх выкідвалі цэлымі кавалкамі. Яны цудоўна гарэлі, і нехта выкарыстоўваў для «дымароў», як і грабеньчыкі. А я — для ракет. Калі мне было гадоў сем, то знайшлі раскіданыя па лесе скрыні з нямецкім порахам. «Макароніны» бяздымнага пораху сталі самым лепшым палівам для ракет. Мае захапленні не былі бяскрыўдныя, аднаго разу ледзьве не спаліў хату. Ужо тады я задумваўся, як лепш пабудаваць сваю дзіцячую ракету з фольгі, куды скіраваць соплы для большай дальнасці палёту і гэтак далей, канструяваў, адным словам.

Калі пераехалі жыць у Казахстан, пра поспехі краіны ў асваенні космасу я ўжо ведаў, і гэта надавала асаблівага стаўлення. Падыходзіў да свайго захаплення больш сур'ёзна, пачаў чытаць спецыяльную літаратуру. Пораху з нямецкіх складоў не было, давялося вынаходзіць самому. Атрымаўся адзін з варыянтаў дымнага пораху, кампаненты якога купляў у аптэцы і гаспадарчым магазіне. Вагі таксама зрабіў з падручнага матэрыялу, гіркамі служылі манеткі. У 9—10 класах рабіў ужо ракеты, якія ўзляталі на вышыню два-тры кіламетры. І першую ў сваім жыцці ўзнагароду — ганаровую грамату Джэзказганскага райкама камсамола — атрымаў школьнікам за мадэль дзеючага ракетадрома.

Вось калі я стаў на поўным сур'ёзе займацца вынаходніцтвам — рабіў паліва, канструкцыйныя матэрыялы, саму канструкцыю ракеты, піропатрон, партатыўны парашут, які раскрываўся. Эксперыменты не заўсёды былі ўдалыя, давялося лячыць у бальніцы абпалены твар. Такія былі мае ўніверсітэты.

— Пазней вы атрымалі адукацыю інжынера шляхоў зносін...

— Але цяга да вынаходніцтва нікуды не знікла, творчасць стала законам жыцця. Калі мець на ўвазе галоўныя этапы, то стварыў аптымальную і экалагічна чыстую сістэму для выхаду ў космас. У 1977 годзе падаў заяўку на Агульнапланетарны транспартны сродак. І сустрэў магутнае супрацьдзеянне сістэмы. Спачатку было «Вы не ўлічваеце ўплыў Месяца». Даказаў, што ўлічваю. «Вы не ўлічваеце сонечны вецер». Пераканаў, што і пра сонечны вецер не забыўся. «Не ўлічваеце, што Зямля не з'яўляецца ідэальным шарам з неаднародным гравітацыйным полем... І потым — не хопіць энергіі, бетону, металу...» І гэтак далей. Прыводзіў разлікі, якія разбівалі такія аргументы, але знаходзіліся новыя, не менш абсурдныя.

У тыя гады па агульнапланетарным сродку Юніцкі арганізаваў і правёў міжнародную канферэнцыю, гранд выдзеліў Савецкі камітэт абароны міру. Адначасова апублікаваў у саюзным друку артыкул «Выратавальны круг планеты».

У 1986 годзе Анатоль Эдуардавіч стаў членам Федэрацыі касманаўтыкі СССР. Узначаліў секцыю нераектнага асваення космасу. У 1988 годзе пры падтрымцы Федэрацыі касманаўтыкі і Савецкага фонду міру правёў у Гомелі з дапамогай абкама камсамола і Інстытута механікі металапалімерных сістэм НАНБ, у якім працаваў, міжнародную навукова-практычную канферэнцыю па праблемах нераектнага асваення космасу. На яе сабраліся 500 чалавек з усяго свету, што сведчыць аб вартасці ідэі. Прысутнічалі чатыры касманаўты.

Штрыхі біяграфіі

У АРЭАЛЕ БАЙКАНУРА

Нарадзіўся Анатоль Эдуардавіч 14 красавіка 1949 года на беларускім Палессі. А сярэднюю школу скончыў у Карагандзінскай вобласці Казахстана, куды пераехала сям'я.

Выпускнік Беларускага політэхнічнага інстытута. Другую вышэйшую адукацыю атрымаў па спецыяльнасці «Патэнтнае права і вынаходніцтва». Працаваў кіраўніком патэнтна-ліцэнзійнай службы Інстытута механікі металапалімерных сістэм Акадэміі навук БССР (г. Гомель), вядучым інжынерам вытворчага аб'яднання «Карал».

У 1986 годзе стаў членам Федэрацыі касманаўтыкі СССР з праектам нераектнага транспартнага сродку для выхаду ў космас, аснову якога склалі струнныя тэхналогіі. Старшыня грамадскага камітэта па праблемах безрэактных транспартных касмічных сістэм, аўтар і распрацоўшчык праекта па безрэактным асваенні космасу з дапамогай Агульнапланетарнага транспартнага сродку (АТС).

Па гранце Савецкага фонду міру арганізаваў у Гомелі Цэнтр навукова-тэхнічнай творчасці моладзі «Зорны свет». З гэтага часу стварыў разнастайныя навуковыя структуры ў Беларусі, Расіі і іншых краінах для фінансавання навукова-тэхнічных распрацовак.

У сакавіку 1996 года струнная транспартная сістэма была разгледжана на пасяджэнні камісіі вучонага савета Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта шляхоў зносін. Экспертызу ажыццяўлялі сем дактароў і 10 кандыдатаў тэхнічных навук, у тым ліку тры акадэмікі Акадэміі транспарту РФ. Эксперты прызналі актуальнасць, арыгінальнасць і тэхнічную мэтазгоднасць струннай транспартнай сістэмы і яе тэхніка-эканамічную эфектыўнасць.

У 1998 і 2001 гадах кіраваў праектамі ААН па сваёй тэматыцы.

У 2002 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на тэме «Струнныя транспартныя сістэмы — новыя тэхналогіі ў наземным транспарце» ў Міжнародай акадэміі інфармацыйных тэхналогій. Навуковым кіраўніком работы з'яўляўся акадэмік, віцэ-прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. С. Высоцкі, знакаміты генеральны канструктар Мінскага аўтамабільнага завода.

Аўтар больш чым 140 вынаходніцтваў, 29 з іх рэалізаваны ў народнай гаспадарцы СССР з сумарным эканамічным эфектам, які перавышае 100 мільёнаў савецкіх рублёў. Узнагароджаны залатымі медалямі Усерасійскага выставачнага цэнтра — былога ВДНГ СССР (1998 г., 2002 г.), прэміяй транспартнай галіны Расіі «Залатая калясніца», Залатым знакам якасці «Расійская марка» ў намінацыі «Тэхналогія струннага транспарту» і шматлікімі дыпломамі сусветных выставак.

Лінейны горад SkyWay (візуалізацыя).

Цэх доследна-эксперыментальнай вытворчасці.

З духоўным лідарам Тыбета Далай-ламам XIV падчас дзелавой паездкі ў Індыю.

Распрацаваў сваю сістэму тэорыі рашэння вынаходніцкіх задач, падаў больш за сотню заявак на вынаходніцтвы. Атрымана вялікая колькасць патэнтаў. «Нашы ноу-хау прыносяць вялікі эфект і недаступныя для канкурэнтаў».

Стварыў сваю навуковую школу, школы канструктараў і праектную, а таксама транспартных машынабудаўнікоў. «Сёння ў нас працуе больш за 800 інжынераў. Гэта важна, бо без кваліфікаваных кадраў немагчыма стварыць ніводзін бізнес, тым больш інавацыйны».

І ўвесь гэты час адбіваўся ад крытыкаў і нядобразычліўцаў. Вось як ён сам каментуе такую сітуацыю.

— Усім сваім нядобразычліўцам я ўдзячны за вучобу. Яны стымулявалі маю творчую думку. У выніку я прапанаваў найбольш эфектыўную аэрадынаміку сваіх юніл'етаў і юнібайкаў. Мы стварылі цудоўны дызайн гэтых машын і нашых станцый. Эстэтычны канструкцыйны мінімалізм — маё крэда як інжынера. Прыгожы самалёт той, які добра лятае, а не той, які прыгожа размаляваны. Эстэтыка прысутнічае ў нас ва ўсім. Усё, што мы робім, — прыгожае. І нічога лішняга. На пераследаванні ў мяне няма злосці, ёсць эмоцыі. На самай справе гэта патрэба ўспрымаць як праяўленне ўвагі, як пазітыў...

І працягвае:

— Вось новая распрацоўка: гарадскі электрамабіль. Якая тут можа быць крытыка? Нам ніхто не даручаў, а мы стварылі свой электрамабіль, які ўжо бегае, — юнімабіль. Гэта не юнібус для струны, а гарадскі электрамабіль для асфальту. Ён прыдатны для перавозкі пасажыраў, у тым ліку для перавозкі калясачнікаў. Толькі ў нашым электрамабілі калясачнік заязджае ў салон у сваім крэсле. Прышпільваецца і едзе, седзячы ў крэсле. Бо яно зроблена як крэсла кіроўцы. Прычым ён можа заязджаць не з вуліцы, а з тратуара, што больш бяспечна і зручна, і выязджаць на тратуар. Зрабілі два тыпы інвалідных крэслаў, у якіх няма сусветных аналагаў, адно з іх можа рухацца самастойна і праехаць 40 кіламетраў з хуткасцю 20 км у гадзіну. Пасажыр кіруе ім з дапамогай джойсціка.

Наш транспартны сродак выклікаў цікавасць удзельнікаў мінулагодняй восеньскай выстаўкі транспарту для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, яна праходзіла ў Маскве. Пра гэтую распрацоўку ведаюць у Егіпце, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, у Індыі, іншых краінах. І паступілі прапановы наладзіць серыйную вытворчасць. Машына праязджае на зарадцы 120 кіламетраў, магчыма паставіць больш магутны акумулятар, і будзе 200.

— Ці заваршыліся выпрабаванні двухмеснага юніведа?

— Выпрабаванні разнавіднасці нашага электрамабіля працягваюцца. Увогуле, мы спраектавалі і выраблі дзевяць разнастайных мадэляў сваіх электрамабіляў. Вось іх выявы вісяць на сцяне, можаце сфатаграфаваць. Альбо ўзяць гэты здымак у нас. Яны розныя умяшчальнасці, а грузавыя — рознай грузападымальнасці. У іх розны скорасны рэжым. І кожная з іх па-свойму ўнікальная. Пачалі рабіць юніконт для перавозкі кантэйнераў у трапічным варыянце.

Чатыры машыны сертыфікаваны — юнібайк, юнікар, юнібус манарэйкавы і юнібус бірэйкавы 24-месны.

Зараз у рабоце паязды падвясныя і навясныя, двухпавяховыя, калі эстакада ў двух ці трох узроўнях. Інакш кажучы, у нас многа чаго ў рабоце. Акрамя таго, зрабілі шэсць розных транспартных ліній.

Асноўныя вузлы, агрэгаты, дэталі вырабляем самі. Нават самі робім матор-кола. Спраектавалі рукавік на пастаянных магнітах і наладзілі вытворчасць цэлай лінейкі рукавікоў з вадкасным ахалоджваннем — на тры кілаваты, на пяць кілават, на дзесяць і гэтак далей. Таму што з такімі характарыстыкамі — няма, не купіш. У нас свая цудоўная вытворчая база, і яна дазволіла гэта зрабіць.

— Як вы ставіцеся да людзей, якія інвеставалі свае сродкі ў праект?

— Патрэбна заznачыць, што яшчэ раней інвестарамі тэхналогій SkyWay выступілі, падтрымліваючы нашы разнастайныя праекты, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Міністэрства эканамічнага развіцця Расійскай Федэрацыі, Дзяржбуд Расіі, губернатары Краснаярскага краю (тады яшчэ Аляксандр Лебедзь) і Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі — Югры, кіраўнікі адміністрацый Хабараўска, Стаўрапольля і Екацярынбурга, Дзяржкіно — яшчэ СССР і Савецкі фонд міру. І што самае галоўнае — больш за 200 000 звычайных людзей з розных краін. Гэта мае галоўныя партнёры, я стаўлюся да іх з вялікай павагай, бо яны паверылі ў мяне як інжынера. І пацвердзілі свой давер на мінулагоднім экалагічным фэсце пад Мінскам, у нашым ЭкаТэхнаПарку, куды прыехалі некалькі тысяч чалавек з большасці краін свету.

Мае ўдзячныя адносіны да іх не залежаць ад сумы інвестыцый. Няважна, чалавек унёс сто долараў ці некалькі тысяч. Без яго ста долараў мы не змаглі б зрабіць тое, што зрабілі. Тым больш падняць новую галіну. Гэта наш фундамент.

— У 70 гадоў падводзіць вынікі рана, хіба што — прамежкавыя. Вы задаволены прамежкавымі вынікамі?

— Калі б усё гэта адбылося раней, такія вось вынікі, магчыма, я не быў бы да іх гатовы. А так я разумею, што зроблена, і гатовы ісці далей. Я стварыў групу кампаній назаўсёды. І хачу, каб справа прадаўжалася.

У актыве

ШТО ЎЖО ЗРОБЛЕНА

Вытворча-зборачны цэх і два новыя адміністрацыйна-вытворчыя будынкі.

Скорасная гарадская пасажырская траса працягласцю 1 км, двухузроўневая — для падвясной і навясной транспарту. Маецца на ўвазе, што яна будзе прадоўжана.

Гарадская манарэйкавая пасажырская траса працягласцю 800 м.

Падвясны і навясны гарадскі пасажырскі юнібус (бірэйкавыя, 48 пасажыраў) — дзве адзінкі.

Падвясны гарадскі пасажырскі юнібус (манарэйкавы, 14 пасажыраў).

Грузавая фірменна-струнная эстакада SkyWay.

Пасажырская станцыя.

Грузавы юнітранс для перавозкі сыпучых грузаў з поездам працягласцю 400 м.

Грузавы падвясны юнікар для перавозкі розных грузаў, а ўсяго дзевяць мадэляў электрамабіляў SkyWay.

Пагрузачна-разгрузачныя тэрміналы, анкерныя апоры, больш за 40 прамежкавых апор вышынёй ад 4 да 15 м, шматлікія іншыя элементы інфраструктуры ЭкаТэхнаПарка.

Садова-паркавы комплекс з больш як 2000 садовых дрэваў і возера 2500 м² з экасістэмай.

Вачыма замежных прафесіяналаў

ЛЮДЗЕЙ ПАГЛЯДЗЕЦЬ, СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ

— Усё сапраўды пазнаецца ў параўнанні. Для вас выхад на замежныя рынкі — гэта рынцыпова. Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна пра свае міжнародныя кантакты, пра ўдзел у сусветных транспартных выстаўках.

— Калі трапляюся на такія выстаўкі, дзе сустракаеш аднадумцаў, гэта радуе — тут суцэльнае свята навуковай ідэі. І заўсёды прыемна вось што: калі замежнікі бачаць, што мы зрабілі, яны, мякка кажучы, заўсёды ашаломленыя: як мы змаглі? Напрыклад, японцаў з іх культам навукова-тэхнічнага прагрэсу зробленае намі настолькі ашаламіла, што здымачная група такійскага тэлебачання зняла спачатку адзін фільм пра наш незвычайны струнны транспарт, праз год яшчэ адзін, і абодва дэманстраваліся па японскім тэлебачанні. Яны так пракаментавалі: мы прыехалі да вас па натхненне.

Нас іншы раз выдаюць за вялікіх фантазёраў. Скажыце, ці маглі б прагматычныя і спрактыкаваныя ў перадавых тэхналогіях жыхары Краіны ўзыходзячага сонца двойчы звярташа да пустых фантазёраў з малавядомай для іх краіны па навінкі, якія прымусілі б іх здымаць дарагія фільмы? Думаю, што не, і з намі яны былі шчырыя.

На такіх выстаўках замежнікі фатаграфавалі нашы юнікары і юнібусы рэнтгенаўскімі апаратамі. Пара здымкаў, і ўсё як на далоні. Хай нехта ўспрыме мае словы як вобраз, але мне не да вобразнасці, бо напрацаванае гадамі цяжкай работы заслугоўвае таго, каб максімальна доўга заставацца нашай тэхналогіяй. Пры гэтым скажам, што мы робім свае машыны для людзей і не дзеля грошай.

На міжнародной выстаўцы Future CitiesShow 2018, г. Дубай.

На выстаўках мы кожны раз пераконваемся, што нашы электрамабілі эфектыўнейшыя за іншыя, у тым ліку за знакамітую «Тэслу». Нашы накапляльнікі энергіі больш эфектыўныя за батарэі ўсіх іншых фірмаў, у тым ліку і за акумулятары Маска. Канешне, на выстаўках можна ўбачыць нешта карыснае і для сябе, але мы больш давяраем уласнай навуцы. У нас вельмі многа навукі, свая навуковая школа. Свой выпрабавальны цэнтр вельмі салідны.

Напрыклад, многія буйныя інвестары і спецыялісты ў розных галінах транспарту ўдзельнічалі ў выстаўцы Innotrans 2018 у Берліне. Прамысловыя гіганты накштталт Siemens, Hitachi, Alstom дэманстравалі тут найлепшае з таго, што створана за апошні час. І ўсё ж адной з самых незвычайных і ўражальных навінак выстаўкі па агульным прызнанні стаў наш юніл'ет SkyWay — высакаскорасны струнны транспарт з Беларусі. Інжынеры, маркетолагі, дызайнеры ў галіне транспарту з розных краін згаджаліся з тым, што паказаная беларусамі машына — нешта прынцыпова новае ў свеце рэйкавага транспарту. Яна здольная разганяцца да 500 кіламетраў за гадзіну, пры гэтым расходуючы ўсяго 0,93 кілаграма паліва на пасажыра на 100 кіламетраў шляху, што беспрэцэдэнтна мала. На хуткасці 100 км за гадзіну паказчык не перавысіць 0,105 кілаграма.

Вы пытаецеся, якім чынам дасягаецца? Дзякуючы высокаму ККД сістэмы «стальное кола — стальная рэйка», а таксама таму, што машына рухаецца па эстакадзе. За кошт гэтага, а таксама ўнікальнай формы машыны мы змаглі атрымаць паказчык Cx=0,06, блізкі да тэарэтычнай мяжы. Кіраванне высакаскорасным юніл'ётам цалкам аўтаматызаванае, што дазваляе забяспечыць мінімальны бяспечны інтэрвал руху дзве секунды. Фантастыка?

Прадукцыйнасць перавозак пры такіх параметрах можа перавышаць 200 тысяч пасажыраў у суткі.

Аналітыкі звярнулі ўвагу: у той час, калі астатнія заняты аптымізацыяй вузлоў і механізмаў агульнавядомых транспартных сродкаў, тут прадстаўлена прынцыпова новае рашэнне. Выкарыстанне блокчэйн-тэхналогій, работа з Big Data, стварэнне аўтаматызаваных сістэм кіравання комплексамі з магчымасцю адаптацыі раскладу руху пад аб'ёмы пасажырапатоку, інавацыйная распрацоўкі ў сферы інфраструктуры, стварэнне дадатковых паслуг для людзей з абмежаваній мабільнасцю дэманструюць сістэмнасць падыходу SkyWay і скіраваны на ўсебаковае ўключэнне ў працэсы трансфармацыі лакальнай і глабальнай транспартнай сістэмы.

Высакаскорасныя і іншыя рашэнні беларускай фірмы заўважылі і ўзначліва вывучылі прадстаўнікі ўсіх буйных кампаній-удзельнікаў выстаўкі ў Берліне. Яны высока ацанілі патэнцыял тэхналогіі і адзначылі, што па шырыні сфер магчымага прымянення SkyWay не мае аналагаў. Не выпадкова выставачная пляцоўка гасцей з Мінска была ў ліку самых наведваемых.

Жонка А. Э. Юніцкага, генеральны дырэктар ЗАТ «Струнныя тэхналогіі» Надзея КОСАРАВА.

— Ёсць фотаздымак, на якім вы цалуеце высакаскорасны юнібус.

— Бо я ганаруся гэтай унікальнай машынай. (Як і юніл'ётам, характарыстыкі якога прыведзены крыху вышэй.)

Магутнасць рухавіка юнібуса 400 конскіх сіл, і, каб атрымаць хуткасць 500 км за гадзіну, ён расходуе толькі восем літраў на 100 км шляху, вязе шэсць пасажыраў.

Віцэ-прэзідэнт адной з вядучых сусветных кампаній зазначыў пра нашу прадукцыю, пра якасць салона яшчэ на Берлінскай выстаўцы 2017 года: «Выгляд у вас не горшы, чым у Мерседэса».

Спадар віцэ-прэзідэнт тры разы ўдакладняў, адкуль мы, — калі яму паказвалі і расказвалі пра вытворчасць. І тройчы перапытваў: а дзе гэта? Прыемна, што мы змаглі здзівіць такога прафесіянала і якасцю свайго транспарту, і краінай-вытворцам, пра якую ён да гэтага не чуў.

Асабліва прыемным было тое, што спецыялісты заўважылі: за апошнія два-тры гады струнны транспарт з добра прапрацаванага канцэпта ператварыўся ў транспартную сістэму, якая функцыянуе, адразу з некалькімі мадэлямі рухомага саставу, гатовымі не толькі да выставак, але і да продажу.

Такі ж цёплы прыём нашы навінкі сустрэлі і на транспартным кангрэсе ў Сінгапуры.

Перспектывы развіцця

МІРНАЯ ЭКСПАНСІЯ ЮНІЛЁТАЎ ПАЧАЛАСЯ

Генеральны канструктар Анатоль Юніцкі ўпэўнены: хутка мы будзем жыць у новай Еўразійскай прасторы, якая выйдзе на новыя эканамічныя і сацыяльныя паказчыкі. Транспартнымі артэрыямі стане сукупнасць трас SkyWay, аб'яднаных у адзіную сетку Транснет. Такія ж сеткі будуць створаны ў Еўропе, Амерыцы, Афрыцы з наступным аб'яднаннем у адну глабальную сетку.

З эканамічнага пункту гледжання гэта непазбежна, бо сёння перамяшчэнне хуткім, танным і экалагічным спосабам — важная патрэба для людзей. Акрама стварэння зручнага гарадскога, міжгародняга і міжнароднага транспарту гэтая ўніверсальная сістэма дазволіць уключыць у эканамічны абарот сыравіну, якая знаходзіцца ў цяжкадаступных рэгіёнах, у вечнай мерзлаце, джунглях і высакагор'і.

Пра тое, што гэта цалкам рэальныя планы, сведчыць і інтарэс, праяўлены зусім нядаўна да струннага транспарту кіраўніцтвам Арабскіх Эміратаў. Наша газета коратка расказвала пра гэта, але навіна таго заслугоўвае, каб да яе звярнуцца яшчэ раз.

Сёлета на самітце сусветнага ўрада ў Дубаі прадстаўнікі 140 краін і міжнародных арганізацый абмеркавалі інавацыі ў навуцы, тэхналогіях і глабальным кіраванні. Яго ўдзельнікам паказалі фактычна дзве інавацыі — SkyWay і электракар (электрамабіль) фірмы «Ягуар».

Іх агледзелі эмір Дубая, ён жа прэм'ер-міністр і віцэ-прэзідэнт краіны, і наследны прынц, яны прысутнічалі на самітце. Прадукцыя SkyWay, наколькі можна меркаваць нават са слоў арабскіх СМІ, зрабіла моцнае ўражанне.

Анатоль Эдуардавіч узнагароджаны міжнародная Славацкай Прэміяй міру. Браціслава, снежань 2018 г.

Магчыма, таму ўслед адбыўся яшчэ шэраг прыемных падзей. Цяпер у Арабскіх Эміратах ствараецца Інавацыйны цэнтр SkyWay, якога ўжо чакаюць на ўсім Блізкім Усходзе.

Праверка космасам

ДАЦЬ ЧАЛАВЕЦТВУ НАДЗЕЮ

— Зусім нядаўна выйшла з друку ваша цудоўная манаграфія, таўшынёй, як усе тамы «Вайны і міру» разам, якая складаецца з дзвюх частак: SkyWay («Нябесны шлях») і SpaceWay («Касмічны шлях»). У другой частцы размова ідзе пра шляхі далейшага развіцця нашай цывілізацыі. Пракаментуйце, калі ласка.

— Справа ў тым, што я цвёрда пераканаты: у нашай цывілізацыі няма іншага шляху для выжывання, акрамя пераносу прамысловасці ў космас. Ідэя перасялення чалавецтва на Марс ці на іншыя планеты не вытрымлівае крытыкі. Гэтае перакананне не пакідае мяне амаль сорак гадоў, і на працягу ўсяго гэтага часу з'яўляецца галоўным матывам усяго, што я раблю. Мне многага ўдалося дасягнуць з часу першай публікацыі на гэтую тэму ў 1982 годзе ў саюзным часопісе «Изобретатель и рационализатор», але яшчэ больш належыць зрабіць.

— Тое, што вы прапануеце для рашэння асноўных праблем сучаснай касманаўтыкі, — тэма для асобнай сустрэчы і асобнай размовы, настолькі гэта цікава, нават захапляльна і... складана для ўспрымання. Ва ўсякім разе, на першы погляд. Давайце будзем мець на ўвазе магчымасць наступнай сустрэчы, а сёння прашу вас спыніцца на асобных момантах. Як бы падрыхтаваць чытачоў да больш грунтоўнага расказу.

— Як ні дзіўна, рашэнне асноўных праблем сучаснай касманаўтыкі існуе даўно. Яшчэ ў 70-я гады мною быў прапанаваны праект неракетнай геакасмічнай транспартнай сістэмы — Агульнапланетарны транспартны сродак (АТС), які здольны ў найкарацейшыя тэрміны выводзіць велізарную колькасць карыснага грузу на каляземную арбіту.

Аснову прапанаванай праграмы індустрыяльнага асваення космасу складае самае грандыёзнае інжынернае збудаванне на планеце за ўсю гісторыю цывілізацыі — тараідальная канструкцыя даўжынёй 40 тысяч кіламетраў і дыяметрам больш за 12 тысяч кіламетраў. У папярочніку яна мае памер усяго 2-3 метры. Гэта і ёсць агульнапланетарны транспартны сродак. Інакш кажучы, размешчанае паралельна экватару Зямлі кола, якое складаецца з асобных сегментаў і знаходзіцца на абсталяванай эстакадзе, што апаясвае планету. Дзякуючы спецыяльным сістэмам, дзейнасць якіх заснавана на законах фізікі, АТС здольны за адзін раз даставіць на арбіту каля 10 мільёнаў тон усялякіх грузаў і да 10 мільёнаў пасажыраў, калі гэта спатрэбіцца. За год АТС зможа выходзіць у космас да ста разоў. І знізіць сабекошт геакасмічных перавозак больш чым у тысячу разоў.

Экалагічна чысты самаянсучы геакасмічны транспарт, які працуе выключна на электрычнай энергіі, дазволіць рэальна ажыццявіць індустрыялізацыю бліжняга космасу і забяспечыць вынас за межы планеты ўсіх шкодных для зямной біясферы прамысловых вытворчасцяў.

— Аднавіўшы іх на каляземнай арбіце...

— Так. І гэта адразу адкрые доступ да прынцыпова новых тэхналогій за кошт выкарыстання ўнікальных касмічных магчымасцяў, недаступных на Зямлі: бязважкасці, глыбокага вакууму, звышнізкіх і звышвысокіх тэмператур і гэтак далей. Вынас прамысловасці за межы планеты радыкальна палепшыць асяроддзе існавання чалавека, наш агульны дом — біясферу Зямлі.

Практычна ўсе інжынерныя рашэнні праекта шырока вядомы, апрабіраваны на практыцы. Праект за мінулыя 40 гадоў шматразова даследаваны і праверваны разлікоўымі метадамі. Ён цалкам тэхнічна і эканамічна абгрунтаваны і даступны для эканомікі такіх краін, як ЗША, Кітай ці Расія.

Для рэалізацыі праекта ў чалавецтва сёння ёсць усё неабходнае. Тэрмін рэалізацыі можа скласці да 15 гадоў.

І вось што яшчэ важна. Такая глабальная геакасмічная праграма дазволіць аб'яднаць вакол сябе ўсе развітыя краіны свету агульнасцю мэт і задач, прыцягнуць іх да фінансавання гэтага звышамбіцыйнага праекта, закліканага выратаваць чалавецтва.

— Дзякуй за гутарку.

АД РЭДАКЦЫІ. Выказваем шчырую ўдзячнасць за рознабакавую дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі начальніку аддзела інфармацыі і друку ЗАТ «Струнныя тэхналогіі» Яўгену ПЯТРОВУ і спецыялістам па рабоце са СМІ Арцёму САПРЫКУ і Вячаславу ЕЎТУХУ.

УНП 192425076.

Публікацыю падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

Прэзентацыя праекта SkyWay «Юнімабіль» на спецыялізаванай выстаўцы «ІнваЭкспа. Грамадства для ўсіх». Масква, верасень 2018 г.

Канструкцыя касмічнай індустрыяльнай «Арбіты» з тараідальнай ЭкаКосмаДамамі (візуалізацыя).

ПАСЛАННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА

АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь
14 сакавіка 2019 г. г. Мінск

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П. П., намесніка Старшыні Карповіч Н. А., суддзяў Бойка Т. С., Варановіча Т. В., Данілюка С. Я., Козыравай Л. Р., Рабцава В. М., Рабцава Л. М., Сяргеевай В. Г., Цікавенкі А. Г., Чыгрынава С. П., разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні пытанне аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2018 годзе,

кіруючыся артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкуламі 74, 79, 84, 161—163 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве»,

ВЫРАШЫЎ:

1. Прыняць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2018 годзе» (дадаецца).

2. Апублікаваць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2018 годзе» ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П. П. МІКЛАШЭВІЧ.

№ Р-1166/2019

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь

Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь з'яўляецца прамым фундаментам і арыенцірам умацавання суверэннай беларускай дзяржаўнасці, дэмакратычных і сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, асноватворным фактарам устойлівага развіцця.

На працягу мінулых 25 гадоў на аснове Канстытуцыі ў Рэспубліцы Беларусь забяспечваецца грамадска-палітычная стабільнасць, дасягаюцца грамадзянская згода і сацыяльнае адзінства, звяляюцца і паступальна развіваюцца грамадства і дзяржава.

Прававая сістэма, сфарміраваная на канстытуцыйных прынцыпах і нормах, мэтанакіравана здзясняльваецца дзеянні прававых механізмаў рэалізацыі прыроднага права, які абавязкова дзяржаву, усе яе органы і службовых асоб дзейнічаць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства.

Працягваецца працэс фарміравання дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы на канстытуцыйных палажэннях аб народаўладдзі, прынцыпах падзелу і ўзаемадзеяння галін дзяржаўнай улады, усебаковым развіцці асобы як галоўнага суб'екта канстытуцыйных праваадносін.

Беларуская мадэль дзяржавы для народа, у цэнтры якой — правы чалавека на заслужанае і бяспечнае жыццё, будуецца на канстытуцыйнай аснове з улікам як айчынных традыцый і менталітэту, так і сучасных рэалій міжнароднага прававарадкаванасці.

Удасканальваецца заканадаўчае рэгуляванне ўзаемадносін дзяржавы і асобы ў мэтах дасягнення аптымальнага балансу інтарэсаў выходзяць з канстытуцыйных палажэнняў, згодна з якімі чалавек, яго правы і свабоды — найвышэйшая каштоўнасць і мэта грамадства і дзяржавы.

Пры гэтым прынцыпы канстытуцыйна-прававога становішча чалавека і грамадзяніна сістэмна раскрываюцца ў заканадаўстве і ўлічваюцца ў прававпрымяняльнай дзейнасці.

Канстытуцыйны Суд, рэалізуючы паўнамоцтвы па кантролі за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў, сваёй дзейнасцю сцвярджае вяршэнства і прамое дзеянне Канстытуцыі, абаранае канстытуцыйны лад, канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян.

Пры дапамозе канстытуцыйнага судаводства прадухіляюцца і ўстараняюцца ў прававой сістэме неканстытуцыйныя прававыя акты, прабелы і прававая нявызначанасць канстытуцыйна-прававога характару ў заканадаўчым рэгуляванні.

I

Рэалізуючы на падставе артыкула 116 Канстытуцыі, артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкулаў 98—106 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве» паўнамоцтвы па абавязковым папярэднім кантролі канстытуцыйнасці законаў, прынятых Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд правярае на адпаведнасць Канстытуцыі заканадаўчыя палажэнні.

У 2018 годзе ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйны Суд праверыў канстытуцыйнасць 40 законаў, прынятых Парламентам.

1. У рашэннях Канстытуцыйнага Суда сфармуляваны прававыя пазіцыі, якія канстатуюць, што ўдасканальванне заканадаўчага рэгулявання грунтуецца на канстытуцыйных прынцыпах і нормах, выпрацоўваюцца прававыя механізмы для забеспячэння рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод.

1.1. У рашэнні па выніках праверкі заканадаўчага рэгулявання, накіраванага на ўдасканальванне забеспячэння абараназдольнасці, Канстытуцыйны Суд указаў, што ў адпаведнасці з артыкуламі 1 і 3 Канстытуцыі абарона канстытуцыйнага ладу з'яўляецца важнейшай функцыяй дзяржавы, якая ажыццяўленне якой выступае гарантыяй ее суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці, а таксама необходнай умовай эфектыўнасці і ўстойлівасці грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы (рашэнне ад 6 ліпеня 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь»).

1.2. У рашэнні па зменяннях у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь адзначана, што канстытуцыяналізацыя грамадскіх адносін звязана не толькі з ажыццяўленнем правоў грамадзян, але і з добрасумленнасцю выканання кожным канстытуцыйных абавязкаў, уключаючы прадугледжаны артыкулам 56 Канстытуцыі абавязак прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты дзяржаўных падаткаў, пошлін і іншых плацяжоў (рашэнне ад 22 снежня 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь»).

2. Пры праверцы канстытуцыйнасці законаў, што ўстанаўліваюць абмежаванні правоў і свабод асобы, Канстытуцыйны Суд фарміруе прававыя пазіцыі, у якіх звяртае ўвагу на необходнасць прытрымлівання заканадаўцам прынцыпу парцыяльнасці для дасягнення балансу канстытуцыйных правоў і свабод кожнага і публічных інтарэсаў дзяржавы і грамадства.

2.1. У рашэнні па зменяннях, якія ўносяцца ў Павятровы кодэкс Рэспублікі Беларусь, указана, што заканадаўчае рэгуляванне парадку прадастаўлення персанальных даных пасажыраў паветраных суднаў у пэўнай мэры абмяжоўвае права кожнага на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, але адпавядае артыкулу 23 Канстытуцыі, паколькі такое абмежаванне з'яўляецца аб'ектыўна абумоўленым і вымушаным сродкам, необходным для дасягнення сацыяльна апраўданай мэты барацьбы са злачынствамі тэрастрыстычнай накіраванасці і іншымі цяжкімі злачынствамі (рашэнне ад 8 чэрвеня 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении дополнений и изменений в Воздушный кодекс Республики Беларусь»).

2.2. У рашэнні, якое датычыцца заканадаўчага рэгулявання дзяржаўных закупак тавараў (работ, паслуг), адзначана, што абмежаванні, якія прадугледжваюцца палажэннямі правяраемага Закона, з'яўляюцца абгрунтаванымі і прамернымі, паколькі накіраваны на забеспячэнне добрасумленнай канкурэнцыі, стымуляванне суб'ектаў прадпрымальнікай дзейнасці ажыццяўляць такую дзейнасць у рамках існуючага прававарадку. Вызначэнне выпадкаў фарміравання спіса найдобрасумленных пастаўшчыкоў, якія часова не дапускаюцца да ўдзелу ў працэдурах дзяржаўных закупак, забяспечвае тым самым абарону праваў і законных інтарэсаў іншых асоб.

Устанаўліваемае заканадаўчае рэгуляванне адпавядае палажэнням Канстытуцыі, згодна з якімі дзяржава надае ўсім роўныя правы для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, акрамя забароненай законам, і абумоўлена інтарэсамі, указанымі ў артыкуле 23 Канстытуцыі.

Уводзімыя абмежаванні адпавядаюць прынцыпу суразмернасці, з'яўляюцца прапарцыянальнымі і необходнымі для абароны канстытуцыйна значных каштоўнасцей, захавання балансу паміж інтарэсамі грамадства і дзяржавы і інтарэсамі грамадзян і арганізацый (рашэнне ад 12 ліпеня 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О государственных закупках товаров (работ, услуг)»).

Ацэньваючы канстытуцыйнасць заканадаўчых палажэнняў, якія прадугледжваюць абмежаванне асобнымі нормамі законаў правоў і свабод грамадзян, Канстытуцыйны Суд асобую ўвагу ўдзяляў вызначэнню суразмернасці ўводзімых абмежаванняў канстытуцыйна значным інтарэсам, устаноўленым у артыкуле 23 Канстытуцыі. Пры гэтым Суд указаў, што Канстытуцыя дапускае магчымасць абмежавання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, але яно не павінна прыводзіць да прымяншэння або адмаўлення праваў і свабод.

3. У шэрагу рашэнняў Канстытуцыйны Суд адзначаў заканадаўчае ў законах палажэнняў, накіраваных на выкананне Рэспублікай Беларусь міжнародных абавязкасцьствав, апаспрадканне нацыянальным правам інтэграцыйных працэсаў, імплементацыю норм міжнароднага і наднацыянальнага права ў прававую сістэму Рэспублікі Беларусь.

3.1. У рашэнні, якое датычыцца заключэння міжнародных дагавораў, указана, што наруўні з актамі ўнутрыдзяржаўнага заканадаўства міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь уваходзяць у сістэму дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прававога рэгулявання. Выхадзячы з палажэнняў артыкулаў 7, 8 і 21 Канстытуцыі, нормы міжнародных дагавораў з'яўляюцца крыніцай дзеючага права і павінны непасрэдна прымяняцца пры рэгуляванні грамадскіх адносін (рашэнне ад 7 мая 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О международных договорах Республики Беларусь»).

3.2. У рашэнні па заканадаўчым рэгуляванні абароны праваў спажыўцоў зроблены вывад, што здзяйсненне прававога рэгулявання ў частцы абавязковаці выканання палажэнняў не толькі актаў нацыянальнага заканадаўства, але і актаў наднацыянальных органаў грунтуецца на нормах артыкулаў 8 і 21 Канстытуцыі, а таксама Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, Рэспубліка Беларусь як удзельнік еўразійскай інтэграцыі, выходзячы з пазіцыяў прыгатаванага Дагавора, у тым ліку прыкладаемага да яго Пратакола аб правядзенні ўзгодненай палітыкі ў сферы абароны праваў спажыўцоў, абавязана забяспечваць прававое рэгуляванне адносін, якія складаюцца ва ўказанай сферы, накіраванае на выкананне міжнародных абавязацельстваў (рашэнне ад 8 чэрвеня 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О защите прав потребителей»).

Такім чынам, ва ўмовах трансфарміруемай прававой сістэмы прадугледжваецца рэгуляванне грамадскіх адносін наруўні з актамі нацыянальнага заканадаўства таксама актамі міжнароднага і наднацыянальнага права. Крытэрыем легітымнасці такога рэгулявання, выходзячы з вяршэнства Канстытуцыі, з'яўляецца гарантаванне забеспячэння і абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, захавання канстытуцыйнай ідэнтычнасці.

4. Ажыццяўляючы праверку канстытуцыйнасці законаў, Канстытуцыйны Суд выяўляў пэўныя і яснасць прававых механізмаў рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод, якія змяшчаюцца ў заканадаўчых нормах, і у выпадку выяўлення прабелаў, калізій або прававой нявызначанасці прапаноўваў заканадаўцу прыняць меры для ўстаранення такіх дэфектаў.

4.1. У рашэнні па пытанні фарміравання рэгістра насельніцтва Канстытуцыйны Суд прыйшоў да высновы аб наяўнасці калізіі паміж палажэннямі Закона Рэспублікі Беларусь «Об информации, информатизации и защите информации» і нормай Закона Рэспублікі Беларусь «О регистре населения», якая надзяляе Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь правам вызначаць асабліваці ўнясення асобных персанальных даных у рэгістр і іх актуалізацыі.

Выходзячы з неабходнасці прытрымлівання прынцыпу вяршэнства права, Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу заканадаўца на тое, што пры далейшым удасканальванні прававога рэгулявання необходна ўстараніць калізію паміж нормамі ўказаных законаў у частцы вызначэння асаблівасцей унясення асобных персанальных даных у рэгістр і іх актуалізацыі ў ім, вызначыўшы межы ажыццяўлення Саветам Міністраў наданадзеная яму паўнамоцтва (рашэнне ад 27 снежня 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О регистре населения»).

4.2. У рашэнні па зменяннях заканадаўства аб электронным дакументе і электронным лічбавым подпісе Канстытуцыйны Суд указаў, што ў мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, забеспячэння балансу прававой і абавязкавай удзельнікаў у сферы электроннага дакументаабароту заканадаўцу пры далейшым удасканальванні заканадаўчага рэгулявання необходна вызначыць выпадкі адклікання адкрытага ключа, атрыбутнага сертыфіката незалежна ад волевыяўлення на тое іх уладальнікаў, а таксама ўстанавіць прававы механізм такога адклікання (рашэнне ад 31 кастрычніка 2018 г. па Законе Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «Об электронном документе и электронной цифровой подписи»).

Такім чынам, пры праверцы канстытуцыйнасці законаў Канстытуцыйны Суд звяртае увагу заканадаўца на необходнасць рэалізацыі і развіцця ў заканадаўчых актах прынцыпаў і норм Канстытуцыі, стварэння дзейсных прававых механізмаў забеспячэння і абароны правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, ажыццяўлення канстытуцыяналізацыі грамадскіх адносін у розных сферах.

II

Рэалізуючы на падставе артыкула 116 Канстытуцыі, артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў паўнамоцтва прымаць рашэнні аб устараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці, Канстытуцыйны Суд выходзіць з вяршэнства Канстытуцыі, прызнання агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права, недапушчэння зніжэння ўзроўню гарантаванасці і абароны канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

Забеспячэнне вяршэнства права патрабуе ад заканадаўца захавання яго найважнейшага элемента — прынцыпу прававой пэўнасці — у заканадаворчым працэсе пры ўстанаўленні і абмежаванні аб'ёму правоў і свабод, замацаванні механізмаў прававога рэгулявання паводзін суб'ектаў праваадносін.

1. У рашэнні «О правовом регулировании исчисления срока предъявления исполнительного документа к исполнению» (прынята 14 лютага 2018 г.) Канстытуцыйным Судом зроблены вывад аб наяўнасці прававой нявызначанасці ў прававым рэгуляванні перапынку тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання, калі раней прад'яўлены да выканання той жа самы выканаўчы дакумент быў вернуты спагнаніку па яго заяве. З прычыны гэтага тэрмін выканання можа працягвацца на нявызначана працягі час, і даўжнік на працягу нявызначанага часу знаходзіцца пад пагрозай прымянення мер прымусовага выканання.

Такое рэгуляванне не забяспечвае стабільнасць і прадказальнасць грамадзянскага абароту, парушае баланс інтарэсаў бакоў выканаўчага вядзення, паколькі прыводзіць да істотнага ўцясканя права ўласнасці даўжніка.

У мэтах выканання канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права і заснаванага на ім прынцыпу прававой пэўнасці Канстытуцыйны Суд прызнаў необходным устараніць нявызначанасць у канстытуцыйна-прававым рэгуляванні перапынку тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання ў выпадку прад'яўлення да выканання выканаўчага дакумента, раней вернутага спагнаніку па яго заяве, шляхам унясення адпаведных змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Об исполнительном производстве».

2. У рашэнні «О праве на судебную защиту заинтересованных лиц в приказном производстве» (прынята 10 красавіка 2018 г.) Канстытуцыйны Суд указаў, што канстытуцыйнае права на судовую абарону ва ўзаемасувязі з прынцыпам вяршэнства прававыдзяння і роўнасці бакоў у працэсе ў адпаведнасці з артыкуламі 60 і 115 Канстытуцыі павінна забяспечвацца магчымасцю атрыманя рэальнай судовай абароны шляхам адпаведных парушаных праваў і свабод. У загадным вядзенні справы магчымасць судовай абароны павінна забяспечвацца не толькі спагнаніку і даўжніку, але і іншым зацікаўленым асобам, правы і законныя інтарэсы якіх могуць быць закрануты вызначэннем аб судовым загадзе.

Грунтуючыся на нормах Канстытуцыі, у мэтах рэалізацыі прынцыпу вяршэнства права, захавання канстытуцыйнага права на судовую абарону Канстытуцыйны Суд прызнаў необходным устараніць прабел канстытуцыйна-прававога рэгулявання ў частцы забеспячэння права на судовую абарону зацікаўленых асоб у загадным вядзенні справы, правы і законныя інтарэсы якіх закранаюцца вызначэннем аб судовым загадзе, шляхам унясення адпаведных змяненняў у Грамадзянскі працэсуальны і Гаспадарчы працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь.

3. У рашэнні «О праве и порядке обжалования в суд осужденными к ограничению свободы, исправительным работам и иным видам наказания примененных к ним мер взыскания» (прынята 11 ліпеня 2018 г.) Канстытуцыйны Суд адзначаў, што канстытуцыйнае права на судовую абарону — гэта права не толькі на звароту суд, але і на атрыманне рэальнай абароны ў выніку ажыццяўлення судовай улады праз пэўныя віды судаводства.

Адсутнасць у заканадаўстве норм, якія ўстанаўліваюць права і парадак абскарджання асуджанымі да асобых відаў пакарання прымененых да іх мер спагнання, не забяспечвае канстытуцыйныя гарантыі судовай абароны правоў грамадзян, не дазваляе асуджаным належным чынам абараняць свае правы і свабоды, што не адпавядае палажэнням артыкулаў 22 і 60 Канстытуцыі.

У мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону, забеспячэння вяршэнства права і прававой пэўнасці ў дзеючым прававым рэгуляванні Канстытуцыйны Суд прызнаў необходным унесці ў Крымінальна-выканаўчы і Грамадзянскі працэсуальны кодэксы Рэспублікі Беларусь змяненні, якія ўстанаўліваюць права і парадак абскарджання ў суд асуджанымі да абмежавання свабоды, папраўчых работ і іншых відаў пакарання прымененых да іх мер спагнання.

4. У рашэнні «О правовом регулировании в гражданском законодательстве использования и охраны изображения гражданина» (прынята 30 кастрычніка 2018 г.) Канстытуцыйны Суд адзначыў, што знешняе абліччо грамадзяніна на сваёй сутнасной характарыстыцы адносіцца да ліку нематэрыяльных даброт, якія ахоўваюцца Канстытуцыяй. Як самадастаткоая асабістая нематэрыяльная даброта, права на выяву грамадзяніна павінна быць забяспечана законнымі спосабамі яго ажыццяўлення і абароны.

Канстытуцыйны Суд прыйшоў да высновы, што ў дзеючым заканадаўчым рэгуляванні існуе прававы дэфект, абумоўлены адсутнасцю ў грамадзянскім заканадаўстве належнага прававога механізма выкарыстання і аховы выявы грамадзяніна.

З улікам узаемазвязаных палажэнняў артыкулаў 2, 21 і 28 Канстытуцыі прызнана необходным у мэтах забеспячэння канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, абароны кожнага грамадзянска-прававымі сродкамі ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, устаранення прававой нявызначанасці ў прававым рэгуляванні выкарыстання і аховы выявы грамадзяніна ў грамадзянскім заканадаўстве ўнесці адпаведныя змяненні ў Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь.

Указаныя рашэнні прымаліся на падставе звароту у Канстытуцыйны Суд грамадзян і арганізацый па пытаннях удасканальвання заканадаўчага рэгулявання. Тым самым рэалізуецца ўстаноўленае Законам «О конституционном судопроизводстве» права грамадзян і арганізацый непасрэдна звяртацца ў Канстытуцыйны Суд са скаргай на парушэнне іх правоў і свабод з прычыны прымянення нарматыўнага прававога акта, канстытуцыйнасць якога ставіцца імі пад сумненне.

Канстытуцыйны Суд канстатуе, што судамі агульнай юрысдыкцыі практычна не рэалізуюцца палажэнні часткі другой артыкула 112 Канстытуцыі, якія прадугледжваюць, што калі пры разглядзе канкрэтнай справы суд прыйдзе да высновы аб неадпаведнасці нарматыўнага акта Канстытуцыі, то ён прымае рашэнне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і ставіць ва ўстаноўленым парадку пытанне аб прызнанні дадзенага нарматыўнага акта неканстытуцыйным.

Прапануе ад Вярхоўнага Суда і іншых судоў агульнай юрысдыкцыі ў мэтах выканання артыкула 112 Канстытуцыі ў 2018 годзе і папярэдніх гадоў ў Канстытуцыйны Суд не паступала.

Гэта сведчыць аб дасягненні пэўнага якаснага канстытуцыйна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін у розных сферах, высокай ступені ўзгодненага ўзаемадзеяння галін улады на канстытуцыйнай аснове ў заканатворчым працэсе, рэальным праяўленні канстытуцыйнай прававзбудаванасці і прававой культуры.

Для ацэнкі стану канстытуцыйнай законнасці важнае значэнне мае не толькі маркаванне дзяржаўных органаў, але і маркаванне грамадзян аб канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, якія закранаюць іх правы і свабоды.

У гатых мэтах у 2014 годзе ўстаноўлен заканадаўчы механізм звароту грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і арганізацый з ініцыятывай аб унясенні ў Канстытуцыйны Суд прапанаў аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў да органаў, якія валодаюць правам унясення ў Канстытуцыйны Суд такіх прапанаў.

У 2016 годзе здакладнена прававое рэгуляванне ініцыятыўных зваротаў грамадзян і арганізацый да ўпаўнаважаных органаў. Прадугледжана, што ініцыіраванне ўнясення прапановы аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта магчыма толькі ў дачыненні да акта, прыменанага ў канкрэтных рашэнні дзяржаўнага органа або пастанове суда агульнай юрысдыкцыі.

У 2014—2018 гадах да ўпаўнаважаных органаў, надзеленых правам унясення ў Канстытуцыйны Суд прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, паступіла 362 ініцыятыўныя звароты грамадзян і 14 ініцыятыўных зваротаў арганізацый, у ім ліку 78 звароту — у 2018 годзе.

Толькі ў 2014 годзе на падставе ініцыятыўнага звароту грамадзяніна Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ўнесла ў Канстытуцыйны Суд прапанову аб праверцы канстытуцыйнасці палажэнняў артыкулаў 29 і 303 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, якія не прадугледжвалі магчымасці праверкі законнасці і абгрунтаванасці спынення крымінальнага праследавання ў сувязі са смерцю падазронага або абвінавачанага па патрабаванні яго блізкіх сваякоў.

Іншых зваротаў за ўказаны перыяд ад упаўнаважаных органаў не паступала.

Такім чынам, устаноўлены ўскосны доступ грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя абавязвае дзяржаўныя органы, правамоцныя звяртацца непасрэдна ў Канстытуцыйны Суд, усебакова аналізаваць як палажэнні Канстытуцыі, так і палажэнні нарматыўных прававых актаў, якія выключаюць у грамадзян і арганізацый сумненні у канстытуцыйнасці.

Атрыманая Канстытуцыйным Судом інфармацыя сведчыць, што ва ўсіх упаўнаважаных дзяржаўных органах вядзецца асобы ўлік зваротаў грамадзян па пытаннях канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў і ў адпаведнасці з законам правадзіцца іх вывучэнне і разгляд для вызначэння необходнасці накіравання адпаведных прапаноў у Канстытуцыйны Суд. Аднак у 2018 годзе ўпаўнаважаныя органы прапаноў у Канстытуцыйны Суд не накіроўвалі.

Аналіз паступіўшых у Канстытуцыйны Суд зваротаў сведчыць, што ў шэрагу выпадкаў грамадзяне выказваюць незадавальненне тым, што іх ініцыятыўныя звароты да ўпаўнаважаных аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў не накіроўваюцца ва ўстаноўленым парадку ў Канстытуцыйны Суд.

У мэтах далейшага развіцця канстытуцыйнага кантролю прававарпымяняльнай практыкі, па маркаванні Канстытуцыйнага Суда, необходна разгледзець магчымасць увядзення індывідуальнай канстытуцыйнай скаргі, гэта значыць права грамадзян непасрэдна звяртацца ў Канстытуцыйны Суд са скаргай на парушэнне іх правоў і свабод з прычыны прымянення нарматыўнага прававога акта, канстытуцыйнасць якога ставіцца імі пад сумненне.

Канстытуцыйны Суд канстатуе, што судамі агульнай юрысдыкцыі практычна не рэалізуюцца палажэнні часткі другой артыкула 112 Канстытуцыі, якія прадугледжваюць, што калі пры разглядзе канкрэтнай справы суд прыйдзе да высновы аб неадпаведнасці нарматыўнага акта Канстытуцыі, то ён прымае рашэнне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і ставіць ва ўстаноўленым парадку пытанне аб прызнанні дадзенага нарматыўнага акта неканстытуцыйным.

Прапанаў ад Вярхоўнага Суда і іншых судоў агульнай юрысдыкцыі ў мэтах выканання артыкула 112 Канстытуцыі ў 2018 годзе і папярэдніх гадоў ў Канстытуцыйны Суд не паступала.

Канстытуцыйны Суд мяркуе, што ў мэтах забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі, прынцыпу вяршэнства права неабходна ўдасканальванне прававога рэгулявання звароту судоў агульнай юрысдыкцыі ў Канстытуцыйны Суд з прэюдыцыяльным запытам аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, які падлягае прымяненню судом у канкрэтнай справе, у выпадку сумненняў у яго канстытуцыйнасці.

IV

Поўнае і своечасовае выкананне рашэнняў Канстытуцыйнага Суда з'яўляецца важным паказчыкам узроўню канстытуцыйнай законнасці і забеспячэння канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Канстытуцыйны Суд адзначае ў цэлым належнае выкананне рашэнняў Канстытуцыйнага Суда, а таксама ўлік заканадаўцам і іншымі нарматворчымі органамі ў сваёй дзейнасці яго прававых пазіцый.

У 2018 годзе выканана 10 рашэнняў Канстытуцыйнага Суда і рэалізавана 9 прававых пазіцый.

1. Выкананы рашэнні аб устараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці, прынятыя ў мэтах выканання канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і законнасці, рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону.

1.1. У рашэнні «О правовом регулировании специальной конфискации» (прынята 6 чэрвеня 2017 г.) Канстытуцыйны Суд прызнаў необходным у мэтах забеспячэння канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, абароны дзяржавай уласнасці, набытай законным спосабам, выключыць правапаражняючы з'ўстаранёны раней прабел у Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь пры заканадаўчым рэгуляванні спецыяльнай канфіскацыі маёмасці выходзячы з яе асаблівай прававой прыроды і палажэнняў міжнародна-прававых актаў.

Рашэнне Канстытуцыйнага Суда рэалізавана Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2019 г. «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь», згодна з якім Крымінальны кодэкс дапоўнены артыкулам 461 «Специальная конфискация», што вызначае паняцце і змест дадзенага права кантыята.

1.2. У рашэнні «Об обеспечении права на беспрепятственную и своевременную юридическую помощь в уголовном процессе» (прынята 21 чэрвеня 2017 г.) Канстытуцыйны Суд, грунтуючыся на канстытуцыйных палажэннях (частка першая і другая артыкула 7, частка першая і другая артыкула 59, артыкул 62 Канстытуцыі), прызнаў необходным устараніць нявызначанасць прававога рэгулявання рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод, у тым ліку права карыстацца ў любы момант дапамогай адваката, у частцы беспарашкоднага і своечасовага ўступлення адваката ў крымінальны працэс на любой яго стадыі шляхам унясення заканадаўцам адпаведных змяненняў і (або) дапаўненняў у нормы Крымінальна-працэсуальнага кодэкса.

Згодна з палажэннямі ўказанага Закона ад 9 студзеня 2019 г. у артыкулах 44, 47 і 48 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса выключаны тэрмін «допуск» у адносінах да абаронцы і, адпаведна, магчымасць адвольнага меркавання службовых асоб, якія вядуць крымінальны працэс, у дачыненні да ўдзелу абаронцы ў вядзенні па крымінальнай справе. Тым самым у крымінальна-працэсуальным кодэксе атрымала развіццё канстытуцыйнае права кожнага на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод.

1.3. У рашэнні «О правовом регулировании возбуждения уголовных дел частного обвинения» (прынята 27 лістапада 2015 г.) Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараніць прабел канстытуцыйна-прававога рэгулявання ўзбуджэння крымінальных спраў прыватнага абвінавачання шляхам унясення ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс змяненняў і дапаўненняў, што прадугледжваюць узбуджэнне крымінальных спраў прыватнага абвінавачання ў выпадку смерці асобы, якая пацярпела ад злачынства, па заявах яе паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і, а таксама абавязак органа крымінальнага праследавання абуджаць крымінальныя справы прыватнага абвінавачання пры адсутнасці звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства, указанае ў частцы 2 артыкула 26 гэтага Кодэкса.

Рашэнне рэалізавана палажэннямі вышэйназванага Закона ад 9 студзеня 2019 г., у адпаведнасці з якімі ў Крымінальна-працэсуальным кодэксе ўстаноўлена, што па справах прыватнага абвінавачання пры наяўнасці асобы, якая пацярпела ад злачынства, па ўзросце або стане здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку ее смерці — любы з ее паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сем'і, законны прадстаўнік маюць права выстаўляць і падтрымліваць абвінавачанне супраць асобы, якая ўчыніла злачынства; пацярпелы або яго правапераемнік мае права ў любы момант вядзення па крымінальнай справе адмовіцца ад абвінавачання (частка 1 артыкула 28); ва ўказаных выпадках крымінальная справа прыватнага абвінавачання ўзбуджаецца любым з ее паўналетніх блізкіх сваякоў або членаў сям'і, а таксама не законным прадстаўніком або прадстаўніком юрыдычнай асобы шляхам падачы ў раённы (гарадскі) суд заявы аб учыненні ў адносінах да яе злачынства, прадугледжанага часткамі 2 і 3 артыкула 26 дадзенага Кодэкса (частка 1 артыкула 426); пракурор узбуджае крымінальную справу аб злачынствах, указаных у частцы 2 артыкула 26 гэтага Кодэкса, па заяве асобы, якая пацярпела ад злачынства, пры адсутнасці ў ее звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства (частка 51 артыкула 26).

2. У шэрагу рашэнняў Канстытуцыйны Суд прызнаў необходным устараніць дэфекты ў сферы заканадаўчага рэгулявання адміністрацыйных і грамадзянскіх праваадносін, якія маюць канстытуцыйна-прававое значэнне.

2.1. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда «Об установлении процессуального порядка освобождения от уплаты государственной пошліны за подачу в суд жалоб на постановления по делам об административных правонарушениях» (прынята 25 верасня 2013 г.) адзначана, што адной з важнейшых гарантый рэалізацыі права кожнага на судовую абарону яго правоў і свабод з'яўляецца ўстанаўленне ў працэсуальным заканадаўстве парадку вызвалення грамадзян ад выплаты дзяржаўнай пошліны; адсутнасць такога парадку ў адміністрацыйным працэсе прымяняльна да выпадку адсутнасці ў грамадзяніна магчымасці заплаціць дзяржаўную пошліну ў сувязі з маёмасным становішчам перашкаджае ажыццяўленню ім канстытуцыйнага права на судовую абарону.

Рашэнне выканана ўказаным вышэй Законам ад 9 студзеня 2019 г., у адпаведнасці з якім артыкул 12.2 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях дапоўнены палажэннем аб праве суддзяў судоў агульнай юрысдыкцыі пры падачы ў суд скаргі на пастанову па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні, не звязаний з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, пойнасцю або часткова вызваліць фізічную асобу ад выплаты дзяржаўнай пошліны выходзячы з яе маёмаснага становішча.

2.2. У рашэнні «Об ограничении дееспособности гражданина вследствие психического расстройства» (прынята 16 кастрычніка 2013 г.) Канстытуцыйны Суд у мэтах устаранення канстытуцыйна-прававога прабелу прызнаў необходным унесці ў Грамадзянскі кодэкс змяненні і дапаўненні ў частцы замацавання магчымасці абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна з прычыны псіхічнага расстройства (псіхічнай хваробы або слабага розуму) у залежнасці ад ступені фактычнага зніжэння здольнасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, а таксама прызнання абмежавана дзеяздольным грамадзяніна, раней прызнанага недзеяздольным з прычыны псіхічнага расст

РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 2018 ГОДЗЕ

Рашэнне выканана Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. «О нормативных правовых актах», якім вызначана, што ў нарматыўным прававым акце, што спыняе дзеянне ранейшага нарматыўнага прававога акта і пагаршае яго тэхнічнае становішча грамадзян і юрыдычных асоб, вызначаецца парадак прымянення такога акта да адносін, якія ўзніклі на аснове адменнага акта, а таксама магчымасць і парадак поўнай рэалізацыі суб'ектыўных правоў, якія ўзніклі на падставе прававых прадпісанняў, спынёўшых дзеянне, але поўнасцю не рэалізаваных.

3. Заканадаўцам рэалізаваны шэраг прававых пазіцый, выкладзеных Канстытуцыйным Судом у ранейшых, у тым ліку прынятых у парадку ажыццяўлення абавязковага паляроднага кантролю канстытуцыйнасці законаў.

3.1. У рашэнні ад міжнародных дагавораў (прынята 8 ліпеня 2013 г.) Канстытуцыйны Суд указаў на прававую нявызначанасць, якая выражаецца ў адсутнасці спецыяльных палажэнняў аб афіцыйным апублікаванні часова прымяняемых міжнародных дагавораў, у якіх могуць змяшчацца палажэнні, што непасрэдна закранаюць правы, свабоды і абавязкі грамадзян.

У Законе Рэспублікі Беларусь «О международных договорах Республики Беларусь», выкладзеным у новай рэдакцыі Законам Рэспублікі Беларусь ад 11 мая 2018 г., вызначаны адзіны парадак для афіцыйнага апублікавання ўсіх відаў міжнародных дагавораў.

3.2. У рашэнні па Законе Рэспублікі Беларусь «Об электронном документе и электронной цифровой подписи» (прынята 22 снежня 2009 г.) Канстытуцыйны Суд указаў на неабходнасць ліквідацыі прававой нявызначанасці палажэнняў дадзенага Закона ў частцы ўстанаўлення выпадкаў прымянення электроннага лічбавага подпісу ў якасці аналагу адбітка пячаткі або штампа, а таксама вызначэння юрыдычнай сілы электроннага дакумента, узноўленага не на папяровым, а на іншым матэрыяльным носьбіце.

Дадзеная прававая нявызначанасць устаранёна Законам Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2018 г. «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «Об электронном документе и электронной цифровой подписи».

3.3. Заканадаўцам улічана прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда, выказаная ім у рашэнні «О позиции Конституционного Суда Республики Беларусь по Закону Республики Польша «О Карте поляка» (прынята 7 красавіка 2011 г.) і пацверджаная ў шэрагу іншых рашэнняў.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам защиты государственных секретов» артыкул 41 Закона Рэспублікі Беларусь «О государственных секретах», што замацоўвае часовыя абмежаванні правоў грамадзян, дапоўнены забаронай для грамадзян, якім прадастаўлены допуск да дзяржаўных сакрэтаў, атрымліваць ад замежных дзяржаў дакументы, што даюць правы на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю, а таксама карыстацца такімі льготамі і перавагамі, калі іншае не вынікае з міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што практычная накіраванасць дзяржаўных органаў і службовых асоб на поўнае і своечасовае выкананне рашэнняў і ажыццяўленне нарматворчай дзейнасці, выходзячы з прававых пазіцый Канстытуцыйнага Суда, садзейнічае эфектыўнасці заканадаўчага рэгулявання, павышэнню даверу грамадзян да інстытутаў дзяржаўнай улады.

Пры гэтым Канстытуцыйны Суд адзначае, што наяўнасць у шэрагу выпадкаў значных часовых перыядаў да прынята рашэнняў Канстытуцыйнага Суда да іх выканання не дазваляе своечасова забяспечваць прававое рэгуляванне з улікам у поўнай меры палажэнняў Канстытуцыі.

V

На падставе разгледжаных спраў і матэрыялаў, сістэмнага аналізу дзеючага прававога рэгулявання, выявучання зваротаў грамадзян і арганізацый пры ажыццяўленні кантролю канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у дзяржаве Канстытуцыйны Суд прыходзіць да наступных высноў і прапаноў.

1. Ажыццяўляючы кантроль канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, Канстытуцыйны Суд у 2018 годзе праверыў 40 заканаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і адобраных Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу, да іх падпісання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. У цэлым усе законы, праверэныя Канстытуцыйным Судом, прызнаны адпаведнымі Канстытуцыі.

Устанаўліваемае ў законах прававое рэгуляванне, заснаванае на прынцыпах і нормах Канстытуцыі, накіравана на стварэнне дзейсных прававых механізмаў рэалізацыі і абароны правоў і свабод асобы, забеспячэнне вяршэнства права, падтрыманне належнага ўзроўню канстытуцыйнай законнасці ў дзяржаве.

Разам з тым у некаторых законах выяўлены прабелы, калізіі і прававая нявызначанасць заканадаўчых палажэнняў, якія не парушаюць прынцыпаў і норм Канстытуцыі, не носяць сістэмнага характару і могуць быць устаранёны ў працэсе ўдасканалвання заканадаўчага рэгулявання. У шэрагу рашэнняў Канстытуцыйным Судом сфармуляваны прававыя пазіцыі і ў адрас правапрымяняльнікаў, якія арыентуюць на выкананне законаў з улікам выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу норм у мэтах недапушчэння парушэння праваў і свабод у правапрымяняльнай практыцы.

2. Улічваючы, што Канстытуцыя з'яўляецца арганізуючай і развіваючай юрыдычнай асновай прававой сістэмы, крыніцай узнікнення і функцыянавання ўсіх галін заканадаўства, неабходна далейшая паслядоўная канстытуцыяналізацыя права.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што нарматворным органам патрэбна ўсебаковага раскрыць патэнцыял Канстытуцыі ў прававым рэгуляванні розных сфер жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы, абапіраючыся на канстытуцыйныя прынцыпы і нормы. Мэтазгодна ўвесці ў практыку заканатворчай дзейнасці ўстанаўленне ўзаемасувязі норм праекта закона з канстытуцыйнымі прынцыпамі і каштоўнасцямі, эфектыўнасцю іх рэалізацыі і абароны.

3. У сучасных умовах сістэма сацыяльных адносін, якая ўтварае сферу прававога рэгулявання, знаходзіцца ў стане дынамічнай трансфармацыі і ўскладнення, характарызуецца праяўленнямі нестабільнасці, нераўнамернасці тэмпаў і ўзроўняў пераўтварэння розных сфер грамадскіх адносін.

Канстытуцыйны Суд лічыць неабходным пры фарміраванні мадэлі прававога рэгулявання, улічваючы розданакіраванасць і патэнцыяльную шматварыянтнасць развіцця, аптымальна выкарыстоўваць уплыў як дзяржаўна-прававога ўздзеяння, так і дзеяння ўнутраных механізмаў самарэгуляцыі. У гэтых мэтах патрабуецца прыняцце нарматыўных прававых актаў аб самарэгулюючых арганізацыях, а таксама мадэрнізацыя заканадаўства аб мясцовым самакіраванні.

4. Фарміраванне прававой дзяржавы абумоўлівае рэальнае ўбяспабленне ідэй канстытуцыяналізму, забяспячэнне прыярытэту прававой чалавека, якія не могуць быць парушаны законамі дзяржавы і яго дзеяннямі.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу Парламента на важнасць своечасовага рэгулявання рэалізацыі прававой новага пакалення. Улічваючы ўзмацненне ролі інфарматызацыі і лічбавізацыі на сучасным этапе, прававое рэгуляванне грамадскіх адносін у інфармацыйнай сферы павінна з'яўляцца прыярытэтным. У гэтых мэтах патрэбна прынятае нарматыўных прававых актаў, накіраваных на абарону персанальных даных грамадзян, забеспячэнне інфармацыйнага суверэнітэту і кібербяспекі краіны.

7. Міжнародная інтэграцыя і каапэрацыя з'яўляюцца дзейсным сродкам рэаладолення вымкліку, абумоўленых працэсамі глабалізацыі.

Удзел Рэспублікі Беларусь у міждзяржаўных утварэннях абумоўлівае неабходнасць забяспечваць захаванне прававога суверэнітэту і канстытуцыйнай ідэнтычнасці ва ўмовах узаемадзеяння міжнароднага, наднацыянальнага і нацыянальнага права. Пры гэтым актыі міжнароднага і наднацыянальнага права не могуць абмяжоўваць суверэннае права беларускага народа самастойна вызначаць свой шлях развіцця, прымяняць канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу, што пры фарміраванні інтэграцыйнага прававога рэгулявання трэба выпрацоўваць дзейсныя механізмы забеспячэння балансу нацыянальных і наднацыянальных інтарэсаў прыходзячы з вяршэнства Канстытуцыі, канстытуцыйных асноў дзяржаўнага ладу, неабходнасці забеспячэння суверэнітэту, які з'яўляецца здабыткам усіх пакаленняў народа Беларусі.

8. У сучасных умовах якасць жыцця вызначаецца не толькі матэрыяльным набыткам, але і здольнасцю дзяржавы забяспечыць гарманізацыю грамадскіх адносін і сацыяльную згоду на аснове гуманізму і справядлівасці.

Змяняюцца сацыяльна-эканамічныя ўмовы патрабуюць адэкватных падыходаў да рашэння праблемы сацыяльнай справядлівасці шляхам стварэння роўных умоў для рэалізацыі асобы, забеспячэння грамадзянам роўнасці стартавых магчымасцей для рэалізацыі асноўнага правоў і свабод.

Пры гэтым Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на неабходнасць развіцця сучаснага разумення справядлівасці ў заканатворчым працэсе, уліку духоўных асноў у нарматворчай, рэальнага механізма ўзаемадзеяння маральных і прававых норм у практычным прававрымяненні.

9. Прававзбомасць грамадства аб'ядноўвае розныя сацыяльныя, нацыянальныя і іншыя інтарэсы, ідэалагічныя і маральна-духоўныя арыенціры для пошуку кампрамісу і згоды ў дасягненні канстытуцыйнай мэты — забяспячэння Рэспублікі Беларусь суверэннай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай.

Для рэалізацыі канстытуцыйных мэт і каштоўнасцей неабходна сістэма мер агульнадзяржаўнай, агульнанацыянальнай, агульнаграмадзянскай падтрымкі, заснаванай на прынцыпе ўзаемнага даверу ўлады і народа.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ідэя зацвярджэння сучаснага канстытуцыяналізму павінна знаходзіцца ў аснове грамадскай прававзбудомасці, рэалізоўвацца на ўсіх узроўнях прававога выхавання і фарміравання асобы як грамадзяніна, які свядома і добраахвотна выконвае законы сваёй краіны, здольны праяўляць канстытуцыйны патрыятызм пры абароне каштоўнасцей і ідэалаў Канстытуцыі.

Гэта Пасланне прынята на пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь 14 сакавіка 2019 г.

Старшынствуючы —
Старшыня Канстытуцыйнага
Суда Рэспублікі Беларусь
П. П. МІКЛАШЭВІЧ.

Белагропромбанк
www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

Форма 1

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018 год	2017 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	5,34,78,82	165 471	153 080
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	6,35,82	195	259
4	Средства в Национальном банке	1103	7,36,82	699 963	709 710
5	Средства в банках	1104	8,37,82	497 464	187 228
6	Ценные бумаги	1105	9,38,82	3 172 743	3 218 008
7	Кредиты клиентам	1106	10,39,82	5 187 744	4 846 515
8	Производные финансовые активы	1107	11,40,82	350	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	12,41,82	140 104	99 714
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	13,42,82	262 159	258 166
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	14,43,82	239	3 469
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	15,44,82	12 720	8 855
13	Отложенные налоговые активы	1112	16,45,82	-	10
14	Прочие активы	1113	17,46,82	82 336	119 722
15	ИТОГО активы	11	4	10 221 488	9 604 736
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201	20,47,80,82	-	1 172
18	Средства банков	1202	20,48,80,82	1 500 294	1 416 181
19	Средства клиентов	1203	20,49,80,82	6 002 883	5 598 591
20	Ценные бумаги банка	1204	21,50,80,82	942 236	852 760
21	Производные финансовые обязательства	1205	22,51,82	15	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	23,52,82	4	990
23	Прочие обязательства	1207	24,53,80,82	56 019	48 290
24	ВСЕГО обязательства	120	19	8 501 451	7 917 984
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211	25,30,55	1 238 352	1 238 352
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213	56	22 254	21 163
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	26,57	124 413	132 852
30	Накопленная прибыль	1215	27,58	335 018	294 385
31	ВСЕГО собственный капитал	121	25	1 720 037	1 686 752
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		10 221 488	9 604 736

Форма 2

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 2018 год

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018 год	2017 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011	61,80,84	680 853	841 754
2	Процентные расходы	2012	61,80,84	332 879	417 128
3	Чистые процентные доходы	201	61	347 974	424 626
4	Комиссионные доходы	2021	62,80,84	177 846	153 436
5	Комиссионные расходы	2022	62,80,84	50 715	49 767
6	Чистые комиссионные доходы	202	62	127 131	103 669
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	63	18	30
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	64,80,84	4 405	972
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	65,84	31 299	23 063
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	66,84	1 811	3 315
11	Чистые отчисления в резервы	207	67,84	187 691	272 846
12	Прочие доходы	208	68,80,84	56 918	58 248
13	Операционные расходы	209	69,80,84	309 342	297 420
14	Прочие расходы	210	70	22 136	21 816
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	71,84	50 387	21 841
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	72,84	13	29
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	27,84	50 374	21 812
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях:				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22	73	0,0081	0,0041
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23	74	-	-

Форма 3

ОТЧЕТ об изменении собственного капитала за 2018 год

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей собственного капитала					
			уставный фонд	эмиссионный доход	резервный фонд	накопленная прибыль (убыток)	фонды переоценки статей баланса	всего собственный капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
	Раздел I. За год, предшествующий отчетному							
1	Остаток на 1 января 2017 г.	3011	707 970	-	100 110	272 675	133 673	1 214 428
1.1	В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок	30111	-	-	-	-	-	-
2	Изменения статей собственного капитала	3012	530 382	-	(78 947)	21 710	(821)	472 324
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	X	X	X	21 812	(99)	21 713
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	X	824	(824)	X	-
2.3	операции с учредителями (участниками)	30123	530 382	-	-	-	X	530 382
2.4.	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	427 989	-	X	X	X	427 989
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	X	X	X	-	X	-
2.6	операции с выкупленными акциями собственной эмиссии	301233	102 393	X	X	X	X	102 393
2.7	внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	301234	X	X	-	-	X	-
2.8	перераспределение между статьями собственного капитала	30125	-	-	-	722	(722)	-
2.9	прочие изменения	30126	-	-	(79 771)	-	-	(79 771)
3	Остаток на 1 января 2018 г.	3013	1 238 352	-	21 163	294 385	132 852	1 686 752
	Раздел II. За отчетный год							
4	Остаток на 1 января 2018 г.	3011	1 238 352	-	21 163	294 385	132 852	1 686 752
5	Изменения статей собственного капитала	3012	-	-	1 091	40 633	(8 439)	33 285
5.1	В том числе: совокупный доход	30121	X	X	X	50 374	(7 800)	42 574
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	X	1 091	(1 091)	X	-
5.3	операции с учредителями (участниками)	30123	-	-	-	(9 289)	X	(9 289)
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	X	X	X	X	-
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	X	X	X	(9 289)	X	(9 289)
5.6	операции с выкупленными акциями собственной эмиссии	301233	-	X	X	X	X	-
5.7	внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков	301234	X	X	-	-	X	-
Як правіла, усе тры-чатыры гадзіны шляху пасажырам паказваюць нейкія замежныя кінастужкі са стральбой, насіллем ды іншым негатывам. Вось я і думаю: а што вось гэтакім чынам можна «ўбіць» у галовы? Баюся, нічога добрага. Дык ці не лепш было б на дарозе паказваць нашы найлепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці, народныя ансамблі, школьныя гурты, вясёлыя абрадавыя дзеянні, якія ўхваляюць родную зямлю, працу, нашы святы?

Ды і прафесійных калектываў у нас багата. Узяць той жа аркестр імя Жыновіча, хор імя Г. І. Цітовіча, ансамблі народнай музыкі «Свята», «Бяседа». А колькі ў краіне вартых гарманістаў, колькі скрыпачоў!..

На жаль, яны рэдка трапляюць на тэлеэкраны, не так часта — на нейкія сцэны. Ды і ці многія могуць прыбыці на канцэрты? А восьу аўтобусах, па дарозе — я ў гэтым упэўнены — усе паглядзелі б на іх, з задавальненнем паслухалі. І гэта паспрыяла б выхаванню патрыятызму, павагі і любові да нашых працавітых і таленавітых людзей, да Беларусі, якая, безумоўна ж, заслугоўвае таго, каб да нас прыязджалі госці!..

Так, недзе ёсць іншыя краіны — можа, багацейшыя і цікавейшыя. Але ў нас ёсць наша. І шкада, што амаль не чутно тут роднай беларускай мовы, беларускіх спевак — я маю на ўвазе не толькі маршрутныя аўтобусы і цягнікі.

...Магчыма, я памыляюся, і гэта сапраўды нікому не трэба?

Мікола Котаў, фальклярыст.

г. Мінск.

Людзі і лёсы

«ЛЕПШ ЗА ЦЯБЕ НІХТО НЕ НАПІША МУЗЫКУ»

У нашай сям'і шануецца беларуская музыка, я з дзяцінства граю на скрыпцы, а неяк зацікавілася гісторыяй дзяржаўнага гімна і даведалася, што мой бацька знаёмы з нашчадкамі аўтара музыкі Несцера Сакалоўскага, захоўвае здымкі і дакументы з яго архіва. Такім чынам, шэсць фактаў з жыцця кампазітара.

Фота Несцера Сакалоўскага, датаванае 19.07.1920.

Вольга Ігнатаўна Сакалоўская (Лягоўчі), жонка кампазітара.

1. Нарадзіўся Несцер Сакалоўскі 9 лістапада 1902 года на тэрыторыі сучаснага Докшыцкага раёна. Яго маці выдатна спявала, а родны дзядзька быў слынным скрыпачом-самавукам, выдатна ведаў нацыянальныя абрады і тэатралізаваныя гульні.

Сваю працоўную дзейнасць Несцер пачаў у 1921 годзе харыстам Украінскага тэатра ў горадзе Мінску.

2. Музыку да песні «Мы — беларусы» кампазітар напісаў у 1944 годзе. Гэтая песня набыла шырокую папулярнасць, часта выконвалася на канцэртах і ў 1955 годзе была зацверджана ў якасці дзяржаўнага гімна БССР.

Што цікава, кампазітар на той час не меў завершанай спецыяльнай адукацыі, аб чым сведчыць заява, напісаная вясною 1947 года на імя начальніка Упраўлення па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў БССР. У ёй кампазітар пісаў, што ў 1930-х гадах не меў магчымасці скончыць кансерваторыю. У цяперашні час — мае, але па фармальных прыкметах (год нараджэння — 1902) не можа быць адноўлены ў ліку студэнтаў. А таму (даслоўна): «Прашу даць дазвол дырэктару Белдзяржкансерваторыі таварышу Аладаву М. І. на аднаўленне мяне студэнтам па класе тэорыі і кампазіцыі».

3. Падчас вайны Несцер Сакалоўскі разам з жонкай працаваў у Чувашыі, у Маскве, і мала хто ведаў, што на радзіме застаўся іх сын, якога на пачатку вайны не атрымалася вывезці з акупаванай тэрыторыі. Толькі пасля вызвалення Беларусі бацька знайшоў дзевяцігадовага Віцю ў вёсцы Свечкі, дзе той быў пастушком.

4. Лёс адмераў кампазітару нядоўгае і няпросце жыццё: ён памёр ва ўзросце 48 гадоў, але пры гэтым здзейсніў свайго роду подзвіг: у час паездак па Беларусі запісаў і апрацаваў звыш 500 народных песень. А колькі паспеў напісаць — на словы Янкі Купалы, Адама Русака, Анатоля Астрэйкі, Якуба Коласа і іншых! Сярод найбольш папулярных — знакаміты «Нёман» на словы Анатоля Астрэйкі.

У архіве кампазітара ляжаць лісты, напісаныя Адамам Русаком, Янкам Журбой, Ларыёнам Барашкам... Даслоўна: «Дарагі Несцер! Слухаем твае цудоўныя песні, але яшчэ больш будзем рады слухаць твой жывы голас сярод нас, тваіх сяброў. А гэта неўзабаве будзе. Кожны з нас, дарагі Несцер, напісаў ужо для цябе па добраму тэксту (яшчэ лепшаму, чым «Мы — беларусы»), бо ведаем, што лепш за цябе ніхто не напіша народную музыку. Янка Брыль, Уладзімір Карпаў, Антон Бялевіч, Мікалай Аўрамчык, Анатоль Вялюгін, Уладзімір Шахавец».

Магчыма, гэта першая пласцінка з запісам гімна БССР.

5. Несцера Сакалоўскага не без падстаў называюць адным з заснавальнікаў Рэспубліканскага народнага ансамбля беларускай песні і танца.

6. Адданай захавальніцай творчай спадчыны кампазітара доўгія гады была ўдава Несцера Сакалоўскага — Вольга Ігнатаўна. У 1970 годзе яна перадала ў музей народнай славы багомлы шмат дакументаў, звязаных з жыццём і творчасцю кампазітара: фотаздымкі, біяграфію з асабістым подпісам, нотныя выданні. Але самыя дарагія і важныя паперы пакінула сабе. Да самага адыходу з жыцця Вольга Ігнатаўна беражліва захоўвала іх, каб данесці да нашага часу.

Вераніка Цехановіч,

г. Мінск.

Я зноў выбіраю «Звязду»

«...Бо жыць з ёй куды цікавей»

Мае бабуля і дзядуля, Браніслава і Баніфацый Пярхальскія, жылі ў вёсачцы Багатырова, што за 48 вёрстаў ад Глыбокага. А таму, 30 гадоў адрацаваўшы на далёкай пошуце, я 30 гадоў жыву тут. І ўвесь гэты час са мною газета «Звязда».

Менавіта не пастаянна чыталі бацькі, а потым стаў выпісваць сам, бо ведаў, што на ёй старонках адлюстроўваецца жыццё Беларусі, што там многа павучальных артыкулаў і цікавых рарад. Мае любімыя рубрыкі: «Даты, падзеі, людзі», «Што ў свеце робіцца», «Што людзі пішуць», «Пугменскі тракт»... Люблю чытаць матэрыялы Валянціны Доўнар, Святланы Якжевіч, Алены Ляўковіч, гісторыка Вітаўта Чаронкі. Заўсёды цікавлюся рубрыкай «Шашкі», якую сёння вядзе Віталь Варушыла. А галоўнае, што газета падштурхнула мяне да выбучэння свайго радаводу...

Мая жонка Аліна Пятроўна чытае ў «Звяздзе» «Сямейную газету», старонкі «Краіна здароўя», «Крынічка»...

Што казаць, жыццё ў многім змянілася, мы жывём цяпер у век інтэрнэту, размаўляем па «Скайпе», перапісваемся «УКантакце». Але я думаю, што папяровая газета ўсё роўна не знікне — яе будуць чакаць і чытаць, бо жыць з ёй куды цікавей!

Анатоль Пярхальскі,

г. Глыбокае.

Так ці не?

«Замуж выйсці — трэба знаць...»

«У беларускамоўных тэкстах сустракаю словы абвінавачаны і абвінавачваны, гавядзіна і ялавічына, а месцамі — нават табак. Якія з іх ёсць у беларускай мове, а якіх няма?» — пытае спадарыня Кушаль з Мінска.

Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стылярэдактары «Звязды» Алесь Саламевіч і Леў Глушыцкі.

1. У пары абвінавачаны і абвінавачваны трэба адрозніваць два дзеепрыметнікі. Першы з іх — залежнага стану мінулага часу. Ён ужываецца ў дачыненні да таго, каго абвінавацілі, каго лічаць вінаватым. Напрыклад: *у час вайны ён быў абвінавачаны ў здрадзе*. Дзеепрыметнік абвінавачваны таксама залежнага стану, але ўжо цяперашняга часу. Часта ён выкарыстоўваецца ў значэнні назоўніка і абазначае таго, каму па судзе прад'яўлена абвінавачанне ў злачынстве. Напрыклад, у час судовага пасяджэння можа прагучаць фраза: *абвінавачваны, вы прызнаяце гэты факт?*

Падобны да апошняга дзеепрыметнік **падазраваны**. Ён таксама цяперашняга часу і абазначае таго, каго падазраюць у злачынстве.

2. Назоўнік гавядзіна можна знайсці ў слоўніках, але іх аўтары падаюць гэтае слова з паметай «абласное».

Такім чынам, у нашай мове *гавядзіна* — дыялектызм, а як асноўнае прынята слова **ялавічына** з нашаскам на першым складзе. Таму скажам: *купіць у краме ялавічыны, мама прыгатавала ялавічыны катлеты*.

3. Слова *табак* у беларускай мове сапраўды няма. Расліна, высушаныя лісце і сцёблы якой курацъ, называецца **тытунь** (існуе яшчэ варыянт з цвёрдым н — **тытун**). Памяншальна-ласкальную форму бачым, напрыклад, у прыказцы: *кожны курэц павінен мець свой аганец і тытунец*.

А вось тытунь для нюхання называецца па-беларуску **табака** (слова жаночага роду). У Якуба Коласа («У палескай глушы») чытаем: *«Міна яго была незвычайна важная. Пазіраў ён крыху прымружыўшыся, як бы ён толькі што занюхаў табакі і збіраўся чхнуць»*.

Кампанент *табака* прысутнічае ў выразах **на панюх (на нюх) табакі** ('зусім мала; нікольки'), **ні за панюх (за нюх) табакі** ('зусім дарэмна, без усякай прычыны'), **на табе чорт (чорце) табакі** ('вокліч расчаравання, незадаваленння з нагоды чаго-небудзь неспадзяванага, нечаканага'). Напрыклад, у прозе Васіля Быкава: *«Вельмі проста, — адказаў лейтэнант. — Загінулі без карысці. Ні за панюх табакі»*.

У абарону слоў

У беларускай мове здаўна ёсць слова **знаць**. Сёння часцей ужываецца сіноним **ведаць**, але гэта не значыць, што ён адзіна «правільны».

Корань дзеяслова «знаць» мае вельмі доўгую гісторыю. Ён быў у праславянскай мове і яшчэ раней. Дзеяслоў *знаць* ёсць у іншых сучасных славянскіх мовах: ва ўкраінскай, польскай, чэшскай, сербскай, македонскай і інш.

У сучаснай ж беларускай у гэтага дзеяслова шмат аднакарэнных слоў (вызнаваць,азнаць, знаўца, мовазнаўства, пазнаць, прызнаць і г. д.). Яго ўжывалі класікі нашай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас (і, вядома ж, не толькі яны). Першы, напрыклад, у сваёй «Паўлінцы»: *«Знаць і бачыць не хачу яго ў сваёй хаце, гэтага хамуйлу, гэтае плюгаўства»*. Ёсць яно (і яго аднакарэнныя) і ў «залацінках народнай мудрасці» — прыказках: *хочаш многа знаць, трэба мала спаць, век звекаваць — усяго пазнаць*.

Смех смехам

Па зубах

На рынак я хаджу досыць часта. Мяне, як былога работніка гандлю, цікавіць, што прадаецца і што купляецца, што колькі каштуе, як арганізаваны сам працэс...

Адразу скажу: таварэц цяпер — процьма, хоць каўшамі бярыце! Цікаўлюся гародніной — усё чыста ёсць, што, відаць, не дзіва: людзі ў нас працавітыя, могуць вырасціць нават тое, што не вельмі і расце. Па цукерак таксама крыху прытармажваю.

— Купіце што-небудзь, — прапануе прадавачка.

— Добра, — згаджаюся. — Падбярыце чаго таннейшага.

— Я вам па вашых зубах дам, — згаджаецца гандлярка.

— Ну, калі па зубах, тады я, мусіць, нічога больш не куплю...

Разам з прадавачкай мы ад душы пасмяяліся, а дамоў я пайшла з пакупкай — з мармеладам.

Тамара Аляхновіч, *г. Слуцк.*

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.

Тэл. (017) 287-18-36.

Скажыце, доктар...

НЕБЯСПЕЧНАЯ «МІГРАЦЫЯ»

Як справіцца з хваробай-загадкай



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Эндаметрыёз жартам называюць хваробай тэорый, бо яго прычыны да канца не высветленыя. Тым часам, па некаторых данных, ад яго пакутуюць каля мільёна беларусак. Галоўная небяспека гэтай хваробы ў тым, што яна паражае жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту і прыводзіць да бясплоддзя. Як распазнаць эндаметрыёз, ці трэба рабіць апэрацыю і на якія аналізы не варта траціць грошы, расказала акушэр-гінеколаг 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Аляксандра БУРГУТА.

— Аляксандра Дзмітрыеўна, што гэта за з'ява — эндаметрыёз?

— Напэўна, ніхто дакладна не зможа растлумачыць гэту з'яву і яе прычыны. Вядома, што гэта паталагічнае адсяванне эндаметрыя — функцыянальнай слізістай абалонкі поласці маткі, якая ў жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту рэгулярна аддзяляецца, што і праяўляецца ў выглядзе штомесячнага крывацёку. Па нейкіх прычынах гэтыя астраўкі слізістай абалонкі «мігрыруюць» за пагранічную мембрану поласці маткі і трапляюць у сценкі маткі, тазавыя органы — яечнікі, матачныя трубы, мачавы пухір, кішэчныя пагыбліны, петлі кішэчніка. Гэта найбольш распаўсюджаныя выпадкі. Вельмі рэдка, але здараецца, што яны мігрыруюць у лёгкія, слёзную залозу (адсюль некалькі дзён у месяц могуць быць крывавыя слёзы), плеўру, дыяфрагму. Прычыны ўзнікнення гэтага захворвання дагэтуль дакладна не ўстаноўлены. Таорый існуе шмат, і няводная з іх не мае поўнай доказнай базы.

— Якія жанчыны знаходзяцца ў групе рызыкі?

— Адназначна можна сказаць: тыя, хто так ці інакш меў траўматызацыі слізістай абалонкі поласці маткі, хто перанёс выскрабанні, аборты, аперацыі на жаночых палавых органах, у прыватнасці на матцы, асабліва калі гэта ўмяшанне з ускрыццём поласці маткі. Скажам, калі жанчыне выдаялялі міёму з выкананнем метраплястыкі (з праніканнем у поласць маткі) — яна ў групе рызыкі. Кесарава сячэнне — таксама аперацыя з ускрыццём поласці маткі. Заразі кесаравых сячэнняў выконваецца шмат, і гэта таксама ўплывае на распаўсюджанасць эндаметрыёзу.

— Што можа быць сігналам аб тым, што трэба звярнуцца да ўрача?

— Мы будзем весці размову пра генітальны эндаметрыёз, які сустракаецца ў 90 працэнтах выпадкаў. Як правіла, гэта захворванне ўключае тры асноўныя сімптомы. Па-першае, боль, прычым як падчас менструацыі, так і ў іншыя дні, гэта так званы сіндром хранічных тазавых болеяў. Аб'ектыўных прычын для болю няма, але на працягу цыкла ные, цягне ў нізе жывата, болі суправаджаюць палавы акт. Па-другое, анамальныя менструацыі, вялікія па аб'ёме выдзяленні і працяглыя — не 5-7 дзён, а каля 10. Прычым характэрныя выдзяленні да і пасля іх. І трэці сімптом, актуальны для жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту, — бясплоддзе. Асабліва калі гэта эндаметрыёз яечнікаў, клятчатачных прастораў таза, які спалучаецца са спаечным працэсам органаў малога таза. Адсюль могуць быць перагібы, сцяжкі, спайкі ў раёне матачных труб і іх механічная непраходнасць. А вось пашкоджаны эндаметрыёзам яечнік актыўна губляе свой запас яйцаклетак, так званы аварыяльны рэзерв. Таму кажуць, што «эндаметрыёз есць яечнікі». Тканка яечніка часткова гіне, і чым даўжэй маладая жанчына не лечыць эндаметрыёз яечніка, тым меншым з кожным годам яе магчымасці зацяжарыць.

Ёсць і некалькі спадарожных сімптомаў. Адзін з іх, дарэчы, анемія. На яго часта не звяртаюць увагі, спісваючы на пастаянны стомленасць. Бываюць такія выпадкі, што ў жанчыны не вельмі моцныя месячныя па нашых крытэрыях, але сам па сабе эндаметрыёз «пад'ядае» гемаглабін, гэта так званая анемія хранічнага захворвання. Такія анеміі не яўныя, латэнтныя, але яны часта суправаджаюць гэта захворванне.

— Эндаметрыёз можа перарадзіцца ў рак?

— Такіх даных няма. Магчыма, гэта ў нейкім сэнсе актуальна для эндаметрыёідных кістаў яечнікаў. Але гэта, хутчэй, не пытанне перарадзжэння такой кісты ў рак. Бо часам тое, што падчас ультрагукавой дыягностыкі мы апісваем як эндаметрыёідную кісту, зусім ёй не з'яўляецца. Таму што толькі пасля выдалення кісты і яе гісталагічнага даследавання можна дакладна назваць яе разнавіднасць.

— Гэта праўда, што, калі з эндаметрыёзам усё ж удаецца зацяжарыць, хвароба знікае?

— Так. Цяжарнасць — адзін з наймагутнейшых сродкаў тэрапіі эндаметрыёзу. Вялізныя дозы гармону прагестэрону, якія арганізм выпрацоўвае для падтрымання цяжарнасці, з'яўляюцца лячэбнымі пры гэтай хваробе. Мы часам нават назіраем, як эндаметрыёідныя кісты невялікіх памераў цалкам знікаюць падчас цяжарнасці. Па-за цяжарнасцю прагестэрон таксама выкарыстоўваецца для лячэння эндаметрыёзу.

— Эндаметрыёз з гадамі прагрэсуе?

— У рэпрадуктыўным узросце — так. Можна сказаць, што свайго піка ён дасягае ў 40—45 гадоў, калі пачынаюцца скачкі гармональнага фону. У перыяд менапаўзы ён павольна знікае.

— Як лячыць гэту хваробу? З дапамогай гармональных таблетак ці лепш рабіць апэрацыю?

— Сучасныя рэкамендацыі заключаюць адмаўляцца ад хірургічнага ўмяшання пры эндаметрыёзе. Нават пры лячэнні тых жа эндаметрыёідных кістаў імкнуцца максімальна абысціся без аперацыі. Зразумела, ёсць выпадкі, калі не не пазбегнуць: гэта бясплоддзе, выкліканае спаечнымі працэсамі. У такім выпадку абавязкова прыйдзецца вызваляць матачныя трубы ад спаек, каб жанчына магла плануваць цяжарнасць. Зразумела, не абыдзіся без аперацыі і ў выпадку буйных, больш за пяць сантыметраў, кістаў яечнікаў, бо ёсць небяспека іх перакруту, некрозу і іншага. Але калі ідзе размова пра невялікае адсяванне эндаметрыёзу па тазавай брушыне, зараз старэючца не апэруравць. Хірургічнае ўмяшанне можа нагаршаць лячэнне эндаметрыёзу: мы зноў пранікаем у малы таз, зрушаем ачагі — і яны даюць новыя адсяванні. Вялікая група даследаванняў паказвае, што няма даных аб перавазе хірургічнага лячэння над кансерватыўным. Таму зараз усё лячэнне пераважна гармональнае.

— А ці можна абысціся падчас лячэння без гармонаў?

— Пацыенткі таксама часта задаюць такое пытанне. Эндаметрыёз — хвароба жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту, і яго не бываве ў менапаўзе, бо няма эстрагенавай падтрымкі. Пакуль у жанчыны высокі эстрагенавы фон у рэпрадуктыўным узросце, у яе будзе эндаметрыёз. Як толькі эстрагенавы фон падае — у менапаўзе ці, скажам, з-за выдалення яечнікаў, хімітэрапіі, якая падаўляе функцыю яечнікаў, эндаметрыёз будзе сыходзіць. Таму трэба разумець, што нельга лячыць гармональна залежнае захворванне негармональнымі сродкамі. Мы выкарыстоўваем шэраг гармональных прэпаратаў — ад найпрасцейшых камбінаваных аральных кантрацэптываў пэўнага складу для маладых жанчын пры лёгкіх формах эндаметрыёзу да вялікай групы гестагенных прэпаратаў ці аналагаў прагестэрону. Тут вялікі выбар і цэны розныя. Такія прэпараты падбіраюцца індывідуальна кожнай жанчыне.

— Праўда, што гэта захворванне вылечыць нельга, можна толькі купіраваць?

— Так, калі ў жанчыны ёсць сэксуальная да гэтага працэсу, радыкальна яе вылечыць складана. Можна зрабіць маладой дзяўчыне лапараскапію, каагуляваць ачагі эндаметрыёзу, выдаліць эндаметрыёідную кісту, прызначыць падтрымальны курс гармональнай тэрапіі, яна зацяжарыць, і ўсё ў яе будзе добра. Але дзесьці бліжэй да 40 гадоў, калі пачнуцца скачкі гармональнага фону, праблема зноў можа з'явіцца.

Ёсць вялікая распаўсюджаная памылка, што пры эндаметрыёзе трэба здаваць аналіз на палавыя гармоны. У свабй практыцы я ніколі не бачыла грубых парушэнняў гармональнага фону ў жанчын, якія пакутуюць на эндаметрыёз. Важна разумець, што гэта няўлоўныя індывідуальныя асаблівасці гармональнага фону, якія мы не можам змераць лічбамі. Губляць час, грошы і магчымасці на аналіз на гармоны ў такой сітуацыі, калі эндаметрыёз не суправаджаецца парушэннем менструальнага цыкла, няма сэнсу.

ВЯСНУ СУСТРЭНЕМ ДАБРОМ!

Увесь красавік частка сродкаў ад вашай стрыжкі ці галення будзе накіравана дзецям з цяжкімі хваробамі. Дабрачынная акцыя #веснудобромвстречай у падтрымку падапечных Беларускага дзіцячага хосписа пройдзе ў сталічным Gentlemen's Club Barbershop, які размешчаны на вуліцы Карла Маркса, 20.

Упершыню ў сталіцы, робячы догляд і застаючыся модным, можна быць карысным і дапамагаць невылечна хворым дзецям. Для гэтага не трэба спецыяльна рабіць ахвяраванне ці аказваць камусьці дапамогу. Дастаткова запісацца на стрыжку ці галенне і тым самым стаць удзельнікам добрай справы.

У межах гэтай акцыі 31 сакавіка ў Gentlemen's Club Barbershop каманда барбераў зробіць модныя стрыжкі для пяці падапечных дзіцячага хосписа. Дзяцей разам з бацькамі прывязуць аўтаваланцёры, а арганізатары правядуць гульні і іншыя актыўнасці для юных удзельнікаў мерапрыемства.

АДСТУПАЕ, АЛЕ НЕ ЗДАЕЦЦА

Што варта памятаць пра туберкулёз

Туберкулёз застаецца небяспечнай інфекцыяй, у тым ліку і ў Беларусі. У Еўрапейскім рэгіёне, паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожную гадзіну яе выяўляюць у 30 чалавек. Але дзякуючы ў тым ліку і намаганням гэтай арганізацыі з 2000 года ў свеце ўдалося папярэдзіць 54 мільёны смерцяў ад туберкулёзу.

У Беларусі, якая разам з шэрагам постсавецкіх краін знаходзіцца ў ліку лідараў, у прыватнасці па мультыпрэзістэнтным (устойлівым да найбольш эфектыўных лекаў) туберкулёзе, захваральнасць і смяротнасць пакрысе знікаюць. Паводле інфармацыі **галоўнага пазаштатнага фтызіятра Міністэрства аховы здароўя, дырэктара РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Генадзя ГУРЭВІЧА**, зараз смяротнасць складае 2,6 чалавека на 100 тысяч насельніцтва. Пры гэтым яшчэ дзесяць гадоў таму яна была амаль у шэсць разоў большай. Летась у Беларусі захварэла на туберкулёз 1916 чалавек, сярод іх 23 дзіцяці. Захваральнасць сярод дзяцей, дарэчы, таксама істотна зніжаецца: яшчэ дзесяцігоддзе таму хваробу выяўлялі ў сярэднім у 150 дзяцей у год. Павышаецца і эфектыўнасць лячэння: мультырэзісцэнтны туберкулёз вылечваецца ў 70 % выпадкаў, а з множнай лекавай устойлівасцю — у 86 %.

Лячэнне аднаго пацыента абыходзіцца нятанна: у Брэсцкай вобласці, дзе рэалізуецца пілотны праект па скарачэнні ложкавага фонду і перавод хворых на амбулаторнае лячэнне пасля непрацяглага тэрміну ў стацыянары, яно каштуе 23 тысячы рублёў, у Мінску — 87 тысяч рублёў. Як адзначыў **каардынатар праграм па інфекцыйных хваробах краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Вячаслаў ГРАНЬКОЎ**, хворы на туберкулёз з пачаткам тэрапіі не здольны заразіць навакольных і патрэбы трымаць яго ў стацыянары няма. Таму праект па аптымізацыі ложкавага фонду працягнецца ў іншых рэгіёнах Беларусі.

Асноўнымі сімптомамі туберкулёзу з'яўляецца працяглы, больш за тры тыдні, кашаль, павышаная тэмпература. Аднак спецыфічных сімптомаў можа і не быць, пры гэтым у хворага адзначаецца слабасць, задышка, зніжаны апетыт, стомленасць, вечарамі могуць праймаць дрыжыкі, з'яўляецца крывакарканне. Вызначыць захворванне можна падчас флюараграфіі.

Свае

УСЁ ПАЧАЛОСЯ З ПЕЧКІ,

або Як каза Манька і пеўнік Пятруха на працу ў Музей хлеба ўладкаваліся

МАЛЕНЬКІ вясковы музей у аграгарадку Бацвінава Чачэрскага раёна папулярны не толькі сярод беларусаў, якія хочуць даведацца аб сакрэтах выпечкі хлеба, але і сярод замежных турыстаў.

ЁН ЗАХАЦЕЎ З'ЯВІЦЦА САМ!

«Музей хлеба. Някай будзе ў нас музей хлеба!» Фраза была сказана недзе ў сярэдзіне 90-х падчас пасяджэння аддзела культуры Чачэрскага райвыканкама. Але да справы тады яшчэ не дайшло.

«Я толькі прыйшла працаваць, — успамінае **кіраўніца Музея хлеба Ірына НІКІШОВА.** — Патрэбен быў час асвоіцца... І раптам аднаго дня мне тэлефануюць і гавораць, маўляў, прыехалі карэспандэнты, хочуць паглядзець Музей хлеба! Божухна, які музей?! Я не ведала, што рабіць. Агледзелася ў Доме культуры... Ага, вось гэты пакойчык пустуе — някай будзе музеем. Кінулася збіраць экспанаты. Знайшла зерне, нейкія вясковыя прылады для працы на зямлі... Вось такое «немаўляя» спачатку атрымалася».

Людзі ўжо даведаліся, што ў іх вясковым Доме культуры адкрыўся музей, і самі сталі несці экспанаты. Нясуць з пакінутых хат, з дамоў сваіх бабуль: рыдлёўкі, ліхтары, ручнікі, ільняныя сукенкі, спадніцы, кашулі з вышыўкай, тканыя дываны і падсцілкі, нават канапы...

«Людзі ў нас жывуць адкрытыя і неабыякавыя да свайго краю, — гаворыць Ірына. — Усім хочацца быць карысныміі. Тым больш прыемна, калі людзі прыязджаюць, глядзяць зачараваны на ўсё, дзівуюцца, а ты ведаеш, што маеш дачыненне да гэтага музея, бо там, напрыклад, ручнік твайей бабулі... Некаторых гаспадароў нашых экспанатаў ужо няма ў жывых, але памяць аб іх застаецца ў нашым музеі».

У пачатку 2000-х у музеі з'явілася сапраўдная печ. Прыехала мясцовае кіраўніцтва і засталося вельмі задаволеным. Вырашылі дапамагчы добраўпарадкаваць тэрыторыю, зрабілі прыстойны рамонт у памяшканні. Музей хлеба пасталеў, яму стала мала аднаго пакойчыка, і ён размясціўся ў двух.

ПЕРШЫ ПАЧАСТУНАК

«Пачала я збіраць рэцэпты хлеба, што ад маці і бабулі засталіся, — расказвае гаспадыня музея. — Помню, моцна пасябравала з фальклорным калектывам, які спявау старажытныя песні. Людзі там былі ўжо ва ўзросце, карысталіся ў мясцовых павагай. Яны мне расказвалі сакрэты выпечкі хлеба: як лепш у печы паліць, як малісца пры замесе хлеба, якія песні спяваць падчас працэсу... Чым больш даведвалася сакрэтаў, тым цікавей мне станавілася. Пячы хлеб аказалася неверагодна захапляльнай справай».

У 2014 годзе ў раён павінна была прыехаць дэлегацыя з Італіі. Чачэрская зямля пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і таму сюды часта прыязджаюць з розных краін свету, каб арганізаваць аздараўляльныя паездкі для дзяцей. Замежным гасцям ужо было што паказаць у Доме культуры. Але... Музей хлеба быццам бы «надзьмуўся». Яму хацелася быць не проста карысным, але зоркай! Тады супрацоўнікі вырашылі скарыстацца пабудаванай печкай і на самай справе спячы гасцям хлеб па старажытным рэцэпце.

«Я тады першы раз пякла хлеб у печы музея. Маліласа, каб толькі ўсё выйшла. Акурат выпеклі да прыезду гасцей. А яны не верацьі Мы ім давай расказваць ды паказваць. Людзі — у захапленні. Пачалі яны хлеб ламаць, а ён мяккі, цёплы і пахне... Літаральна як сонца быў. Усё зрабіла па матчыных словах, і ўсё пайшло як па масле».

Госці ў той дзень не толькі хлебам частаваліся, але і блінаў са скваркамі з патэльні елі, і песні з прымаўкамі слухалі — уражанняў на год назбіралі.

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ СУПРАЦОЎНІКІ

Манька доўгі час жыла жыццём звычайнай казы. Патроху скубла траўку, была ветлівая з людзьмі і жывёламі, што жылі побач. Аднойчы Манька заўважыла, што яе гаспадыня падводзіць сябе незвычайна: яна неяк доўга і пільна глядзела на сваю гадаванку і раптам сказала: «Слухай, Манька, думаю, сёння ты пойдзеш са мной на працу». Так і зрабілі. Недалёка ад незнаёмага Манькі будынка

гаспадыня спынілася, прыбіла калок і прывязала казу. Праз некаторы час прыйшло шмат людзей. Яны накармілі яе капустай так, што Манька ад задавальнення стала гучна мэкаць, чым выклікала захапленне гледачоў. З тых часоў каза часта хадзіла з гаспадыняй на працу. Нават асобны домік пабудавалі для яе і яе сябра пеўніка Пятрухі, які таксама стаў «хадзіць на працу». Яны разам ветліва сустракаюць гасцей, ядуць з іх рук прысмакі і пяюць ім свае вясковыя песні: «мэ-мэ» і «кукарэку».

«Ой, Манька ды Пятруха такія канцэрты даюць, — прызнаецца Ірына. — Аказалася, яшчэ тыя артысты. Раней яны больш хатнія былі, а зараз ужо набраліся досведу і падыгрываюць гасцям — сапраўдны цырк! Вось будуць грошы, пабудуем яшчэ пару вальераў для трусоў і гусей. Дзецям, што да нас прыязджаюць, цікава кантактаваць з жывёламі, яны так шчыра радуюцца, калі тыя з рук ядуць, што сама не магу стрымаць усмешку пры гэтым, здаецца, звычайным дзеянні».

І 25 ТЫСЯЧ ЕЎРА

З таго часу людзі часцяком наведвалі Музей хлеба. Усім хацелася не толькі паслухаць і паглядзець, як рабілі хлеб нашы продкі, але і пачаставацца ім. Звычайна прыязджалі групамі не толькі з усёй Беларусі, але і з Расіі, Швецыі, Германіі... Адной печы стала мала, і Музей зноў нібы надзьмуўся — яму хацелася большага...

«Мы вырашылі падаць дакументы на ўдзел у праекце «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. Хацелася нам развіцця далейшага, а грошай не было. Першы раз падалі дакументы — не прайшлі. Другі — перамаглі! Колькі было радасці — не перадаць. У 2017-м мы атрымалі фінансаванне ў памеры крыху больш за 25 тысяч еўра! Работы было вельмі шмат, затое цяпер ёсць дзе разгарнуцца. За чатыры месяцы разам з гаспадарчай групай аддзела культуры зрабілі рамонт, набылі касцюмы, цестамясілку, духавыя шафы, музычную апаратуру, пабудавалі для казы і пеўніка хаткі, зрабілі дарогу да нашага музея. Людзі, убачыўшы, што такая мітусня пачалася вакол яго, зноў панеслі нам экспанаты і да сённяшняга дня нясуць, за што мы ім вельмі ўдзячны», — кажа Ірына Нікішова.

Музей сустракае гасцей увесь год і жыве поўным жыццём. Калі прыехаць зімой, то можна трапіць на каляднае «ваджэнне казы», паслухаць зімовыя песні, даведацца, як некалі варажылі. Вясной ахвотныя звычайна трапляюць на Масленіцу, разам праводзяць зіму, частуюцца блінамі і пяюць. Круглы год наведвальнікі могуць не толькі ўбачыць, як рабіўся хлеб, але і робяць яго самі. А пакуль хлеб будзе пячыся, можна пагуляць у вясковыя гульні, паспявать, паслухаць народныя песні ды пакарміць жывёл.

«Толькі на наступны месяц у нас ужо запісана васямнаццаць груп... Але адчуваю, што нельга спыняцца... Народу прыязджае шмат. Людзі сёння пачынаюць шанаваць сваё, беларускае! Стараюцца больш даведацца аб традыцыях і культуры. А пачынаць трэба з хлеба, бо будзе хлеб — будзе і песня. Планаў у нас яшчэ шмат: трэба добраўпарадкаваць тэрыторыю, зрабіць для дзетак арэлі, як у даўніну, паставіць на тэрыторыі казачных герояў... Пабудаваць на вуліцы альтанкі, сталы і лаўкі... Хутка наробім такога — увесь свет будзе нас ведаць».

Вось так ідзя, якая нарадзілася ў маленькім пакойчыку вясковага Дома культуры, ператварылася ў незвычайны інтэрактыўны музей, пра які ведаюць ужо не толькі ў Беларусі.

Наталля ТАЛІБІНСКАЯ,
Чачэрскі раён.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЗАХОДЗІМ НА ПАСАДКУ: АГАРОДНІНА, ЯКУЮ МОЖНА СЕЯЦЬ РАННЯЙ ВЯСНОЙ

Пасадка агародніны ранняй вясной мае больш пераваг, чым вы думаеце. Акрамя таго, што першы ўраджай са свайго агарода пасля доўгай зімы цэніцца ў разы больш, вясновыя пасадкі вырастаюць здаравейшымі, паколькі яшчэ не прачнуліся шкоднікі і насякомыя. Ужо можна браца за справу — напрыклад, гарох і ліставая салата не баяцца прахаладнага і вільготнага надвор'я. Канец зімы і пачатак вясны — выдатны час, каб саджаць спаржу і рэвень.

СПАРЖА

Існуе мноства шматгадовых раслін, аднолькі пасадзіўшы якія, ураджай можна здымаць шмат гадоў пасля. На жаль, мы не так часта карыстаемся гэтай магчымасцю. Сапраўды, гэтыя расліны патрабуюць месца, але гэта прыносіць свой плён. З кожным годам спаржа становіцца ўсё больш і больш урадлівай, а ўраджай можна здымаць на працягу некалькіх месяцаў. Калі вы думаеце, што вам не падабаецца спаржа, то вы проста не каштавалі яе свежую і адразу з градкі.

САЛАТА-ЛАТУК

Прахаладная і вільготная вясна — ідэальны час для вырошчвання салаты, а пры выбары сартоў лёгка і разгубіцца — так іх шмат. Каб дачакацца ўсходаў, салату трэба трохі падагладзаць, але няма нічога лепшага за хрумсткую, далікатную салату, якая вырасла на свежым вясновым паветры. Самы ранні і доўгі ўраджай атрымліваецца з сартоў, якія можна зразаць шматкроць. Салату трэба абараняць ад замаразкаў.

ГАРОХ

У Ірландыі існуе традыцыя — саджаць гарох у Дзень святога Патрыка (17 сакавіка), але многія з нас не маюць магчымасці гэта зрабіць, паколькі часам зямля яшчэ бывае накрытая снегам. Аднак гарох, пасаджаны ў красавіку, даволі хутка дагоніць гарох, пасаджаны ў сакавіку. Гарох не любіць замаразкаў, але яшчэ больш ён не любіць спякоту. Таму не ўпусціце ідэальную магчымасць пасадзіць свой любімы сорт — лушчыльны гарох, цукровы гарошак або мазгавы.

РЭВЕНЬ

Гэта агародніна, якую мы гатуем як фрукт, і першы салодкі плод сезона. Рэвень — шматгадовая расліна, якая вельмі недаацэненая і ў ежу ўжываецца значна радзей, чым заслугоўвае. Да таго ж яго вельмі лёгка вырошчваць. Аднойчы пасадзіўшы рэвень, вы можаце збіраць ураджай кожны год. Аднак запомніце, што «крона» рэвеню хутка становіцца жорсткая і шчыльная, і яе вельмі складана расцунуць. Таму, калі трэба перасадзіць або падзяліць рэвень, то рабіце гэта, пакуль расліна яшчэ маладая і не развіла магутную каранёвую сістэму.

ШПІНАТ

Шпінат лепш за ўсё вырошчваць у прахаладнае надвор'е, інакш ён хутка пачне зацвітаць і пойдзе ў стрэлку. Ёсць разнавіднасці, у якіх не так моцна выяўлены гэтыя якасці, аднак рана ці позна яны ўсё роўна пачынаюць зацвітаць. Па шчасце, шпінат расце вельмі хутка, таму не прыйдзецца доўга чакаць. Зрэшты, для новага ўраджаю шпінат трэба саджаць нанова.

Пасадзіць шпінат лёгка, але, каб прымусіць яго расці, спатрэбіцца трохі высілкаў. Свежы ён больш хрумсткі, валодае больш выяўленым смакам, чым любы крамны шпінат у цэлафанавым пакеце. Больш за тое, шпінат досыць ценелюбівы, таму яго смела можна саджаць побач з тымі раслінамі, якія толькі ўзыходзяць, у той час як шпінат ужо трапляе на стол.

ТРЫ ЎРАДЖАІ КВЯЦІСТАЙ КАПУСТЫ ЗА АДЗІН СЕЗОН

Квяцістая капуста з'яўляецца каштоўным дыетычным прадуктам у харчаванні дарослых і дзяцей. Большасць агароднікаў вырошчваюць яе на сваіх зямельных участках толькі адзін раз на працягу пасяўнога сезона. А можна ласавацца гэтым далікатным пажыўным прадуктам з вясны па кастрычнік.

Арганізаваць канвеер па вырошчванні галовак квяцістай капусты зусім не складана. Для гэтага трэба набыць насенне сартоў або гібрыдаў розных тэрмінаў паспявання. Важна, каб насенне мела выдатныя пасяўныя якасці.

Квяцістую капусту прынята вырошчваць праз расаду, бо расце яна даволі доўгі час — ад 80 дзён і больш. І калі пасеяць насенне скаспелых (ультраранніх) сартоў у другой палове сакавіка, а затым высадзіць 30—45-дзённую расаду ў канцы красавіка (пачатку мая) у грунт пад укрыццё, то першы ўраджай каляровых галовак можна падаць на стол у пачатку чэрвеня.

Да другога абароту прыступаюць у першай дэкадзе красавіка. Для сеяння бяруць таксама раннія (сярэдняраннія) сарты або гібрыды. Расаду лепш высарцыць на ўчастку ў цяплічцы. На градку падрошчаныя сеянцы рассцвяваюць у лункі ў канцы мая. Галоўкі квяцістай капусты спеюць ужо ў сярэдзіне ліпеня.

Трэці, летне-восеньскі ўраджай пасяе ў жніўні, у разгар дачных нарыхтовак. Насенне на расаду сеюць у канцы красавіка — сярэдзіне мая, а на градкі 25—30-дзённую расаду высаджваюць у сярэдзіне чэрвеня. Для сеяння падыходзяць сярэдняраннія і сярэдняспелыя сарты. Пры вырашчванні сярэднепозніх сартоў ураджай здымаюць пазней, у верасні і пачатку кастрычніка.

Акрамя правільна падабраных сартоў і сеяння насення на расаду ў розныя тэрміны, важнымі фактарамі з'яўляюцца вырошчванне жыццяздольнай моцнай расады і выкананне правілаў агратэхнікі вырошчвання гэтай культуры.

ЯКІМ ПОПЕЛАМ ШТО ЎГНОЙВАЦЬ?

У драўняным попеле змяшчаецца шмат хімічных элементаў, неабходных садовым культурам. У попеле, нароўні з іншымі элементамі, змяшчаюцца калій, кальцый і фосфар, прычым усе ў лёгкадаступнай для раслін форме. Так што ўгнаенне атрымліваецца ўнікальнае і надзвычай карыснае, а самае галоўнае, натуральнае — без усялякай хіміі.

Якасць попелу залежыць ад таго, з якога дрэва ён быў атрыманы. Самы каштоўны — з бярозавых дроў. А вось хвойныя пароды для гэтых мэт не вельмі падыходзяць: занадта шмат у іх усякіх смол. Сярэдняя якасць карысце будзе ад пладовых дрэў. Попел перад выкарыстаннем трэба абавязкова прасеяць. Справа гэта пыльная, але патрэбная!

Разводзяць вогнішча ў свайм садзе, абавязкова падумайце, ці будзеце вы пасля выкарыстоўваць атрыманы попел. Калі так, то не варта кідаць у яго пластыкавыя, гумовыя і поліэтыленавыя прадметы. Бо мы ж хочам атрымаць экалагічна чыстае ўгнаенне, без усялякіх прымешак, якое не нанясе шкоды нашым пасадкам.

Карысная ўласцівасць попелу — здольнасць раскісляць глебу. Адбываецца гэта за кошт кальцыю, якога змяшчаецца ў ёй досыць шмат. Таму попел добра выкарыстоўваць на кіслых глебах. Акрамя таго, ён паляпшае глебавую структуру, робячы яе больш лёгкай і друзлай.

Попел — выдатнае ўгнаенне амаль для ўсіх садовых культур. Выключэнне складаюць віды, якія любяць расці на кіслых глебах. Ім унясенне попелу супрацьпаказана.

Звычайна попел уносяць пад перакопку восенню ці вясной — для паляпшэння якасці зямлі. Прыпыляюць паверхню, а затым ускопваюць. Выдатна паказаў сябе і іншы спосаб — унясенне попелу ў лункі пры пасадцы. Паколькі ён кропкавы, то і ўся карысць дастаецца канкрэтнай расліне.

Пры выкарыстанні попелу ёсць і свае супрацьпаказанні. Яго не рэкамендуецца выкарыстоўваць разам з азотнымі ўгнаенняміі, напрыклад з гноем, паколькі попел забіраецца ўвесь карысны эфект ад яго ўнясення і падкормкі акажуцца малафектыўнымі.

Акрамя таго, нельга камбінаваць суперфасфат і попел. Усё на той жа прычыне — фосфар будзе дрэнна засвойвацца.

27 САКАВІКА

У Беларусі

Даты | Падзеі | Людзі

1513 год — у Мінску з'явіўся першы шпіталь — установа для апекі над састарэлымі, бяздомнымі, беднымі і хворымі, заснаваны на філантрапічныя ахвяраванні каталіцкіх і праваслаўных храмаў, манастыроў, магістратаў, цэхавых аб'яднанняў.

1579 год — зацверджаны прывілей Стафана Баторыя, у адпаведнасці з якім езуіцкі калегіум, заснаваны ў 1570 годзе, ператвораны ў Віленскую акадэмію (што давала права прысвойваць вучоным ступені, мець выбарную адміністрацыю, правы ўласнай юрысдыкцыі). Першым рэктарам акадэміі быў П. Скарга. У сувязі са спыненнем дзейнасці ордэна езуітаў акадэмія перайшла пад апеку Адукацыйнай камісіі, якая пераўтварыла яе ў вышэйшую навучальную ўстанову нованага тыпу (з 1781 г. называецца Галоўнай школай ВКЛ, рэктарам прызначаны М. Пачобут-Адляніцкі, які займаў гэтую пасаду больш за 20 гадоў). З 1796 года — Галоўная Віленская школа, з 1803 года — Віленскі ўніверсітэт, найстарэйшая навучальная ўстанова Беларусі і Літвы

1909 год — нарадзіўся Валерый Маракоў, беларускі паэт, перакладчык. Дзейнічаў у чэрвені 1925 года (газеты «Чырвоная змена», «Малады араты» і інш.). Аўтар зборнікаў паэзіі «Пялёсткі», «На залатым пакосе», «Вяршыні жаданняў», «Права на зброю», «Лірыка». Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М. Галодная, А. Новікава-Прыбоя, П. Тычыны. У 1937 годзе рэпрэсаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.



1923 год — прыняты Зямельны кодэкс БССР, які замацаваў зямлю за сялянамі; пачалося землеўпарадкаванне, добраахвотнае перасяленне сялян на хутары, надзяленне зямлёй малазямельных.

1954 год — нарадзіўся (г. Віцебск) Васіль Васільевіч Піменаў, Герой Савецкага Саюза (1984). Скончыў Разанскае вышэйшае паветрана-дэсантнае камандное вучылішча, Ваенную акадэмію імя Фрунзэ. З 1971 года ў Савецкай Арміі. Камандзір батальёна парашутна-дэсантнага палка маёр Піменаў вызначыўся падчас вайны ў Афганістане ў 1979—1989 гг. У кастрычніку 1983 года на поўнач ад Кабула батальён пад яго камандаваннем разграміў буйную групоўку душманаў, захапіў склады са зброяй і боепрыпасамі. Памёр у 2005 годзе.

У свеце

1845 год — нарадзіўся Вільгельм Конрад Рэнтген, нямецкі фізік, першы лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1901). У 1895 годзе адкрыў выпрамяненне, пазней названае рэнтгенаўскім, даследаваў яго ўласцівасці. Памёр у 1923 годзе.

1871 год — нарадзіўся Генрых Ман, нямецкі пісьменнік. Брат Томаса Мана. Аўтар сацыяльна-маральных раманаў пра Германію «бюргерскай» эпохі «Настаўнік Гнус», «Вернападданы», дылогіі «Юнацтва і сталасць кароля Генрыха IV», мемуараў «Агляд стагоддзя», а таксама крытыкі і публіцыстыкі. Памёр у 1950 годзе.

1901 год — віцэ-адмірал, акіянограф і карабледаследчык С. В. Макараў пачаў экспедыцыю на ледаколе «Ярмак» да Новай Зямлі і Зямлі Франца-Іосіфа, якая адкрыла эпоху ледакольнага плавання ў Арктыцы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 6.56	19.36	12.40
Віцебск	— 6.45	19.26	12.41
Магілёў	— 6.46	19.26	12.40
Гомель	— 6.43	19.21	12.38
Гродна	— 7.11	19.50	12.39
Брэст	— 7.13	19.50	12.37

Месяц

Поўня 21 сакавіка.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Венядзікта, Расціслава.*
К. *Лідзіі, Венядзікта, Мацея, Эрнеста, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Жадаю ўсім знайсці грошы ў вясновых куртках!

— Дарагая! Я доўга думаў і вырашыў — нам прыйдзецца расстацца! Мне было добра, але я знайшоў танейшы варыянт.

Кожную раніцу я выпіваю шклянку вады. А сёння неспадзявана выпіў шклянку гарэлкі. Такой добрай раніцы ў мяне яшчэ не было!..

Хворы — медсястры ў бальніцы:

— Якія ж гадкія лекі, проста атрута!

— Якія лекі?! Гэта ж абед!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕПЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, аддзелаў за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 932.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 сакавіка 2019 года.